Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 21 жніўня 1987 г. № 34 (3392) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.



Пімен Панчанка.

Фота Ул. КРУКА.

«Пімен Панчанка, як ніхто іншы з паэтаў, ведае і адчувае, што трэба людзям у дадзены момант іх гістарычнага існавання і чаго ўжо не трэба, што падлягае пафаснаму праклёну навек... Публіцыстычная завостранасць цэлых цыклаў панчанкаўскіх вершаў рабіла іх баявой зброяй народа ў барацьбе з бюракратызмам, пустазвонствам і раўнадушшам, якія з такой цяжкасцю выкарчоўваюцца з нашага жыцця», — пісаў Васіль Быкаў.

Матэрыялы да 70-годдзя народнага паэта рэспублікі Пімена Емяльянавіча Панчанкі чытайце на стар. 4—9.

НАВІНЫ ТЫДНЯ

РЭВАЛЮЦЫЯЙ ЗАКЛІКАНЫЯ

Сярод кніг, якія пабачылі свет у выдавецтве «Художественная литература» да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка, і двухтомнік «Рэвалюцыяй закліканыя». Змест яго склалі лепшыя аповесці, апавяданні і нарысы савецкіх пісьменнікаў. Творы ствараюць своеасаблівы мастацкі партрэт жыцця Краіны Саветаў у розныя перыяды.

У двухтомніку змешчаны апавяданні Кузьмы Чорнага «Начлег у вёсцы Сінегі» (пераклад Я. Мазалькова) і Васіля Быкава «Эстафета» (пераклад М. Гарбачова).

С. КАСТЭНКА.

Ватан—значыць Радзіма

З кожным годам пашыраюцца культурныя сувязі паміж Савецкім Саюзам і Дэмакратычнай Рэспублікай Афганістан, у тым ліку літаратурныя. Пацвярджэнне таму—творчыя кантакты беларускіх пісьменнікаў з афганскімі калегамі.

Некалькі гадоў назад пабываў у Афганістане Анатоль Грачанікаў. Сустрэчы на гераічнай зямлі не толькі падказалі тэмы новых твораў, але і навялі на думку пазнаёміць з братняй літаратурай беларускага чытача. Яна знайшла сваё ажыццяўленне ў кнізе «Ватан—значыць Радзіма», якую выпусціла выдавецтва «Юнацтва».

Змест гэтага зборніка, які адрасуецца дзецям, склалі перакладзеныя А. Грачанікавым вершы адзінаццаці сучасных афганскіх паэтаў. Прадстаўнікі сярэдняга і малодшага пакаленняў, яны расказваюць аб зменах, якія адбываюцца на іх роднай зямлі, апяваюць харастство свайго горнага краю, дружбу народаў. І, вядома ж, прысвячаюць прачулыя паэтычныя радкі Леніну. Адзін з вершаў Барыка Шафі так і называецца «Леніна славім». Прадстаўлены таксама творы Асадула Хабіба, Абдулы Найбі, Сулеймана Лаека і іншых аўтараў.

У прадмове «Рэвалюцыі песняры» А. Грачанікаў зазначае: «Новая афганская літаратура, у тым ліку для дзяцей і юнацтва, прасякнута высокім аптымізмам і жыццялюбствам. Літаратура сённяшняга Афганістана служыць дружбе і баявому адзінству ўсіх народаў зямлі, кліча іх на барацьбу за набліжэнне цудоўнай будучыні, за шчасце ўсіх дзяцей на планеце».

«Ватан—значыць Радзіма»—не першы зборнік, якім выдавецтва «Юнацтва» знаёміць сваіх чытачоў з жыццём Афганістана. Летась выйшла ў перакладзе на беларускую мову кніжка афганскіх казак «Дапаможаш ты—і табе дапамогуць», перакладзеная М. Пазняковым.

К. ФЕДАСЕЕУ.

КАСТРЫЧНІК І ПЕРАБУДОВА

Анкета «ЛіМа»

1. У чым Вы асабіста бачыце пераемнасць рэвалюцыйных традыцый, практычную сувязь перабудовы з ідэаламі Кастрычніка?

2. Як Вы ўяўляеце значэнне чалавечага фактару, чалавечай асобы ў працэсе перабудовы? Ролю мастака ў рэвалюцыйным абнаўленні, якое адбываецца ў грамадстве?

У нумары «ЛіМа» за 7 жніўня з адказамі выступіў народны артыст СССР Я. Глебаў.

Сёння на яе пытанні адказвае першы сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Вячаслаў НІКІФАРАЎ.

1. Ідэал Кастрычніка — сацыялізм. Ён пабудаваны намі, гэта значыць, ён мае зусім рэальныя магчымасці і яўныя перавагі. Аднак, калі яго магчымасці не выкарыстоўваюцца і не развіваюцца, сацыялізм страчвае дыялектычную цэласнасць, фармалізуецца, і з ім адбываецца тое ж, што і з домам, у якім не жывуць, з неўвасобленай марай, якой бы цудоўнай яна ні была. Справа ў тым, што пры гэтым не сацыялізм — у сілу сваіх аб'ектыўных пераваг — страчвае, страчваем мы з вамі, і нямала. І сёння мы не сацыялізм перабудоўваем, а нашы ўяўленні аб ім, прэтэнцыёзныя прыбудовы і надбудовы да яго з друзу старых звычак, перажыткаў і пеўцтва. Такі друз заўсёды запашваецца ў працэсе жыццядзейнасці. Барацьба з ім вялася і раней, але сёння яна жыццёва неабходная: альбо багна аджыўшага, альбо свежы вецер руху.

Слова «перабудова» дакладна адлюстроўвае тое, што адбываецца сёння, але сэнс яго больш шырокі. Па сваім змесце гэта ёсць прадаўжэнне рэвалюцыйнага пераўтварэння свету.

2. Дзеля чаго пераўтвараць свет, калі чалавек смертны, і жыццё яго адносна кароткае?

Дзеля чалавека сённяшняга, дзеля будучых пакаленняў, у імя прадаўжэння жыцця, захавання і прымнажэння вышэйшых чалавечых каштоўнасцей, у імя камунізму, у канчатковым выніку. Такі адказ, трэба прызнаць, яшчэ не стаў само сабой зразумелай маральнай устаноўкай кожнага.

Вядома, што без адпаведнага светапогляду дзеянні асобы непаўнацэнныя з пункту гледжання яе магчымасцей. І што ўсе бітвы завяршаюцца — перамогай альбо паражэннем—на малюткім полі чалавечага сэрца.

Так што чалавечы фактар—гэта рухавік перабудовы. Яна адбываецца праз чалавека і дзеля чалавека, ён і сродак, ён жа і мэта. І нікуды ад яго не падзецца, ад чалавека. І мала гэта толькі прызнаць, трэба нешта канкрэтнае зрабіць, інакш нічога мы не перабудуем, і зноў, як раней, прабалбочам доўгія гадзіны жыцця.

Для мастацтва заўсёды га-

НАШЫ ГОСЦІ

І ТРАДЫЦЫЯ, І ПОШУК

Нядаўна ў Мінску завяршыліся гастролі Сухумскага дзяржаўнага грузінскага драматычнага тэатра імя К. Гамсахурдзіа. 13 жніўня ў Доме работнікаў мастацтваў адбылося абмеркаванне работ гэтага калектыву, арганізаванае з дапамогай Саюза тэатральных дзеячаў БССР.

Сухумскі драматычны —першы тэатральны калектыў Грузіі, з творчасцю якога непасрэдна змаглі пазнаёміцца мінчане. Ужо сам па сабе гэты факт стаў падзеяй у культурным жыцці беларускай сталіцы. Але не толькі гэта, безумоўна, прыцягнула агульную непадробную ўвагу гледача да аднаго з лепшых тэатраў братняй рэспублікі. Хоць спектаклі ішлі на грузінскай мове ў сінхронным перакладзе на рускую, моўны бар'ер нібы і не існаваў паміж акцёрамі і сапраўднымі аматарамі сцэнічнага мастацтва. Гэта ў першую чаргу адзначылі ўдзельнікі абмеркавання.

На сустрэчы ў Доме работнікаў мастацтваў ішла свабодная, адкрытая і прынцыповая размова аб традыцыях і сённяшніх дасягненнях тэатра, яго творчых набытках і праблемах.

Тэатральнае мастацтва Беларусі і Грузіі мае даўнія сувязі. На беларускай сцэне не раз ставіліся п'есы грузінскіх класікаў, грузінскія тэатры неаднойчы звярталіся да твораў беларускіх аўтараў, многія рэжысёры і выканаўцы з Грузіі працавалі на Беларусі. Але сёлетнія гастролі Сухумскага тэатра адкрываюць новы этап у тэатральным жыцці абедзвюх рэспублік, новыя далягляды супрацоўніцтва, сказаў, пачынаючы абмеркаванне, доктар мастацтвазнаўства прафесар А. Сабалеўскі.

Самая прывабная рыса ў творчым абліччы калектыву з Сухумі — страсны мастацкі тэмперамент, і разам з тым — адзінства пачуцця і думкі, высокая культура выканання. Гэтую рысу падкрэслілі ў сваіх выступленнях кандыдат мастацтвазнаўства А. Лабовіч і крытык Г. Колас.

Сухумскі тэатр — самабытны, глыбока адданы нацыянальным традыцыям калектыў — адначасова імкнецца пашыраць кола пошукаў, звяртаецца да сучаснай драматургіі, да рускай і замежнай класікі,— адзначалася на абмеркаванні.

Адсюль — разнастайнасць рэпертуару тэатра. У яго афішы — «Закон вечнасці» Думбадзе, «Дзясніца вялікага майстра» Гамсахурдзіа, «Аб'яўляецца закрытым» Чхаідзе, а таксама «Венецыянскі купец» Шэкспіра, «Чайка» Чэхава, «На дне» Горкага. Удзельнікі сустрэчы выказвалі розныя меркаванні паводле названых пастановак. У лепшых з іх — такіх, як «Чайка», «1832 год», «Дзясніца вялікага майстра»—тэатр дасягае сапраўдных вяршынь духу, смела звяртаецца да найскладанейшых праблем чалавечага быцця, гісторыі народа, гаварылася на сустрэчы.

Спрэчкі выклікала пастаноўка «На дне» — імправізацыя паводле п'есы Максіма Горкага, як пазначана ў тэатральнай праграмцы. Наватарскі, нават дзёрзкі падыход да класікі, пераасэнсаванне п'есы на падставе сучасных уяўленняў не ва ўсіх выклікаў разуменне. Аднак, як адзначыў крытык В. Нікіфаровіч, рэжысёр павінен мець права на сваё разуменне, сваю інтэрпрэтацыю твора. Галоўнае, каб гэта сапраўды было асэнсаваннем матэрыялу, а не данінай модзе. Гэту думку падтрымаў рэжысёр М. Дзінаў, іншыя выступаючыя.

Сваімі меркаваннямі на сустрэчы падзяліліся тэатральныя крытыкі Г. Ваўчок, М. Гарэцкая, Э. Язерская, педагог Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута Т. Баніцыян, аспірантка БДТМІ В. Козел.

Выступаючы ад імя гасцей, тэатразнаўца з Грузіі Н. Аравілідзе падзякавала за цёплы прыём, аказаны тэатру ў Мінску, за шчырыя словы, сказаныя на сустрэчы.

З заключным словам выступіў народны артыст Грузінскай ССР, народны артыст Абхазскай АССР Г. Каўтарадзе.

—Мы многа гаворым гучных і правільных слоў пра ўмацаванне дружбы і інтэрнацыяналізму, — сказаў ён. — Але, думаецца, лепшым іх праяўленнем стануць нашы практычныя справы. І хочацца спадзявацца, што нашы гастролі і іх абмеркаванне стануць чарговым крокам у развіцці шматгранных сувязей паміж нашымі рэспублікамі, паміж тэатральным мастацтвам Грузіі і Беларусі.

В. ТРАВЕНЬ.

У дзень смерці Якуба Коласа на яго магілу на Вайсковых могілках у Мінску пісьменнікі, супрацоўнікі літаратурных музеяў, чытачы ўсклалі кветкі. Ва ўшанаванні памяці народнага песняра прыняў удзел загадчык аддзела культуры ЦК КПБ Я. К. Вайтовіч.

Фота Ул. КРУКА

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

ДЗЕНЬ, як заўсёды, пачаўся з работы. На стале стосам ляжалі старонкі новага рукапісу, карэктура — толькі што прынеслі, — пазваніў нехта з аўтараў, і яна сама званіла: «знімала» нейкія пытанні, шукала рэцэнзента, а ў той жа час у думках прыкідвала, як знайсці час, каб заскочыць у вытворчы аддзел.

Уласна кажучы, дзень як дзень. І ўсё ж пачаўся ён крыху інакш. З самага ранку пасыпаліся віншаванні з узнагародай — медалём «За працоўную адзнаку», які, як бы падводзіў вынікі яе працы за пяць гадоў.

Вырасла яна ў рабочай сям'і, у якой заўсёды з павагай ставіліся да працы. А яшчэ — да кнігі. Пасля дзесяцігодкі — інстытут, работа — добры спецыяліст усюды патрэбны. Перад ёй прамая дарога ў школу, настаўніцтва. Але фантазія малюе іншае. Перад вачыма — кніга, выбар зроблены. Прыступка за прыступкай... Малодшы карэктар, учотчык вытворчага аддзела, карэктар, старшы карэктар, літаратурны рэдактар Дзяржкамвыда БССР. А потым — выдавецтва «Беларусь»: малодшы рэдактар, рэдактар вытворчай і даведачнай літаратуры, старшы рэдактар у рэдакцыі эканамічнай і вытворча-тэхнічнай літаратуры...

Чаму яна, Кашкан, узялася за рэдагаванне такой спецыфічнай і, прама скажам, цяжкай літаратуры? Вось ужо больш двух дзесяткаў гадоў працуе ў адной і той рэдакцыі эканамічнай і вытворча-тэхнічнай літаратуры (праўда — гэта апошняя назва рэдакцыі, якая вызначае яе сутнасць, а ў розны час да рэдакцыі адносілася яшчэ і медыцынская, юрыдычная літаратура). Тамара Сцяпанаўна цяпер у асноўным вядзе выданні па аўтаматызацыі і электроніцы. Многія супрацоўнікі, асабліва маладыя, як агню, баяцца падобнай праблематыкі. Чаму?... Ды таму, што ёсць рэдактарская работа і лягчэйшая.

Сама Тамара Сцяпанаўна мяркуе, што трэба ж некаму рэдагаваць і такую літаратуру — без яе немагчыма ажыццявіць навукова-тэхнічны прагрэс: сёння, як ніколі, дакладныя веды, як навука і вытворчасць,

лоўным аб'ектам быў чалавек, жыццё яго духу. Тут у мастака, як і заўсёды, нераспачаты край работы. Усё важна ў чалавеку, аднак нешта ж патрабуе нашай асабліва пільнай увагі менавіта сёння.

Магчыма, парушэнне адзінства паміж задумай, словам і ўчынкам? Наша памяркоўнасць да маны мяжуе з самапрыніжэннем, а само ўменне гаварыць адно, рабіць другое, а маўчаць пра нешта трэцяе дасягнула віртуознасці надзвычайнай.

І гэта не толькі маральнае, але і цалкам практычнае пытанне. Канфармізм і раздвоенасць асобы абарочваюцца стратамі для грамадства, у духоўным жа плане — проста згубныя.

І яшчэ. Чалавек вышэй сытасці. Чалавек сацыялізму — тым больш. Нельга зводзіць работу па перабудове толькі да пераадолення дэфіцыту тавараў ды высокай зарплаты. Абавязак мастака ў тым, каб у час перамен, якія адбываюцца цяпер, дапамагчы чалавеку паверыць у сябе, у свае сілы, у свой духоўны пачатак. Тады яму стануць блізкімі высокія мэты перабудовы.

Калі б мне прапанавалі яшчэ адказаць на пытанне аб асабовых дадзеных чалавека перабудовы, я б назваў духоўнасць і практычнасць, аб'яднаныя прынцыповай паслядоўнасцю. Такія людзі ўжо дзейнічаюць, яны—героі нашага часу.

Вячаслаў НІКІФАРАЎ.

ВІНШУЕМ!

За заслугі ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва і ў сувязі з васьмідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў артыста Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы СТОМУ Здзіслава Францавіча ордэнам Дружбы народаў.

У АНТАЛОГІІ ДЗІЦЯЧАЙ ПАЭЗІІ

Імя Каюма Тангрыкуліева, туркменскага пісьменніка, лаўрэата Ганаровага міжнароднага дыплома імя Г. Х. Андэрсена, добра вядома дзіцячаму чытачу Беларусі. Актыўна выступае ён і ў ролі перакладчыка. Нядаўна да туркменскага чытача прыйшла анталогія дзіцячай паэзіі свету «Вясёлыя арэлі». Побач з сусветна вядомымі майстрамі дзіцячай літаратуры прадстаўлены і беларускія аўтары. К. Тангрыкуліеў пераклаў вершы Максіма Танка, Еўдакіі Лось, Валянціна Лукшы і Івана Муравейкі.

Гэта не першы зварот туркменскага паэта да беларускай дзіцячай паэзіі. Пераклады ранейшых гадоў друкаваліся на старонках часопіса «Малыш», што выходзіць на рускай і туркменскай мовах.

А. КАРЛЮКЕВІЧ.

г. Ашхабад.

У Саюзе пісьменнікаў БССР

АБМЕРКАВАННЕ ТВОРЧАСЦІ КАСТУСЯ ТАРАСАВА

Сакратарыят праўлення СП Беларусі на пашыраным пасяджэнні заслухаў творчую справаздачу пісьменніка Кастуся Тарасава. У абмеркаванні прынялі ўдзел Максім Танк, Н. Гілевіч, В. Казько, А. Жук, А. Грачанікаў, А. Кудравец, В. Гігевіч, У. Паўлаў, Э. Ялугін, кансультант па беларускай літаратуры СП СССР Г. Грыбоўская і іншыя. К. Тарасаў падзяліўся сваімі творчымі планамі, выказаў меркаванні адносна развіцця гістарычнага жанру ў нашай літаратуры. У выступленнях удзельнікаў пасяджэння адзначалася, што творчасць К. Тарасава — прыкметная з'ява ў сучаснай літаратуры. Пісьменнік плённа і сур'ёзна распрацоўвае маладаследаваныя пласты беларускай гісторыі. Яго гістарычнае эсэ «Памяць пра легенды», аповесці «Пагоня на Грунвальд», «Тры жыцці Рагнеды» і іншыя былі з цікавасцю сустрэты шырокім чытачом, станоўча ацэнены літаратурнай крытыкай.

Абмеркаванне творчасці К. Тарасава вылілася ў сур'ёзную размову пра стан і праблемы гістарычнай літаратуры ў рэспубліцы. Сярод праблем, якія абмяркоўваліся ўдзельнікамі пасяджэння, адзначаліся недахоп увагі літаратурнай крытыкі да твораў на гістарычную тэматыку, адсутнасць артыкулаў з канцэптуальным асэнсаваннем мінуўшчыны і яе адлюстравання ў літаратуры. Секцыі прозы і крытыкі не праводзяць абмеркаванне твораў на гістарычную тэму, а таксама адпаведных крытычных выступленняў, якія з'яўляюцца на старонках перыядычнага друку. Склалася нават традыцыя — успрымаць пісьменнікаў, якія пішуць у гістарычным жанры, як ілюстратараў тых спрошчаных схем беларускай гісторыі, якія прыжыліся на старонках школьных і інстытуцкіх падручнікаў і якіх пакуль што не пазбавіліся і многія манаграфіі. Адыход пісьменніка ад гэтых схем, мастацкая інтэрпрэтацыя пэўных гістарычных падзей успрымаецца ў гэтых умовах як замах на навуку, а пісьменнік часам атрымоўвае палітычнае абвінавачванне з навешваннем бірак пяцідзесяцігадовай даўнасці. У якасці прыкладу прыводзіліся рэцэнзіі доктара гістарычных навук А. І. Залескага, напісаныя, як адзначалі ўдзельнікі размовы, з вульгарна-сацыялагічных пазіцый.

Сакратарыят адзначыў, што неабходна пашыраць кантакты літаратараў з навукоўцамі, арганізоўваць творчыя сустрэчы з гісторыкамі для сумеснага абмеркавання складаных перыядаў беларускай гісторыі, набалелых пытанняў папулярызацыі гістарычнай спадчыны і гістарычных ведаў. Было падкрэслена, што за апошнія дзесяцігоддзі ў нас склалася спецыфічная сітуацыя з гістарычнай адукацыяй моладзі і гэтаму ёсць свае прычыны — не хапае папулярных кніг па роднай гісторыі, па сутнасці амаль што няма даследаванняў палітычнай і ваеннай гісторыі Беларусі. Усё гэта адмоўна адбіваецца на гістарычным жанры прозы, на адносінах выдавецтваў з аўтарамі, на гістарычнай свядомасці наогул.

Была выказана і атрымала падтрымку сакратарыята прапанова распачаць выданне Беларускай гістарычнай бібліятэкі, куды ўвайшлі б як творы беларускіх аўтараў, так і творы рускіх, украінскіх, польскіх пісьменнікаў, якія пісалі пра Беларусь. Сакратарыят вырашыў звярнуцца з адпаведным пісьмом у Дзяржкамвыд БССР. Таксама было выказана пажаданне, каб рэдакцыі часопісаў адводзілі больш месца для публікацый твораў гістарычнага зместу.

Наш кар.

ДЗЕНЬ З БІЯГРАФІІ РЭДАКТАРА

знаходзяцца на вастрыні жыцця чалавецтва. Ну, а потым — ёй прапанавалі, а калі прапанавалі, то давяраюць, спадзяюцца, што яна справіцца.

Успомніліся словы тых, хто яе даўно ведае, што перш, як брацца за новую работу, дасканала пазнаёміўшыся з рукапісам, Кашкан не адзін вечар, не адзін суботні ці нядзельны дзень праводзіць у бібліятэцы — вывучае спецыяльную літаратуру па дадзенай тэме, ГОСТы і г. д. Таму, відаць, многія яе заключэнні, напамінаюць навуковыя артыкулы, пад якімі свой подпіс смела можа паставіць тытулаваны навуковымі ступенямі спецыяліст.

Менавіта так успрымаецца хоць бы адно з апошніх яе заключэнняў на рукапіс, у якім вядзецца гаворка аб брыгадзе як калектыўным гаспадары. І хоць, прама скажам, вывад даволі суровы для аўтара: «На рэцэнзію аддаваць немэтазгодна... перапрацаваць карэнным чынам», аднак, што зробіш, затое, калі справа будзе даведзена да ладу, выйдзе кніга — прыйдзе свята і для аўтара, і для тых, каму прызначана кніга, і, вядома ж, для рэдактара.

Яна не шукае лёгкіх шляхоў, не дае паслаблення сабе і іншым. І тым не менш чалавек ёсць чалавек.

— Калі нешта не атрымліваецца, калі расслабляе стомленасць і складваюцца не так, як трэба жыццёвыя абставіны, — заўважае Тамара Сцяпанаўна, — лепш адкласці работу: супакойся, знайдзі той стрыжань, за які трымаецца чалавек. Недзе я прачытала, што ў рэдактарскай рабоце, як і ў любой іншай, уласна кажучы, рухаючай сілай павінна быць асоба, самабытная і зацікаўленая, тады прыйдзе і поспех.

— А ці не занадта... наконт «самабытнай»? — пытаюся.

— Мабыць, «занадта», — усміхаецца Кашкан. — А ўвогуле... проста трэба рабіць сваю справу сумленна, хварэць за тое, што робіш. Так наш час таго патрабуе...

— А памылкі здараюцца?

— Бываюць і памылкі. Але галоўнае, па-мойму: тое, каб ты зрабіў усё, аддаў усё, на што здатны, каб якаснай была работа. Ну, а памылка... Памылка ёсць памылка...

— Што ж галоўнае ўсё ж у рабоце рэдактара?

Тамара Сцяпанаўна надоўга задумваецца.

— Тут шмат зыходных... І твой узровень, прафесіянальны і чалавечы, і... — загінае пальцы. — І ўсё ж я мяркую, галоўнае, гэта ўменне (перш за ўсё імкненне) знайсці цікавага аўтара, наладзіць дзелавыя адносіны з ім, ну, і чыста чалавечыя, каб правільна пабудаваць работу.

Ну, а дзе той неабходны патэнцыяльны аўтар? Ён у навукова-даследчым і навучальным інстытуце, на прадпрыемстве і ў галіновым ведамстве — ды ці мала дзе! Ён складае пастаянны савет пры рэдакцыі. Але для прыцягнення да работы аўтараў неабходна бываць на месцах, а не абмяжоўвацца рассылкай тэматычных планаў. Трэба, калі хочаце, умець з імі пасябраваць. Аднак не за кошт беспрынцыповасці і кампрамісаў.

Успомніла мая субяседніца адзін выпадак. Прынёс аўтар рукапіс — не будзем называць яго прозвішча. Тэма актуальная і сур'ёзная — аб якасці прадукцыі, якая павінна адпавядаць сучаснаму ўзроўню навукова-тэхнічнага прагрэсу. Тэма, вядома, тэмай, а вось выкананне... Карацей, заўваг шмат. І сумбурнасць, рознастылёвасць выкладання матэрыялу, і недакладнасці, прыгожасці, і запазычанні з іншых крыніц, і... Аўтар палічыў, што да яго прыдзіраюцца. Аднак аўтарытэтны рэцэнзент не толькі пагадзіўся з рэдактарскімі вывадамі, але і выказаў яшчэ новыя заўвагі. Ну, а далей? А далей — вельмі і вельмі крыўднае: маўляў, рэдактар «падгаварыла» рэцэнзента(?)...

І ўсё ж Кашкан знайшла ў сабе вытрымку і такт, не кінулася ў амбіцыю (будзем шчырымі, падобнае нярэдка здараецца), а здолела змяніць думку аўтара. Ад сораму ён потым апусціў вочы.

Многія аўтары —людзі, якія маюць навуковыя ступені. Некаторыя з іх глядзяць на рэдактара зверху: маўляў, што ты разумееш у маёй справе! Але так спачатку. Сваёй кампетэнтнасцю яна пераконвае ў адваротным. А любімы яе выраз. «Кніга — мой прафесіянальны твар», — успрымаецца нават самымі ўпартымі з павагай, як нешта натуральнае.

Як вядома, адзін з паказчыкаў рэдактарскай дзейнасці, эканомія паперы. А за кошт чаго гэта ў першую чаргу дасягаецца? Скарачэння паўтораў, агульных мясцін, разважанняў не па тэме... У выніку танчэе рукапіс. Калі-нікалі і вельмі. А гэта не кожнаму падабаецца.

— Зноў канфліктная сітуацыя?

— Трэба і можна даказаць, пераканаць у неабходнасці скарачэння, — гаворыць Кашкан. — А ў асноўным аўтары адносяцца з адказнасцю. І крытычна. Адзін, пасля майго азнаямлення з рукапісам, некалькі іранічна ў адносінах да сябе спытаў: маўляў, са стула не ўпалі? «Не, не ўпала, — адказваю. — А вось перш, чым выпусціць кнігу, давядзецца нямала папрацаваць». Год працавалі. Выйшла кніга. Мела поспех. З гэтым аўтарам, увогуле, было лёгка працаваць. А пападаюцца — і нярэдка — і такія, што ўсю душу выматае. Працавала, помню, з адным кандыдатам эканамічных навук. Тэма — цяжкая, але актуальная і патрэбная. Пытанні інфраструктуры і эфектнасці грамадскай вытворчасці. Давялося, як кажуць, у тэму з галавой залезці. Але не ў гэтым справа. Аўтар востра рэагаваў літаральна на кожную заўвагу, кожную праўку. А наконт скарачэнняў, хоць вельмі шмат было паўтораў, непатрэбных цытат, — і гаварыць не даводзіцца...

На твар маёй субяседніцы набягае цень. Я ўжо чуў аб рабоце над гэтай кнігай. Ведаў, што Тамара Сцяпанаўна ўнесла шмат слушных прапаноў і, па ўсім відаць, цалкам пакарыла ўпартага аўтара, калі гаворка зайшла аб тэрміналогіі, дзе яна выявіла глыбокую дасведчанасць. Аўтар быў нават разгублены, паколькі нават сам пра некаторыя рэчы слаба ведаў. Зразумела, усё гэта далося няпроста і нялёгка, затое справа нарэшце пайшла на лад. Рукапіс быў скарочаны, між іншым, ажно на тры аркушы, але гэта зместу не пашкодзіла.

Дарэчы, калі загаварылі аб скарачэннях, эканоміі паперы, дык галоўны крытэрый тут у Тамары Сцяпанаўны — паляпшэнне рукапісу будучай кнігі. Праўда, ёсць яшчэ ў яе на ўзбраенні і чыста тэхнічны шлях скарачэння аб'ёму. Перш за ўсё за кошт больш рацыянальнай пабудовы табліц, скарачэння колькасці малюнкаў, спрашчэння іх відаў, разрэзаў і сячэнняў, правільнай падачы «двухпавярховых» формул у адным радку і г.д. Карацей, да ўсяго падыходзіць творча — тады выйграе сама кніга, выйграе той, каму яна прызначана. І тут вельмі важна, каб рэдактар і аўтар выступілі як аднадумцы. І гэтага ў рэшце рэшт дамагаецца Кашкан.

Менавіта, знайшоўшы агульную мову з аўтарамі М. Радзіеўскім, М. Слесаравым, В. Еўтухам, старшы рэдактар Тамара Сцяпанаўна Кашкан выпусціла змястоўныя кнігі «Аператыўнае кіраванне прамысловай вытворчасцю», «Эфектыўнасць будаўнічай вытворчасці: праблемы, пошук, практыка», якія адпавядаюць часу. Пры гэтым было сэканомлена больш шасці аркушаў паперы.

Гэта толькі асобныя прыклады.

Пошук цікавых, кампетэнтных аўтараў, умацаванне сувязі з імі працягваецца. І гэта дае свае вынікі — па-сапраўднаму добрыя кнігі, як, напрыклад, з серыі «Героі пяцігодкі» і іншыя, якія атрымалі высокую ацэнку ў Дзяржкамвыдзе СССР.

Калектыў выдавецтва «Беларусь» працуе ў новых умовах гаспадарча-эканамічнай і творчай дзейнасці. Свежы подых часу, грандыёзная перабудова, паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, закранула літаральна ўсіх. Кожны павінен зладжана і якасна працаваць. Аднак, відаць, неабходна сказаць яшчэ аб адным. Аб адчуванні локця, добрым таварыстве, якое не перашкаджае патрабавальнасці.

Аднойчы яе папрасілі прачытаць рукапіс, падрыхтаваны да публікацыі маладой, як кажуць, толькі што спечаным рэдактарам. Пры гэтым сказалі, каб не была вельмі строгай.

— Справа нават не ў строгасці, а ў праўдзе, — адказала Тамара Сцяпанаўна. — Калі згладжваць вострыя вуглы, фальшывіць, дык мала чаму добраму навучыш. Ды і сорамна. Не падыходжу — давайце іншаму...

— Падыходзіце.

Яна прачытала рукапіс. Уважліва і патрабавальна. Чытачу ўсё адно, хто рэдагаваў кнігу: галоўнае, каб яна адпавядала запатрабаванням дня, была карыснай.

І, як здагадваецеся, з маладым рэдактарам адбылася размова не з прыемных. Да гонару рэдактара, яна не пакрыўдзілася, не пайшла ў амбіцыю, а ўспрыняла крытыку належным чынам.

І так заўсёды — наперадзе праўда і справядлівасць. Таму, мабыць, так шмат у яе сяброў-таварышаў.

Дзень — у чарадзе іншых яе дзён, — з якіх складваецца біяграфія, складваецца жыццё.

Алег ФОМЧАНКА.

ВІНШУЕМ

Пімену ПАНЧАНКУ — 70

23 жніўня спаўняецца 70 год народнаму паэту Беларусі Пімену Панчанку. З гэтай нагоды праўленне СП БССР накіравала юбіляру прывітальны адрас, у якім, у прыватнасці, гаворыцца:

«Дарагі Пімен Емяльянавіч! Горача, ад усяго сэрца вітаем Вас, выдатнага беларускага паэта і грамадскага дзеяча, у дзень Вашага 70-годдзя!

Мінула больш за паўстагоддзе, як у друку з'явіліся вершы, падпісаныя імем Пімен Панчанка. Гэта было ў 1934 годзе, калі Вы пачалі настаўнічаць у адной са школ Кіраўскага раёна, заочна працягваючы вучобу на філалагічным факультэце Мінскага настаўніцкага інстытута. Скончыўшы ў 1939 годзе інстытут, Вы адразу ж былі прызваны ў Савецкую Армію. У якасці карэспандэнта армейскага і франтавога друку прымалі ўдзел у вызваленні Заходняй Беларусі, з калі пачалася Вялікая Айчынная вайна — у баях на Бранскім, Заходнім, Калінінскім, Паўночна - Заходнім франтах. У 1944—1945 гадах з часцямі Савецкай Арміі знаходзіліся ў Іране.

Вярнуўшыся ў Мінск, супрацоўнічалі ў рэдакцыях «Вожыка» і газеты «Літаратура і мастацтва», доўгі час былі галоўным рэдактарам часопісаў «Советская Отчизна» і «Маладосць», працавалі сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У 1958 годзе ў складзе беларускай дэлегацыі прымалі ўдзел у рабоце XIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

Ваш першы зборнік вершаў «Упэўненасць» выйшаў у 1938 годзе, праз год убачыла свет кніга «Вераснёвыя сцягі», трэцяя кніга паэзіі «Трывожныя зарніцы», не паспеўшы выйсці, загінула ў разбураным вайной Мінску. У ваенныя гады ў Маскве выйшлі Вашы кнігі «Табе, Беларусь» (у перакладзе на рускую мову) і «Дарогамі вайны».

Вельмі плённай была Ваша літаратурная дзейнасць у пасляваенны час і ў наступныя дзесяцігоддзі. Запомніліся чытачам Вашы паэтычныя кнігі «Далёкія станцыі», «Гарачыя вятры», «Шырокі свет», зборнік сатыры і гумару «Гарачы лівень» (у «Бібліятэцы «Вожыка»). Вашы грамадзянскія і сатырычныя вершы таго перыяду («Верхалазы», «Прыстасаванцы» і інш.) і да гэтага часу не страцілі сваёй вастрыні і актуальнасці.

У 1959 годзе выйшла Ваша «Кніга вандраванняў і любові» (паэма «Патрыятычная песня», змешчаная ў ёй, адзначана Літаратурнай прэміяй імя Янкі Купалы).

У першай палове шасцідзесятых гадоў з'явіліся Вашы зборнікі «Нью-Йоркскія малюнкі», «Тысяча небасхілаў», у якіх значнае месца займаюць вершы, навеяныя ўражаннямі ад паездак за мяжу.

У гэтыя ж гады ўбачылі свет зборнікі «Пры святле маланак», за які Вам была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы. і «Размова з наследнікамі». Палюбіліся аматарам паэзіі Вашы кнігі апошніх год: «Снежань», «Крык сойкі», «Вячэрні цягнік», «Дзе начуе жаўранак», за якую ў 1981 годзе Вы атрымалі Дзяржаўную прэмію СССР, «Маўклівая малітва», «Лясныя воблакі» і ўрэшце — «І вера, і вернасць, і вечнасць».

Вашаму пяру належыць і зборнік літаратурна - крытычных артыкулаў «На паэтычным небасхіле».

Ваша паэзія, пачынаючы ад першых кніг і канчаючы вершамі апошняга часу, якія склалі зборнік «І вера, і вернасць, і вечнасць», — гэта цэлы свет, вялікі і шматгранны, свет духоўнага жыцця нашага сучасніка, які абараняў Радзіму ад ворагаў і на працягу ўсяго жыцця змагаўся і змагаецца за ідэалы сацыялістычнага грамадства супраць мяшчанскай бездухоўнасці, спажывецкіх адносін да жыцця, коснасці і бюракратызму. Крыштальная сумленнасць і непахісная мужнасць вызначаюць сацыяльна - грамадскі і маральна - эстэтычны змест Вашай творчасці, яе тэматычныя і жанравыя абсягі.

Кожная Ваша кніга кранае душу сваёй грамадзянскай мужнасцю, жыццесцвярджальным гуманістычным пафасам, глыбокім філасофскім роздумам, незвычайнай лірычнай пранікнёнасцю і непасрэднасцю пачуцця. Гэтыя якасці Вашага вялікага таленту асабліва яскрава выявіліся ў вершах апошняга часу, прасякнутых пафасам перабудовы і сацыяльна-маральнага абнаўлення нашага грамадства.

Пра ідэйна - мастацкую вартасць і папулярнасць Вашай паэзіі сведчыць і тое, што яна неаднаразова перавыдавалася, у тым ліку і ў апошнія гады (кнігі «Млечны шлях», «Прылучэнне»). Выходзілі зборы твораў. Выдавецтва «Художественная литература» ў 1984 годзе выдала Вашы «Избранные произведения» ў двух тамах.

Вашы вершы перакладзены на мовы народаў СССР, краін сацыялізму і многія мовы народаў свету.

Значнае месца ў Вашай творчай дзейнасці займае перакладчыцкая праца. Па Вашых высокамастацкіх перакладах беларускі чытач меў магчымасць пазнаёміцца з «Разбойнікамі» Ф. Шылера, паасобнымі творамі А. Міцкевіча, Я. Райніса, А. Суркова, Т. Масэнкі, М. Нагнібеды і многіх іншых.

Побач з літаратурнай, шмат сілы і часу Вы аддаяце і грамадскай дзейнасці. Вы з'яўляецеся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, членам Мінскага абкома КПБ, членам праўлення СП СССР і членам прэзідыума праўлення СП Беларусі, старшынёй Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру і членам прэзідыума Савецкага камітэта абароны міру, членам рэдкалегіі часопіса «Маладосць».

Партыя і ўрад высока ацанілі Вашу літаратурную і грамадскую дзейнасць, узнагародзіўшы Вас ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны», ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Шчыра віншуючы Вас са слаўным 70-гадовым юбілеем, жадаем Вам, дарагі Пімен Емяльянавіч, моцнага здароўя, вялікага асабістага шчасця і новых поспехаў у творчасці і грамадскай дзейнасці».

Супрацоўнікі штотыднёвіка ў сваю чаргу сардэчна віншуюць юбіляра, былога супрацоўніка «ЛіМа», яго актыўнага аўтара.

ЮБІЛЯРУ

Павіншавальны спіч

Не пад баян, не пад гітару
Паэт улагоджвае вушы
чынушы.
Бязлітасным дзеркачом
санітара
Хвошча глухія, замшэлыя
душы.

Нямала іх, таўкачоў
і таўкачыкаў,
Гвачоў,
цемрашалаў-апрычнікаў
Увекавечыў для нашчадкаў
Панчанка
Пімен — летапісец
Кастрычніка.

Падрадчыку праўды, сумлення
дарадчыку,
Слава паэту Пімену
Панчанку!

Васіль ВІТКА.

Дзмітрый БУГАЁЎ

Праца да стомы, з няпраўдаю бой...

Пімен Панчанка. І вера, і вернасць, і вечнасць. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1987.

ПІМЕН ПАНЧАНКА вызначаецца ў нашай паэзіі выключнай чуласцю да сучаснасці і вельмі высокім напалам грамадзянскасці. «Паэзія без сучаснасці, без грамадзянскага гучання—непаўнацэнная паэзія»,—перакананы ён.

Асаблівага напалу грамадзянскасць панчанкаўскай паэзіі дасягнула ў кнізе «Пры святле маланак» (1966), народжанай на хвалі тых грамадскіх зрухаў і перамен, якія пачыналіся ў нас пасля XX і XXII з'ездаў партыі. Натуральным працягам той кнігі сталі зборнікі «Снежань» (1972), «Крык сойкі» (1976), «Вячэрні цягнік» (1977), «Маўклівая малітва» (1981). Лепшыя вершы з гэтых зборнікаў склалі кнігу «Дзе начуе жаўранак», якая атрымала шырокі рэзананс не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Савецкай краіне і была адзначана Дзяржаўнай прэміяй СССР.

Сёння многае пераглядаецца, нанава пераацэньваецца і ў жыцці, і ў літаратуры. І ўжо нікога не дзівяць размовы, што і літаратурныя ўзнагароды часам даваліся незаслужана. Але гэта менш за ўсё датычыць Пімена Панчанкі.

У той год, калі яму прысуджалася Дзяржаўная прэмія СССР, мне давялося ў час адной, можна сказаць, выпадковай сустрэчы гаварыць пра нашу паэзію з Д. Кугульцінавым. Калі прыгадаўся Панчанка, я пачаў бедаваць, што рускія пераклады не перадаюць усё багацце ягонай паэзіі. Д. Кугульцінаў не стаў з гэтым спрачацца, але энергічна зазначыў: і таго, што застаецца ў рускіх перакладах ад вершаў Пімена Панчанкі, дастаткова, каб лічыць яго выдатным паэтам. Вядома, гэта прагучала як самая высокая, але справядлівая пахвала. Яна апраўдана і маштабамі таленту паэта, і яго гранічнай сумленнасцю ва ўсім і заўсёды. Бо і ў тыя часы, якія цяпер называюцца перыядам застою, П. Панчанка працаваў на поўную сілу, з добрай творчай самааддачай.

Ад збояў на рыторыку і гучную беззмястоўнасць Пімена Панчанку і ў самыя цяжкія для літаратуры часы звычайна ратавалі па меншай меры тры ўнутрана ўзаемазвязаныя якасці яго чалавечай і пісьменніцкай асобы: моцнае пачуццё гумару, якое ў многіх вершах паэта стварае яркі іранічны кантэкст; уласцівае, бадай, кожнаму выдатнаму таленту арганічнае праўдалюбства і непаказная самакрытычнасць, якая хораша глядзіцца і ў самім жыцці, а ў паэзіі не дае вельмі ўжо адрывацца ад грэшнай зямлі, засцерагае чуйных мастакоў ад залішняй захопленасці нават у адкрыта пафасных творах.

Гэта яна, бязлітасная панчанкаўская самакрытычнасць, некалі выклікала да жыцця славутую «Анкету», у якой паэт, не баючыся рэзкіх перабольшанняў, напісаў:

**Калі мая песня каго й
хвалявала,
То тая, апранутая у шынель...
Растрачана дзён незваротных
нямала
На дробязь, на глупства,
на тосты, на мель.**

«Званы жыцця» (выраз з верша «Апалашчуся хвалямі вятроў») заўсёды моцна, выразна і чыста звінелі ў паэзіі Пімена Панчанкі. Але і ў яго ў пераломныя перыяды нашай гісторыі адносна роўны звон званоў жыцця перайначваўся, набываў выбуховую сілу, бо ў такія часы надзвычай абвастраўся паэтычны голас мастака, узмацняўся грамадзянскі пафас яго творчасці, асабліва рэзка выказвалася непрымірымасць да ўсяго таго, што скажае сапраўдную прыроду сацыялістычнага грамадства, перашкаджае нам паспяхова рухацца наперад. Так у 1956 годзе з'явіўся магутны сваім напалам грамадзянскай страснасці верш «Прыстасаванцы», які стаў адным з тых твораў, што пазначалі новы, у многім пераломны этап нашага і грамадскага, і літаратурнага жыцця.

Той жа адкрыты і моцны пафас грамадзянскасці гучыць у вершы «Ямбы»:

**Мне надакучылі малебны
У шалашах звычайных дат,
Ружовы дым і гул хвалебны
І хітра скроены даклад.
Ледзь не штодня са сцэн
бялеюць
Прэзідыумныя ілбы.
Занадта многа юбілеяў,
Занадта многа пахвальбы.**

Можна падумаць, што верш напісаны зусім нядаўна, так ён сугучны менавіта сённяшняму часу. На самой жа справе твор датуецца яшчэ 1962 годам. І ўваходзіў ён у кнігу «Тысяча небасхілаў».

А ў згаданай ужо кнізе «Пры святле маланак», якая вельмі ярка адлюстравала ўздым грамадскай свядомасці, што адбываўся ў сярэдзіне 50-х—пачатку 60-х гадоў, Пімен Панчанка, змагаючыся за ісціны, «простыя, як хлеб, і праўдзівыя, як плач дзіцяці», страсна выкрываў «рабства чаркі, паперы, блату», «рабства дачаў і аўтамашын», з'едліва бічаваў самазадаволенасць чыноў, што «тлушчам заплылі і раўнадушшам», пустую рыторыку «языкачосаў безадказных», подласць, «хлусню і пошласць» адукаванага мяшчанства і іншыя праявы тагачаснага грамадскага паразітызму, якія аказаліся вельмі жывучымі. І таму барацьба з імі, яўна паслабленая ў перыяд застою, асабліва настойліва вядзецца ў нашы дні паскарэння і рэвалюцыйнай перабудовы ва ўсіх сферах жыцця.

З новай сілай вядзе гэтую барацьбу і паэзія Пімена Панчанкі, пра што пераканальна сведчаць творы, сабраныя ў кнізе «І вера, і вернасць, і вечнасць».

Праўда, новымі тут з'яўляюцца толькі вершы першага раздзела. У другім жа раздзеле (ён намнога меншы, займае прыкладна трэць кнігі) надрукавана 18 вершаў, якія ўжо змяшчаліся ў папярэднім зборніку «Лясныя воблакі» (1985). Але гэта не так ужо і важна, бо і храналагічна яны недалёка адстаяць ад новых твораў з кнігі «І вера, і вернасць, і вечнасць», і танальнасцю, асноўнымі матывамі блізкія да іх.

Па сваіх вызначальных тэндэнцыях, па галоўнаму пафасу і ўвогуле па актыўнай наступальнасці аўтарскай пазіцыі кніга «І вера, і вернасць, і вечнасць» уяўляецца мне працягам і развіццём лепшых традыцый усёй панчанкаўскай паэзіі, тых яго твораў, якія, па словах Васіля Быкава, «былі выразнікамі дум і спадзяванняў эпохі».

А яшчэ я бачу ў гэтай кнізе выразную ўнутраную, сутнасную пераклічку з такімі выдатнымі творамі савецкай літаратуры, апублікаванымі ў апошнія часы, як паэмы «Па праву памяці» А. Твардоўскага і «Фуку» Я. Еўтушэнкі, аповесць «Пажар» В. Распуціна, раманы «Сумны дэтэктыў» В. Астаф'ева, «Плаха» Ч. Айтматава і «Кар'ер» В. Быкава.

Дарэчы, з творамі Распуціна, Астаф'ева і Айтматава панчанкаўскую паэзію слушна супастаўляў Ніл Гілевіч у сваім дакладзе на пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў БССР 4 чэрвеня 1987 года.

Характэрна, што як і ў панчанкаўскай паэзіі апошніх гадоў, так і ў большасці тых згаданых твораў, якія, дарэчы, прыцягваюць асаблівую ўвагу сённяшняга чытача, адкрыта гучыць страснае публіцыстычнае слова.

П. Панчанка. 1932 г.; П. Панчанка. 1936 г.; Першая канферэнцыя маладых пісьменнікаў саюзных рэспублік у Маскве. Сустрэча з В. П. Чкалавым (П. Панчанка ў другім радзе ў цэнтры). Снежань 1938 г.; П. Панчанка. Студзень 1942 г.; П. Панчанка ў Доме культуры рабочага пасёлка Ялізава Асіповіцкага раёна. 1957 год.

Увогуле можна сказаць, што сёння публіцыстычнасць усё мацней пранізвае самыя разнастайныя па сваёй мастацкай структуры творы. Гэтая з'ява ўжо не раз адзначалася, але выклікае яна неадназначную ацэнку, а часам і яўную незадаволенасць, прамыя нараканні. Толькі нараканні гэтыя не заўсёды абгрунтаваныя. Бо ўрэшце ўсё залежыць ад таго, наколькі арганічная для пісьменніка яго публіцыстычнасць, ці ёсць у ёй сапраўдная змястоўнасць.

Адна справа, калі публіцыстыка ідзе ад няўмення аўтара даць больш аб'ектывізаваныя, моцныя сваёй непасрэднай выяўленчасцю малюнкі і фактычна з'яўляецца ўсяго толькі спробай хоць неяк прыкрыць слабасць уласна мастацкага пісьма. І зусім іншая размова, калі гарачае публіцыстычнае слова пісьменніка ўзнікае ад судакранання з болевымі кропкамі жыцця, часу, эпохі, з тымі грамадска-сацыяльнымі і ўласна чалавечымі праблемамі, абыякавымі да якіх могуць заставацца толькі вельмі раўнадушныя, чэрствыя і хіжыя ў сваёй подласці людзі.

Відаць, такую раўнадушнасць меў на ўвазе Л. Талстой, калі разважаў пра заспакоенасць душы як пра подласць. Можна згадаць і А. Швейцара, які, адштурхоўваючыся ад талстоўскай думкі, пісаў: «Спакойнае сумленне—гэта вынаходства д'ябла».

Што датычыць панчанкаўскай публіцыстычнасці, дык яна ў сваіх лепшых узорах нараджаецца ад рашучага і катэгарычнага непрымання паэтам такой заспакоенасці, душэўнай чэрствасці і раўнадушша. І яна тым мацнейшая, чым больш страсная, рэзкая і непрымірымая. Такім чынам, якраз вялікая страснасць, асаблівая абвостранасць і з'едлівасць публіцыстычнага слова Пімена Панчанкі робяць надзвычай сучаснай яго сённяшнюю паэзію, уздымаюць яе на новую вышыню.

«Публіцыстычная завостранасць цэлых цыклаў панчанкаўскіх вершаў рабіла іх баявой зброяй народа ў барацьбе з бюракратызмам, пустазвонствам і раўнадушшам, якія з такой цяжкасцю выкарчоўваюцца з нашага жыцця»,—некалькі гадоў таму назад пісаў Васіль Быкаў, вызначаючы самыя характэрныя асаблівасці паэзіі Пімена Панчанкі.

У кнізе «І вера, і вернасць, і вечнасць» Пімен Панчанка паранейшаму ваюе супраць раўнадушша і пустазвонства, бюракратычнага засілля і мяшчанскай пошласці, ваяўнічага спажывецтва і агрэсіўнай самазадаволенасці. Але пачуццёвы напал і рэзкасць выкрыцця ў паэта яўна ўзрастаюць, прынамсі, у параўнанні з творамі 70-х гадоў.

Можа, самы яркі, але далёка не адзіны прыклад у гэтых адносінах—«Паэма сораму і гневу», страсны публіцыстычны твор, дзе горкая праўда пра некаторыя нашы перакосы выказана з такой безагляднай адкрытасцю, якая яшчэ зусім нядаўна, да цяперашняй перабудовы, цяперашняй галоснасці, была проста немагчымай, ва ўсякім разе для слова друкаванага.

Я рос бяздумным дурнем,
як і ўсе,
І славіў росквіт,
Светлы век машынны.
Глядзеў з пагардай на каня
ў аўсе,
На воз бацькоўскі свежай
канюшыны.
Я цэрквы закрываў,
Я абразы паліў,
Сялянскую маёмасць
перапісваў.
І нюхалі нішчымныя палі
Кароў галодных
Родныя мне пысы...

Гэта, вядома, пра перагібы і крайнасці пары даваеннай. Іх паэт ужо закранаў і раней, скажам, у вельмі ёмістай аўтабіяграфічнай паэме «Маладосць у паходзе» (1945). Але тады ў гаворцы пра тыя перагібы пераважала гумарыстычная ўсмешка ўжо дарослага чалавека, узбагачанага новым жыццёвым вопытам, у тым ліку вынесеным з Айчыннай вайны, над сваёй колішняй, яшчэ дзіцячай і юнацкай, наіўнасцю ва ўспрыманні крайнасцей грамадскага жыцця 20-х і 30-х гадоў. У той усмешцы была свая паэзія, быў свой значны сэнс, але не было і не магло быць цяперашняй асаблівай катэгарычнасці ў асуджэнні адмоўнага ў нашай ранейшай гістарычнай практыцы. Бо з такой гранічнай абвостранасцю і рэзкай непрымірымасцю тое адмоўнае стала ўспрымацца, бадай, толькі ў наш час, пазначаны надзвычай моцным імкненнем да поўнай праўдзівасці і абсалютнай сумленнасці ва ўсім.

Не менш рэзка гаворыцца ў «Паэме сораму і гневу» пра перакосы пасляваеннай пары:

Я сек сады,
Прынёс бяду лясам,
Я сеяў кукурузу на балотах,
Абкрадзены народ
Пачаў цягнуць і сам,
І п'яніцы валяліся
пад плотам.
Настала эра паразітаў і папер.
Зямлю я разлюбіў,
Уцёк з калгаса.
І працы мудры лад ледзь не
пагаснуў.
А я пісаў пра дробязь
І... цярпеў.
То я ўзрасціў няўмек і гультаёў.
Застой. Крадзёж.
На складах—горы дрэні.
Зямлі і праўды,
Мовы і гаёў
Ірвалі мы спрадвечныя карэнні.

Да гаворкі пра мову прыйдзецца вярнуцца крыху пазней. А цяпер яшчэ варта паглядзець, з якой бязлітаснасцю піша паэт пра некаторых сяброў па літаратуры—тых, якія ў забяспечаным тылавым зацішку стваралі вымучаныя, фальшыва-штучныя творы пра вайну і гора акупіраванай ворагам Беларусі, хоць самі не нюхалі пораху, «не бачылі ў агні перадавой».

Не страшны фашыстоўскі
ім бандыт!
Пісалі ў цеплыні пра кроў
народа,
Па Беларусі плакалі наўзрыд,
Вылізвалі сабе узнагароды.

Зноў матыў, знаёмы і па ранейшай паэзіі Пімена Панчанкі, напрыклад, па вершу «Слова да паэтаў», у якім былі такія ўвогуле дастаткова з'едлівыя радкі:

За перамогу вялікай цаной
Плацілі найлепшыя сэрцы.
А баба Агапа у вас начаргой
Знішчыла роту немцаў.

Была ў тым ужо даўнім вершы (ён напісаны ў 1948 годзе) і грамадзянская страснасць. Ды зноў жа крыху прыглушалася яна падтэкставай усмешкай, ва ўсякім разе, выяўлялася далёка не з такой падкрэсленай рэзкасцю і безумоўнай асуджальнасцю, як у творы нашых дзён.

У тым жа ключы рэзкай завостранасці напісаны верш «Ратуйце нашы душы!»:

Тайфун прыгнаў на сушу
навадненне,
Гараць лясы ці тонуць караблі,
Жывое ўсё ахопіць страх
знікнення—
І «SOS» нясецца па усёй зямлі.
Ці катастрофа, ці
землетрасенне—
Імчымся пацярпеўшых
выручаць...
А тут амаль што гіне пакаленне,
А сэрцы раўнадушныя маўчаць.
. . . . . .
Разлад.
Развод.
Сіроцтва ўсё часцей.
І ходзяць беспрытульна
па дарозе
Мільёны нашых страчаных
дзяцей...

Гэта пра нашы, дарослых людзей, грахі перад моладдзю. Там жа з моцнай выкрывальнасцю напісана і пра самую моладзь:

Не трэба ім ні кнігі, ні газеты.
Футбол і тэлек.
Дзе знайсці рублі?
Ёсць ліфты, сцены, гаражы,
клазеты—
Пішы і пэцкай, покуль
не зграблі.
Спяваюць прымітыўныя іх
барды,
Што трэба ім усім зляцець
з арбіт.
Спяваюць пра кактэйлі
ў дзіўных барах,
Пра коней, што растопчуць
нудны быт...
Яны чытаць не хочуць вершы
Броўкі,
Ім хочацца з Высоцкім
ачмурэць.

Як бачым, Пімен Панчанка не запабягае і перад моладдзю, хаця ў іншых сваіх вершах ён напісаў пра яе нямала добрых слоў. Але ён выразна бачыць і недахопы моладзі і востра крытыкуе іх. Трэба толькі агаварыцца, што ў радку, дзе ўпамінаецца Высоцкі, гнеў паэта скіраваны, вядома ж, не супраць гэтага надзвычай арыгінальнага і самаахвярнага мастака, які раней за многіх іншых адкрыта, шчыра і страсна загаварыў пра ценевыя бакі нашага жыцця, пра многія нашы пралікі і недаробкі, асабліва ў духоўнай сферы. Панчанкаўскі закід тут цэліць у тых, хто сваім фанатычным ажыятажам апашляе сапраўднае мастацтва, вынішчаючы ў ім жывую душу і высокую думку, ператварае яго ў сродак знарочыстага ачмурэння.

З абурэннем піша Пімен Панчанка пра псеўдавучоных, якія і раней не раз станавіліся аб'ектам яго з'едлівай крытыкі, пра тое, што відавочны рост адукацыйнага ўзроўню не суправаджаецца адпаведным маральна-этычным, духоўным прагрэсам:

Хоць усе ў нас сёння
з адукацыяй,
Нават некаторыя ў чынах,
А сумлення інтэнсіфікацыю
Трэба як хутчэй распачынаць.
(«Запасныя гнёзды»)

Праблема гэтая сёння вельмі востра стаіць перад чалавецтвам. «Чалавецтва ў маральных адносінах не паспявае за тымі дасягненнямі, якія яно стварае з дапамогай свайго розуму і сваіх рук»,—падкрэслівае Ч. Айтматаў. І да яго вельмі слушных слоў, з якімі выразна перакліканцца цытаваныя панчанкаўскія радкі, можна толькі дадаць, што разрыў гэты становіцца ўсё больш пагражальным. І праяўляецца ён на самых розных узроўнях. І ў тым, у прыватнасці, што навуковатэхнічная рэвалюцыя, якая рэзка ўзняла той жа адукацыйны ўзровень, не знішчыла, аднак, ні духоўнае дзікунства, ні цывілізаванае варварства, ні мяшчанска-спажывецкую, ваяўнічаўрвіцельскую псіхалогію.

Вось чаму для нас і сёння вельмі важныя так званыя простыя, агульначалавечыя па свайму галоўнаму сэнсу нормы маралі і справядлівасці. Гэтыя нормы маюць глыбінныя, сапраўды народныя асновы, бо і ствараліся яны чалавецтвам, народнымі масамі на працягу тысячагоддзяў іх існавання.

Трываласць і сапраўдная значнасць агульначалавечых нормаў маралі для нашага часу і будучыні падкрэсліваецца і тым, што іх не адмаўляе, а ўключае, убірае ў сябе камуністычная мараль, якая характарызуецца ў новай рэдакцыі Праграмы КПСС як «самая чалавечная, справядлівая, высакародная».

Трывалая апора на простыя, агульначалавечыя нормы народнай маралі характэрная і для панчанкаўскай паэзіі. У адрозненне ад некаторых нашых ваяўнічых даследчыкаў, якія пад знак безумоўна заганнай патрыярхальнасці гатовы падвесці ўсё спрадвечнае, а самую народную мараль абвясціць духоўна заніжанай і нават амаральнай, Пімен Панчанка з'едліва іранізуе над тымі, хто аб'яўляе прымітывам, «старой вяскоўшчынай» усё роднае (верш «Чым жа мы апраўдаемся?»). Паэт з горыччу заўважае, што актыўна плодзяцца:

Банкетаносцы, раганосцы,
Халтуршчыкі ў змяінай злосці,
Зайздроснікі і слімакі—
Такі смурод, што хоць
выносьце
На могілкі ці да ракі.
(«Свет повен ціхімі піратамі»)

Паважлівая гаворка пра старыя звычкі, заснаваныя на народнай маралі, ёсць і ў вершы «Эпоха». А ў такіх творах, як «На паўдарозе да Эверэста», «Кажуць, трэба стварыць чалавека», «Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае» і інш., а таксама ў той жа «Паэме сораму і гневу» побач з развіццём іншых матываў услаўляюцца міласэрнасць і дабрыня, народныя ўяўленні пра чалавечнасць і справядлівасць, праўду і сумленнасць.

У вершы «Паслядоўнік» Пімен Панчанка з гонарам сцвярджае, што лічыць сябе паслядоўнікам матчынага, гэта значыць зноў жа народнага, стаўлення да жыцця:

Яна прывучыла мяне
спачуванню
І птушцы падбітай, і дрэву
зламанаму.
Яна навучала нас без
павучання,
Заўжды засланяла ад слова
падманнага.

Разам з праўдалюбствам, спагадлівасцю, дабратой і сумленнасцю, патрабаваннем асабістай чалавечай сціпласці вельмі многа значыць у маральным кодэксе народа глыбокая павага да працы. Яна з'яўляецца адной з галоўных асноў гэтага кодэкса. Таму і ў паэзіі П. Панчанкі хвала працы ці асуджэнне тых, хто садзейнічае яе занядбанню або сам не ўмее як след працаваць, гучыць асабліва часта, можна сказаць, паўтараецца з верша ў верш.

З напамінку аб працы пачынаецца верш «Апошняя імша», дзе ў форме паэтычнага маналогу-павучання, непасрэдна звернутага да чытача, нагадваюцца зноў жа галоўныя ў чалавечым жыцці каштоўнасці:

Працуй штодня,
Працуй няспынна,
Пакуль не грукне шэсцьдзесят.
Рабі ўсё моцна, як мужчына.
Які рыхтуецца ў дэсант.
На кулакі не спадзявайся,
Умей свой нораў закілзаць.
І салаўём не залівайся,
Калі няма чаго сказаць.
Дзяцей не крыўдзі.
І жаноцкасць
Сваёй паловы не грызі.

Зусім відавочна, што націск і тут зроблены менавіта на тыя каштоўнасці, якія цалкам узгадняюцца з народнымі маральна-этычнымі прынцыпамі.

Для разумення панчанкаўскага эстэтычнага свету, як ён выяўляецца ў кнізе «І вера, і вернасць, і вечнасць», вельмі важны верш «Ля жыта».

У нашай паэзіі жыта звычайна выступае сімвалам жыцця і вечнасці. Так, прынамсі, асэнсоўваў яго Аляксей Пысін (верш «Забыта многае ў жыцці»). На гэткую сімволіку яўна наштурхоўвае і выразная сугучнасць, карнявая роднаснасць слоў «жыта» і «жыццё». Аднак жыта можа суадносіцца, асацыіравацца і з людской працавітасцю. У Пімена Панчанкі, як і ў Аляксея Пысіна, гэты другі аспект сапраўды адчуваецца, але толькі ў падтэксце твора. Галоўны ж сэнс панчанкаўскага верша заключаецца ў сцвярджэнні гаючай для чалавека сілы ўсяго жывога. Вось чаму «дыханне жыта» для паэта — «душы патрэба». Так сцвярджаецца ў першай страфе. Шматзначна ў гэтым сэнсе і заканчваецца верш:

Стаю ля жыта,
Малюся жыту,
Пішу пра жыта,
Ізноў пра жыта:
Умее жыта
Душу лячыць.
Пакінь, зязюля,
Гады лічыць!
Жаўранка песня
У небе дрыжыць...
О божа мілы,
Як добра жыць!

Мастак, вядома, знарок, як найлепшую музыку для душы, ажно пяць разоў у адной страфе паўтарае само слова «жыта». Жаўранкава песня ва ўспрыманні паэта таксама сімвал жыццёвай нармальнасці, жыццёвага хараства і прыгажосці. Таму ў вершы і суседнічаюць, паядноўваюцца строфы пра жыта і жаўранка.

Такім чынам, прырода, паэтызацыя яе красы—не проста значны матыў у сённяшняй творчасці Пімена Панчанкі. Гэта адзін з вызначальных параметраў яго эстэтычнага свету.

Надзвычай істотна таксама, што прыроду паэт бачыць зусім па-сучаснаму. Гутарка ідзе пра тое, што яшчэ параўнальна нядаўна, на памяці тых пакаленняў, якія жывуць і цяпер, людзі ганарыліся сваёй здольнасцю пакараць прыроду, гвалтоўна навязваць ёй сваю волю. А сёння прырода карае нас за наша безагляднае пакарыцельства.

Выразна ўсведамляецца сёння і тое, што прырода для нас жыццёва неабходная не толькі як крыніца матэрыяльных рэсурсаў і розных даброт, але і ў плане духоўным, бо чалавек не можа нармальна развівацца ў штучна створаным наваколь-ным асяроддзі.

Як і раней, асабліва пяшчотна піша паэт пра дарагое яму з дзяцінства хараство нашых лясоў. Вось лес у ягадную і грыбную пару:

Смольны пах.
Нагрэтыя сасоннікі.
Ледзь трывожны гул.
Даспелы бор.
А суніцы, як малыя сонейкі,
У вясёлых плямках мухамор.
Гэта казка—
пералескі раніцай,
Што ні крок—
прасторней і пякней.
Толькі лесу можна нізка
кланяцца,
І ніхто папрокам не ўпікне.

Гэта з верша «Годзе вам аб колькасці ды якасці».

Думка пра тое, што своеасаблівая мудрасць прыроды і яе хараство дапамагаюць «святлей, чалавечней нам жыць і любіць», сцвярджаецца ў вершах «Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае» і «Здзіўленне». Але канчаецца апошні верш на вельмі трывожнай заклікальнай ноце:

(Заканчэнне на стар. 8—9).

П. Панчанка, Ліяна і Стаян Даскалавы (Балгарыя), М. Калачынскі, П. Прыходзька. 1957 г.; П. Панчанка ў Вашынгтоне. 1958 г.; П. Панчанка і латышскі паэт Ян Судрабкалн. 1959г.; П. Панчанка (у цэнтры) і І. Калеснік (першы справа) знаёмяць узбекскіх сяброў з Мінскам. 1966 г.

ШМАТ ГАВОРЫЦЬ ТВАЁ ІМЯ...

НЕ ПАЛІЧЫЦЕ гэта юбілейнай банальнасцю — Пімен Панчанка ў маёй свядомасці ніяк не суадносіцца з тою шаноўнаю датаю, з узроставай вяхою, што пазначана ў жнівеньскім календары.

Нічога незвычайнага як быццам не адбылося. Я сам нядаўна пераступіў праз гэтую сур'ёзную мяжу, бачу і разумею, што Пімен Емяльянавіч ужо даўно не той юны Пімянок, з якім калісьці даўно мы ўпершыню сустрэліся на Бранскім фронце.

Але вось нядаўна, будучы ў Мінску, я зазірнуў у кнігарню. І пакуль гартаў паэтычныя навінкі, чуў, як пакупнікі пыталіся кнігу «І вера, і вернасць, і вечнасць». Дарэчы, гэта былі вельмі маладыя людзі. Значыць, аўтар ім духоўна блізкі, я нават сказаў бы — неабходны. Значыць, ён па-ранейшаму такі, што дзяўчаты і хлопцы бачаць у ім чалавека свайго пакалення, і ўжо ва ўсякім разе надзейнага дарадчыка і сябра.

Між тым не ў характары Пімена Панчанкі лішне маладзіцца, патураць тым, хто толькі ўступае ў дарослае жыццё. Звяртаючыся да іх, ён часам гаворыць не вельмі прыемныя словы. Прыгадаем ягоную «Размову з нашчадкамі» і нядаўні маналог «Ратуйце нашы душы!».

Моладзь, як вядома, не любіць, каб пад яе падладжваліся, але і не церпіць, калі нудна і доўга павучаюць. Яна патрабуе іншага — разумення.

Панчанка з тых, хто разумее моладзь.

Вось чаму яго новы паэтычны зборнік чытаюць і людзі сталага веку, і тыя, хто сёння-заўтра будзе атрымліваць пашпарт. Паэт, не зважаючы на сваю шаноўную юбілейную дату, напружана ўглядаецца ў тое, што адбываецца сёння. І, вядома, блізка прымае да сэрца боль і клопат сваіх равеснікаў, якія прайшлі праз перамогі і страты, спазналі сутнасць дабра і зла. Усё, што лягло на долю гэтага пакалення, лягло і на плечы паэта. І таму ён імкнецца ў кожным сваім радку быць адкрытым і чэсным. Для гэтага яму няма патрэбы перабудоўвацца. Лірык па сваёй сутнасці, надзелены сардэчнаю дабрынёю і тонкім пачуццём гумару, ён з маладых год спасціг галоўнае. Праўда вышэй за ўсё. Дабрыня—перадусім гэта справа. Любоў не павінна быць салодкагалосаю. Абыякавасць і лішняя асцярожнасць проціпаказаны мастаку. А высокія словы толькі паднімаюцца ў цане, калі суседнічаюць са штодзённым будзённым клопатам пра чалавека, а таксама сябруюць з выратавальнаю самаіроніяй.

Пачатак вайны, як вядома, Пімен Панчанка сустрэў знаходзячыся ў радах Чырвонай Арміі пад Беластокам. Вайна з першых жа хвілін паўстала перад ім ва ўсёй сваёй жахлівай сутнасці. Фронт як бы зблізіў паэта з трагічнай рэальнасцю, умацаваў яго душэўнае бясстрашша, паскорыў творчае сталенне. Усё гэта адбілася ў яго франтавых вершах, многія з якіх сталі хрэстаматыйнымі.

Вярнуўшыся ў мірнае жыццё, Панчанка шчасліва захаваў у сабе ўсё, што было спасцігнута на вогненных дарогах вайны.

Добра ўяўляю сабе тыя неадназначныя пачуцці, якія ахапілі майго сябра адразу пасля перамогі. Радасць сустрэчы з Беларуссю і боль за знявечаную родную зямлю, пафас адраджэння і душэўная гарката ад прыкрых перашкод...

Мне давялося перакладаць некаторыя з яго тагачасных вершаў. Пімен аддаў нейкую даніну святочнай рыторыцы, так характэрнай у той пасляваенны час. Але неўзабаве ён пачаў адыходзіць ад бяздумнага ўслаўлення і адзін з першых пачаў сцябаць палемічнымі зарадамі па ўсяму таму, што перашкаджала сапраўднаму абнаўленню спакутаванай зямлі. Па душэўнай глухаце і чыноўнічаму разгулу. Па сквапнасці і крывадушшу. Па халтуры і пустазвонству. Успамінаю, як горача, страсна прагучалі яго вершы «Анкета», «Выпадак у гасцях», «Пра гэта», «Чаканне».

Адным з першых Панчанка падняў голас у абарону прыроды. «Азона патрабуем, азона!..», «Прырода надзіва праўдзіва» — гэтыя бліскучыя вершы не сёння напісаны.

«Не люблю я слова «пакарыцель», Не люблю я слова «уладар». Вось зямля зялёная — бярыце Для жыцця і працы і для мар. Хто ўладарыць, той і ўдарыць раптам — Па надзеі, па душы жывой. Пакарэнне пахне трохі рабствам, Карай і рабункам, і крывёй».

Трывожная і глыбокая думка аб узаемасувязі заваёўніцкіх адносін да прыроды і маральнага спусташэння была выказана паэтам задоўга да сённяшніх вострых дыскусій.

А экалогія роднай культуры! Як тут не ўспомніць цудоўны верш «Родная мова», напісаны амаль чвэрць века назад! «Кажуць, мова мая аджывае Век свой ціхі: ёй знікнуць пара. Для мяне ж яна вечна жывая, Як раса, як сляза, як зара... Ці плачу я, ці пяю, Ці размаўляю з матуляю—Песню сваю, мову сваю Я да грудзей прытульваю».

З вышыні сённяшняга вопыту мы адчуваем: не дарэмна трывожыўся паэт. Прыслухаўца б яшчэ тады да гэтай песні, да гэтага плачу, да гэтых горкіх і прарочых слоў!

Абвостранае пачуццё часу, адкрытая грамадзянскасць не толькі ў творчасці, але ў жыццёвых паводзінах, не толькі ў слове, а і ў справах—менавіта гэтыя рысы характару вызначылі месца нашага юбіляра ў беларускай культуры. Як не ўспомніць зайздросныя якасці Панчанкі-рэдактара, калі ён узначальваў «Маладосць». У складаных выпадках, не баючыся адказнасці, публікацыю таго ці іншага твора ён браў на сябе. Мудра давяраў таленту. Менавіта таму ён адзін з першых глыбока ацаніў магутны талент маладога тады Васіля Быкава, дапамог у публікацыі яго аповесцей, якія зараз уваходзяць у залаты фонд савецкай літаратуры.

У адным з нядаўніх вершаў паэт прызнаецца:

Малюся праўдзе, малюся росам,
Малюся сонцу, роднай зямлі.

Малюся праўдзе!—гэта гучыць як дэвіз.

Бясстрашнае імкненне да праўды і глыбокая вера ў чалавека—вось што найперш характэрна нашаму юбіляру. І як гэта дабратворна ўплывае на ўсё, што робіць Пімен Емяльянавіч цяпер, сёння. І лепшым доказам таму вядомыя вершы, напісаныя зусім нядаўна,— «Кабінеты», «Паэма сораму і гневу», «Бацькі і дзеці», «Персанальныя шафёры». «Мы з тых беларусаў...».

Маладая энергія радка, высокая публіцыстыка.

А як тут не згадаць вершы «Чалавечнасць», «Надзея», «Бабулі», «Калі ты ўбачыш маму» —гэтыя сардэчныя прызнанні таму, што люба сэрцу. Бацькоўскаму кутку ў вярхоўях Бярэзіны, матчынай песні, шчыраму сяброўству. Адзін з такіх вершаў паэт прысвяціў цудоўнаму балкарскаму лірыку Кайсыну Куліеву. І было гэта ў тыя

Ёсць праўда зерня

Я люблю Пімена Емяльянавіча Панчанку. І як паэта, і як чалавечую асобу. Дзякуй богу, непадзельнае ў ім адно з другім.

Толькі з нуднай звычкі анічому не здзіўляцца можна ўспрымаць такога паэта і такую асобу ў нашым часе, як нешта звычайнае.

Няхай сабе ўсе паэты верай і праўдай служаць паэзіі. Але далёка не ўсе нават думаць не думаюць пра тое, каб і яна паслужыла ім.

Таму, мне здаецца, у «Паэме сораму і гневу» Пімен Емяльянавіч некалькі перабольшаў свой сорам («Ну хоць шукай стары трафейны вальтэр»). Мажліва, ён крыху разгубіўся з таго, што жыццё — у каторы ўжо раз! — пачынаецца нібыта нанава.

На мінулым нашым пісьменніцкім з'ездзе мы стаялі з ім на лесвічнай пляцоўцы і курылі. У зале пляскалі ў далоні, тупалі нагамі, свісталі, зганялі з трыбуны прамоўцаў. Пімен Емяльянавіч дакурыў цыгарку, кінуў акурак у сметнік і сказаў: «Трыццаць гадоў назад тупалі мацней».

Неаднойчы і не мне аднаму даводзілася чуць ад яго, што ён хацеў бы ўвайсці ў жыта і ў ім застацца жыць. Кожны раз пры гэтым вочы ягоныя ўспыхваюць маладымі васількамі.

Добра ўсё-такі жыць на белым свеце.
Век прайшоў, а дзень яшчэ ідзе.

Паўвека ягонай працы ў паэзіі — гэта паўвека ягонай вайны за чалавечую годнасць («А страціць годнасць — невыносна»). Мусібыць, ніхто ў нас так, як ён, не марыць пра тое, каб чалавек быў чысты. У мары гэтай спрадвечна спалучаюцца высокая вера і высокая наіўнасць, якія і становяцца ў Панчанкі паэзіяй.

І з пакалення ў пакаленне
Яно пакутліва ідзе —
Да працы добрай прылучэнне,
Ачалавечванне людзей.

А за плячыма ў яго яшчэ і Вялікая Айчынная вайна.

Валунамі ўмуравалася яна ў памяць («Я зноў на вайне. Я падбіты вайной»), праз увесь лёс несці, не скінуць яе цяжэнныя дні і ночы. Аднак і на той вайне для Панчанкі «нават смерць — не самае страшнае», а страшней «зняверыцца ў святынях», абесчалавечыцца, страціць годнасць, сумленне, веру... Гэта, па сутнасці, тое самае, што вынес з вайны і Васіль Быкаў. Для абодвух іх яно не што іншае, як выпакутаваная формула жыцця, перакананне, якім яны ніколі не паступаліся. Можа быць, таму яны ўдвух і чыстыя перад небам і людзьмі.

Святых нямашака, грахі зямныя знойдуцца, бадай што, ва ўсіх (ну, напрыклад: «Не вартых праслаўлення праслаўляў»), але не праз тое ў вершах Пімена Панчанкі з кожным годам нарастае пачуццё віны — да найцяжэйшага стану:

Я не збярог Купалу,
Мову не збярог.
Мне літасці няма і даравання.

Браць на сябе такое, не вінаватаму, можна толькі ў адчаі (менавіта на сябе, бо і лірычнае «я», і абагуленае «я» — хітрыкі літаратуразнаўства). І калі гэта адчай ці бяссільны гнеў (што, дарэчы, не ўласціва панчанкаўскай паэзіі), то скуль яны?..

Пытанне не зусім юбілейнае, аднак, калі ўжо яно зададзена, дык варта зрабіць невялічкае адступленне і паспрабаваць разабрацца.

Стала звыклым лічыць (тут і самі паэты пашчыравалі), што віна для паэта — нармальнае, нават неабходнае пачуццё. «Чаму так?» — спытаў я аднойчы, калі мне не схацелася быць вінаватым. Шукаючы адказу, перагартаў класіку і не знайшоў там паэта, які б пастаянна нёс у сабе адчуванне сусветнай віны за ўсё і за ўсіх. Калі, скажам, геніяльны Пушкін вінаваціцца, дык вініць ён сябе толькі ва ўласных учынках, а ў іншых выпадках — называе вінаватых. Вось так яно—нармальна, гэтак яно і да цяперашніх дзён павінна было б ісці, аднак фокус у тым, што ў нашы найноўшыя часы раптам не стала вінаватых. Нікога і ні ў чым. На кароткі тэрмін іх знаходзілі, скідалі на іх, што можна, — і зноў не было каго называць. Але ж віна заставалася, цяжар яе, ношу яе некаму трэба было несці...

На маю думку, першым вялікім паэтам віны стаў ні ў чым не вінаваты Твардоўскі. Цяпер гэта ўжо трывалая, традыцыйная лінія ў сучаснай паэзіі, асабліва ў такой эмацыянальна ўзрушанай, адкрытай, безабароннай, якой з'яўляецца паэзія Пімена Панчанкі. Ці якім з'яўляецца ён сам, што адно і тое ж.

Дзесяцігоддзямі цяжка такое вытрываць, душа можа знясіліцца — і паратунак ёй знаходзіцца ў «чыстай» лірыцы, спакойна-светлай і шчымліва-журботнай, як і любая размова з вечнасцю. «Вячэрні цягнік»— такая размова, і многія іншыя вершы, і вось гэтая страфа:

Цёплыя сады ў салодкім дыме.
Сосны так спагадліва шумяць
Над магілай
І над маладымі,
Што ў траве, абняўшыся ляжаць.

Калі цытуеш такія вершы, то міжволі думаеш, што дарэмна напісана ўсё тое, што пісалася прозай. У тым ліку і тое, што я зараз пішу. І цягне працытаваць хоць нейкі з любімых вершаў цалкам.

Пімен Панчанка не надта ўважае верлібр (пра што і выказаўся быў з уласцівай яму недвухсэнсоўнасцю: «Ды мармычуць многія верлібрамі на маёй на песеннай зямлі»), аднак жа апошнюю па часе кнігу «І вера, і вернасць, і вечнасць» завяршыў ён менавіта верлібрам, вершам, для якога адшукалася адзіна мажлівая форма, бліскуча скарыстаная ўжо хоць бы таму, што захоўвае натуральнасць інтанацыі і абсалютна не замінае зместу, выяўляючы яго ва ўсёй пранізлівасці і глыбіні.

На Паўночна - Заходнім фронце
У рэдакцыі армейскай газеты
«Героический штурм»
Мы жылі ў зямлянцы
З Міхаілам Святловым.
Вярнуўшыся з часцей,
Адрапартаваўшы і адпісаўшыся,
Мы распальвалі
Вясёлую пячурку
І бралі па добрай франтавой чарцы.
Душа адтайвала,
І Міхаіл Аркадзьевіч
Пачынаў жартоўную арыю:
«Што ў Пімене табе маім?»
Я лагодна ківаў галавой:
«Вот піменна»...
Даўно ўжо знік
Мой друг за небасхілам...
Я падыходжу да таго парога,
Які нікому не ўдалося перайсці.
І страшна запытаць
У роднага народа:
«Што ў Пімене табе маім?»

Не думаючы, бронь божа, анікога пакрыўдзіць, дазволю сабе спытацца: хто ў нас, апроч Панчанкі, мае права на гэтакі верш?.. На сённяшні дзень, апроч яго ды Максіма Танка, бадай што, ніхто. І тут

Я. Брыль і П. Панчанка. 1967 г.; А. Кулакоўскі, А. Вялюгін, П. Панчанка гутараць з рабочымі-ардэнаносцамі саўгаса «Сітцы» Докшыцкага раёна. 1972 г.; А. Куляшоў і П. Панчанка.1975 г.; М. Аўрамчык, І. Мележ, П. Панчанка на творчым вечары І. Мележа. 1976 г.

дні, калі Кайсын Кулісў безнадзейна хварэў... Па просьбе аўтара я даслаў свой пераклад гэтага верша ў бальніцу. Праз колькі дзён адтуль пазваніў мне Кулісў. Слабым і разам з тым нейкім прасветленым голасам ён сказаў мне: «Дзякуй, Яша! Пакланіся ад мяне Пімену, перадай яму маю ўдзячнасць. Нішто не страшна, калі ёсць на свеце такія людзі, як Пімен, калі адчуваеш сардэчнае цяпло блізкіх і дарагіх табе людзей. Дзякуй, дзякуй!»

Праз нейкі час Кайсына не стала.

Адно з нядаўніх прысвячэнняў-роздумаў вяртае нас у франтавыя дні. Колькі сумнай мудрасці і добрага гумару спрасавана ў вершы, які аўтар назваў так нязвычна і ў той жа час так дакладна—«Сумны верлібр». Вясёлыя каламбуры двух таленавітых людзей... Толькі ці для гэтага пішацца верш? Іскрыстая імправізацыя раптам змяняецца сур'ёзным пытаннем, у якім чуецца голас многа пабачыўшага мастака, пытаннем, якое народжана самім сумленнем:

Што ў Пімене табе маім?

...Дарагі сябар, мілы Пімен Емяльянавіч, родны Пімянок! Віншуючы і абдымаючы цябе, хачу сказаць: ты можаш бясстрашна, як і ўсё, што ты робіш, задаць гэтае пытанне шматлікім тваім чытачам і сябрам.

Тваё імя шмат што гаворыць аматарам паэзіі і ў Беларусі, і далёка за яе межамі.

Будзь, калі ласка, здаровы, шчаслівы, заўсёды такі, які ты ёсць.

Якаў ХЕЛЕМСКІ.

г. Масква.

справа не толькі ў тым, мір ці вайна за тваімі плячыма, і зусім не ў тым, з кім і ў якой ты працаваў газеце.

Для мяне асабіста Пімен Емяльянавіч Панчанка — самы нацыянальны, самы беларускі сучасны паэт. Перш за ўсё таму, што ён захоўвае народны спосаб мыслення, самую адметную рысу нацыі, што ўвогуле наша мастацтва — пры ўсіх закліках да самабытнасці — няўмольна страчвае. І не паэты ў гэтым вінаватыя. Прыйдзе час — і вінаватыя назавуцца.

Усю тую пошасць, якая ідзе ў наступ на культуру, на духоўнасць, на нашы ідэалы, Пімен Панчанка вызначае як мяшчанства. Не след спрачацца, наколькі ўдала і дакладна вызначае, бо няма для яго злейшага ворага, а ворага як не назаві—усё мала для нянавісці. У-у-у, як раздражняе яго мяшчанская тупая сытасць, задаволенасць, прыстасаванасць! Колькі ўжо год ён змагаецца з ёю, за што паэзію ягоную надзяляюць усялякімі ваеннымі тэрмінамі, называюць наступальнай, баявой, ваяўнічай — і блытаюць ваяўнічасць з амаль дзіцячай безабароннасцю перад любой крыўдай і несправядлівасцю. Якраз яго, як нікога іншага, трэба было б ад усялякай пошасці берагчы. Каб ён доўга-доўга жыў ды быў побач з намі, каб можна было раўняцца на яго, прымервацца да панчанкаўскага слова, у якім ёсць нешта большае, чым зерне праўды: ёсць праўда зерня. Розніца паміж першым і другім, як ён сам заўважыў, істотная.

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ.

«ВАШ ЗБОРНІК— НЕ ПРОСТА ВЕРШЫ...»

Каму шчасціць наведваць час ад часу Пімена Панчанку, той ведае: паэт запросіць у свой кабінет, прапануе сесці каля стала, сам па-гаспадарску сядзе за стол і пачне гутарку... з агляду свежай пошты. На гэты раз яна — перад'юбілейная. Пішуць равеснікі, таварышы па франтавых дарогах — мастак Г. Анцыфераў з Іркуцка і літаратар С. Сеітаў з Алма-Аты. Шлюць калектыўны ліст настаўнікі і вучні сярэдняй школы № 13 г. Бабруйска, у якім паэт у трыццатыя гады набываў прафесію педагога. З раённага гарадка Валдая (Ноўгарадская вобласць) прыйшлі ў адным канверце нумар мясцовай газеты, пісьмо і фотаздымкі, прысвечаныя былым ваенным карэспандэнтам, супрацоўнікам армейскіх газет Паўночна-Заходняга фронту (Пімен Емяльянавіч, як вядома, увесь 43-ці год знаходзіўся на гэтым фронце, працуючы карэспандэнтам газеты «Гераічны штурм» 34-ай арміі). Вонкавай асаблівасцю наступнага ліста з'яўляецца тое, што ён падпісаны і напісаны зусім дзіцячым почыркам. Гэта ад імя ўсіх вучняў вядомай ужо ў рэспубліцы Гудзевіцкай СШ паэта вітае і віншуе пяцікласніца Таня Ашмяна. Віншуе і ў кранальна шчырых словах паведамляе, што шле любімаму паэту, у гонар яго гадавіны, выткаеы школьнікамі гальштук. Просіць: «Шчыра паважаны і дарагі дзядзька Панчанка! Мне вельмі хочацца, каб у дзень Вашага сямідзесяцігоддзя Вы хоць на некалькі хвілін адзелі наш гальштук. Таму высылаем раней». Дадзім тут даведку: гэта ўжо трэці гальштук, прысланы з Гудзевіч народнаму паэту... І яшчэ адзін ліст — з Цюменскай вобласці, з далёкай Лабытнангі (ёсць такі гарадок — прыстань у ніжнім цячэнні Обі). Ён варты таго, каб з ім пазнаёміцца больш падрабязна, і мы прапануем яго ўвазе чытача з некаторымі нязначнымі скарачэннямі.

Добры дзень, паважаны Пімен Емяльянавіч!

Вялікае Вам дзякуй за кнігі і за турботы. Дзякуй ад мяне і ад усёй маёй сям'і. Кніжку «І вера, і вернасць, і вечнасць» я спачатку праглынуў адразу, потым пачалося ўжо сапраўднае чытанне, якое расцягнулася на два тыдні. Калі дазволіце, я падзялюся сваімі меркаваннямі наконт яе.

Верш «Ціхія»... Прачытаў яго, і мне здалося, што не Вы яго напісалі, а я, а Вы толькі падслухалі мае думкі. Бо, на вялікі жаль, абывацельскія погляды, дакладней хваля абывацельшчыны захлынула ў апошнія гады Поўнач. Раней мы тут такога не ведалі. Не, асобныя адзінкі былі і раней. Але зараз гэта — як лавіна. Цывілізацыя прыносіць не лепшае ў наш ямальскі край. Калі я прачытаў (у сваім, даруйце, перакладзе) Ваш верш старажылам нашага пасёлка, дык яны ўголас сказалі, што гэта пра наш будаўніча-мантажны поезд. Цікава, што адзін з маіх сяброў выказаў такую думку: «ціхім», відаць, дзякуючы такім людзям, як Вы, якія не маўчаць, вельмі ўжо дрэнна адчуваецца на «Вялікай зямлі», і таму яны, можа, і драпанулі да нас. Тым болей, што пачалася вялікая будоўля, а ў такіх выпадках прыплывае вельмі ж багата рознай «пены».

Сэрцам прыняў і сам я, і тыя, каму чытаў, верш «Калі мы губляем час». Праўда, мы ўсё звяраем з нашымі тут жыццём і працай, але, можа, гэта і лепш.

У нас тут многа беларусаў. Я маю нядрэнную беларускую бібліятэку, таму яны часцяком бываюць у мяне. Парадокс, але гэта так: чым далей мы ад матчынай хаты, тым больш даражэй, тым больш прыцягвае роднае слова, і я яго тут чую часцей, чым дома, калі бываю ў водпуску. Пра гэта ўсё пішу таму, што і сам, і ўсё наша «нефармальнае» беларускае зямляцтва асабліва блізка прынялі верш «Чым жа мы апраўдаемся?». Мы яго чыталі разам у суботні дзень, калі выбраліся на адпачынак у тундру (у нас зараз хораша, тэмпература за 30). Верш выклікаў цэлую дыскусію, сутыкнуліся розныя погляды, тэмпераменты, ды ўрэшце ўсе сышліся на адной думцы: вінныя самі... Пра «Паэму сораму і гневу» нават не рашаюся гаварыць, бо ўтаміў бы Вас, ды і самому прыйшлося б пісаць праз усю ноч. Гэта — і мая біяграфія, калі не прымаць да ўвагі «пісьменніцкі фон». Гэта — наша ўчарашняе жыццё: прыгожае і жахлівае, вялікае і жорсткае. Не хапае слоў. І ў дадатак яшчэ — нервы. Так, нервы, бо гэта не «забаўляльнае» чціва, бо калі чытаеш кнігу — жывеш у ёй, бачыш у ёй сябе і сваіх сяброў, свае добрыя (тады прыемна) і свае адмоўныя (тады бярэ злосць) бакі характару, бакі жыцця свайго... Дзякуй Вам! Дзякуй за «Донараў», за «Мы з тых беларусаў», за «Маленства, не заглядвай у хату...», за «Кошык», які чамусьці прыйшоўся вельмі па душы маёй старэйшай, Любаве (яна ў сёмым класе). Прыдумала нават просценькі матыў, барабаніць па піяніна і ўсё напявае: «Нясу з грыбамі кошык са свіслацкай лазы». Нашто ўжо жонка дрэнна валодае беларускай мовай (яна з Эстоніі), і то чытае зборнік. Праўда, з дапамогай дачок.

Я яшчэ малады. Таму, мяркую, магу гаварыць і ад імя маладых. Вы пішаце вартыя моладзі вершы. Вартыя. Тое, што моладзь любіць тэлевізар, касеты, камп'ютэры, дыска, брэйк — гэта яшчэ не ўсё. Паверце, мы і плачам, і злуемся, і чытаем вершы. Добрыя вершы, якія нас робяць «па-добраму злымі». Калі малады, апрануты «па фірме» чалавек чытае Ваш верш і ледзь не плача, дык «фірма» гэта толькі даніна часу. І калі ён Вашы «Кабінеты» чытае маладому майстру, які добра засвоіў формулу «Ты мне, а я табе», дык паверце, Пімен Емяльянавіч, ён верыць такім, як Вы, нягледзячы на свае модныя штроксы.

Бачыце, Ваш зборнік — не проста кніга вершаў, а бомба, якая ўзарвалася між нас і «параніла» многіх.

Мы тут параўноўваем Вашу кнігу з іншымі навінкамі. Большасць прызнала Вашу лепшай, але, праўда, неяк дзіўна спалучыла яе з кнігай У. Караткевіча «Быў. Ёсць. Буду». Выказана думка, што гэта — «адзінае непадобнае цэлае». Па сіле ўздзеяння абедзве кнігі прызнаны «самымі значнымі за апошнія дзесяць гадоў». Я асабіста быў за гэтую фармуліроўку зямляцкай сходкі. І ўсе мы выказалі меркаванне, што наперадзе ў Вас будзе нешта непрадбачанае, да гэтага не прынятае, але ў той жа час неспакойнае, бязлітасна яра-лірычнае.

Вось, здаецца, і ўсё, што хацеў напісаць. Дарэчы, Ваша «Прылучэнне» я толькі прабег і сяджу зараз без кніжкі: яна вандруе зараз па беларускаму «ланцужку» на трасе чыгункі, якую мы будуем... Прабачце, што ўварваўся ў Ваш час. Зычу Вам усяго найлепшага, асабліва здароўя. Тое ж прасілі перадаць і мае сябры.

М. САЗОНАЎ,
будаўнік.

г. Лабытнангі,
Цюменская вобласць.

ПАДЗЯЛЯЮЧЫ ЛЁС НАРОДНЫ

«ДЛЯ мяне самае важнае ў паэзіі — праўда жыцця, праўда пачуццяў маіх сучаснікаў, чалавечнасць. Мяне не захапляе сузіральная лірыка, якую іншы раз выдаюць за філасофскую. Я за актыўную грамадзянскую паэзію. І пра родную вёску і пра космас можна напісаць аднолькава дрэнна. Калі паэт не здольны адчуць пульс нашага жыцця, яму не дапамогуць ні наватарства, ні традыцыйнасць» — так вытлумачвае сваё разуменне паэзіі, яе месца ў літаратуры і жыцці Пімен Панчанка. Словы гэтыя — своеасаблівае крэда творцы, які заўсёды памятаў: «адказнасць перад людзьмі вялікая». Невыпадкова яны займаюць значнае месца ў артыкуле-споведзі П.Панчанкі «Пра сябе», якім адкрываецца фотаальбом «Пімен Панчанка», выпушчаны выдавецтвам «Беларусь».

Падобныя выданні, наколькі ведае чытач, у апошні час нярэдкія. Выходзілі альбомы «Іван Мележ», «Пятрусь Броўка», «Аркадзь Куляшоў», «Максім Танк», «Васіль Быкаў»... З'яўленне гэтага супала з 70-годдзем Майстра. Па сутнасці — падарунак і самому П. Панчанку і ўсім, хто любіць яго бунтарна-неспакойную паэзію. Святочнасць альбому надае тое, што ён з густам афармлены — каля 80 каляровых і чорна-белых здымкаў, выкананых у цэлым на высокім паліграфічным узроўні. Дзелавітасць — тая прынцыповая, дасведчаная гаворка пра месца і ролю творчасці юбіляра ў сучаснай паэзіі, якую вядзе М. Стральцоў.

Артыкул названы «Падзяляючы лёс народны». Тым самым адразу вызначана галоўнае, што спалучае ў адзінае цэлае і творчасць П. Панчанкі і яго жыццё. Пра такіх, як П. Панчанка, звычайна кажуць: народны па прызванню. На жаль, з-за частага выкарыстання выслоўе гэтае пачало страчваць сваё першаступеннае значэнне. Аднак у дачыненні да паэзіі П. Панчанкі, яго лёсу яно падыходзіць найлепшым чынам. За ўсім, што напісана і пішацца П. Панчанкам, як тут не пагадзіцца з М. Стральцовым, «а за ўсім гэтым — лёс народны, ад якога неадлучны быў на працягу ўсяго свайго жыцця паэт».

Паэтаў лёс прачытваецца і праз шматлікія здымкі, узятыя з асабістага архіва П. Панчанкі, а таксама выкананыя А. Дзітлавым, В. Жыліным, У. Калядой, У. Крукам і каляровыя — Л. Македонскім. Першыя адлікі фоталетапісу бяруць пачатак з гадоў маленства — будучы народны паэт сярод членаў першай піянерскай арганізацыі ў Бягомлі. А гэта ўжо—курсанты гадавых педагагічных курсаў, на якіх у 1934 годзе навучаўся і П. Панчанка. П. Панчанка з аднакурснікамі Мінскага настаўніцкага інстытута; на сустрэчы маладых пісьменнікаў з П. Паўленкам, А. Фадзеевым і В. Катаевым; у час сустрэчы з В. Чкалавым; на Усесаюзнай нарадзе маладых пісьменнікаў з К. Чукоўскім...

Гады вайны, калі служыў у франтавым друку, а потым у Іране, таксама адлюстраваны некалькімі здымкамі. Яны — сведчанне падзей, якія ніколі не забываюцца. Гэтаксама не забываюцца паэту і першыя пасляваенныя гады, час далейшага творчага мужання, шлях да паэтычнага майстэрства. З другога боку — яны сведчанне актыўнай грамадзянскай дзейнасці П. Панчанкі: паездкі па рэспубліцы і краіне, удзел у рабоце пісьменніцкіх з'ездаў і пленумаў, сустрэчы з чытачамі, калегамі.

Арганічна ўпісваюцца ў альбом вершы П. Панчанкі, а паколькі тэкст пададзены на беларускай і рускай мовах, друкуюцца яны і ў перакладах І. Шклярэўскага, І. Бурсава, Б. Слуцкага, Я. Хелемскага і іншых. Гаворку пра паэта, яго час і зямлю, дзе прайшлі яго лепшыя гады, дапаўняюць маляўнічыя краявіды Беларусі, у тым ліку Бягомльшчыны — «у мястэчку Бягомль, у дрымучых лясах вярхоўя Бярэзіны, прайшло маё маленства» прызнаецца П. Панчанка.

А. ВІШНЕЎСКІ.

М. Дубянецкі, А. Адамовіч, П. Панчанка, В. Быкаў, Н. Гілевіч. 1979 г.

ПАЭЗІЯ

Віктар ЯРАЦ

●

З якіх дарог, з якіх эпох
нам перададзены напевы
вятроў, то мяккіх, як мурог,
то сіверных, як дзень скалелы?
Яны з лістотай — шу-шу-шу —
варожаць, знахарак не горай,
то раптам возьмуцца ў душу
ляцець праз лес, што лічыць зоры,
ляцець, як весткі тых вякоў,
дзе галасілі і спявалі,
дзе на Купалле ад вянкоў
дзявочых хвалі заміралі,
дзе жалі жыта, а дзяцей
хавалі ў цень пад сноп ад сонца,
і каласы цалуткі дзень
шапталі казкі ім бясконца...
Ганцамі з дымнай даўніны,
ад узбярэжжаў, праз туманы,
плывуць, як быль праз курганы
лятуць, як сон неразгаданы,
непадуладныя зямлі,
між небам гучным і зямлёю,
дзе продкі словы бераглі,
за славу плацячы крывёю...

Млын на Ствізе

Тут быў млын драўляны вадзяны.
Засталіся ў рэчцы толькі палі.
Хлеб з мукі жытнёвай, аржаны,
партызанам вёскі выпякалі.

Млын малоў трывогі й цішыню,
млын малоў імгненні, пасівелы,
і спявала кола песню дню,
быў ён, быццам мельнік,—белы-белы.

Кроплі сонца з кроплямі вады
гаманілі радасна-суладна
пра ручай зярнятаў залатых,
што не з кручы — з рук на камень падаў.

Млын жыццю няхітры свой матыў
пачынаў на золку, рана-рана.
Нібы партызан, аднойчы быў
ворагам ён люта пакараны...

Не чуваць вясёлай гаманы
і не круціць рэчка болей кола.
Горыччу тут пахнуць туманы —
нібы выдых з губ загнаных коней...

●

Там, дзе дубы ўрасліся моцна ў глебу,
дзе крык начны гусей на берагах,
я адчуваў, як уздыхае неба
па ўсіх, хто пыл глытае на шляхах,
далёкіх ад бацькоўскага парога,
і ад чаўноў на сцішанай вадзе,
ад кнігаўкі трывожнай, што вядзе
сваіх дзяцей сцямнелым мяккім логам,
ад борцяў ацалелых на дубах,
куды пчала чамусьці не заглядвае,
ад родных слоў, што краскамі ў лугах
цвітуць і пахнуць горыччу і радасцю...

●

Мы ўсе на час ківаем, што так рэдка
бываем дома, дзе бабулі-мацяркі,
нібы ў той казцы, цягнуць з дзедам рэпку,
чакаючы унукаў гарадскіх.
Здаецца, вечнасць цэлую не быў
там, дзе рачныя, як калісьці, плёсы
маўчаць пра тайну пералётных крыл,
якую нехта называе лёсам...

●

Настроены струны на лад веснавы
у кожнай надрэчнай бярозы, сасны,
у промня, што лісце не злічыць на вербах...
Ці сэрца так б'ецца, ці хваля аб бераг?

●

Яго ўздымала радасць пад аблокі...
Касіў, каваў, араў, і карчаваў,
пазнаў людзей і зараз цяжкім крокам
ідзе зямлёй, якой пра ўсё сказаў.

●

Не ў лаўрах сутнасць, не ў пасадах,
а ў тым, што зроблена табой.
Ці не таму раўчук так рады,
калі зліваецца з ракой?

Толькі ўчора

Толькі ўчора над Чачорай
гусі праляцелі.
Толькі ўчора нечы човен
абміноўваў мелі.

Толькі ўчора, як алені,
спуджаныя некім,
у вачах тваіх дрыжэлі
воблакі і рэкі.

Толькі ўчора ліст зялёны
трапятаў на гольцы,
выплаўляла медзь на клёнах
стомленае сонца.

Толькі ўчора над Чачорай
крык гайдалі гусі.
Твой пагляд — не зыбкі човен...
Як з ім размінуся?

ПРОЗА

Алесь АСТАШОНАК

Смутак надзеі

МОЙ першы ўспамін.

Я гуляю ў двары з суседскімі хлопцамі ў лётчыкаў. З паперы зладзіўшы самалёцікі, мы ляцім адзін на аднаго, з усяе сілы гудзім — хто каго перагудзіць, у таго самалёт найлепшы.

Як мы добра гуляем! Тата з мамай ляць у танкістаў і паўзе, аж сапе, на каленях, праз двор, усё роўна што жук у гнаі, не разбіраючы гразі, — ён — танк, цяжэйшы за ўсіх,—і, вядома, збівае мяне сваім ілбом, як нікчэмную самаходку.

Хто ляціць, хто, перайшоўшы ў пяхоту, паўзе па-пластунску, кідае граны, хто шалёна размахвае шашкай у кавалерыйскай атацы і крычыць, што ўсіх пасячэ,—ды вось ужо нехта падстрэліў яго з аўтамата...

Я плачу—ніхто не чуе мяне, ніводзін з усіх не разумее, нават самы малы не хоча плыць караблём, лезе з абрэзкам шланга туды, дзе б магло быць мора,—бо будзе тушыць пажар...

О, першая крыўда неразумення, якая ж балючая ты!

Ніякія мне яны не браты!..

Мне семнаццаць гадоў.

Я добры, сумленны і справядлівы. І ці ж не ўсё разумею я ў свеце? Словам, я чалавек амаль ідэальны. Толькі мала хто гэта бачыць.

Застаецца адно ўзяць сябе ў рукі і кантраляваць кожны свой крок — тады адразу людзі мяне разгледзяць, прызнаюць маю дасканаласць, пацягнуцца да мяне. Мне будзе лёгка з імі, а ім — са мною.

Як не стануць імкнуцца яны да мяне, калі я хачу ім толькі дабра, ненавіджу хлусню і подласць?

не хочуць купіць мне брата, дык і не трэба: якія добрыя мальцы жывуць са мной па суседстве, усё адно што браты!

Але ўрэшце мне надакучыла гэта гульня. Відаць, таму, што гудзеў я слабей за астатніх, а пры сутыкненні ў паветраным баі першы звальваўся на зямлю.

«Давайце,—кажу,—гуляць лепш у маракоў! Вунь якая добрая лужына, усё роўна што мора!»—паказваю я ўглыб двара.

Ды ніхто і слухаць мяне не хоча.

Кожны імкнецца перагудзець астатніх, кожны прагне **сваёй** перамогі ў паветраным баі — я зноў і зноў падаю на зямлю. І колькі я ні крычу, захлёбваючыся ад захаплення расказам пра тое, як хораша плыць караблём па чыстай вадзе, усе гудзяць яшчэ больш і пераходзяць ужо на таран.

О, захапленне боем, ці не вышэйшае ты за ўсе пачуцці?.. О, захапленне светам сваіх захапленняў, ці ж не мацнейшае ты за ўсе спакусы і перашкоды, калі чалавек патанае ў табе?..

Я ўсё крычу—дарма.

А вунь ужо хтосьці прапануе гу-

ПРАЦА ДА СТОМЫ, З НЯПРАЎДАЮ БОЙ...

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 4—5).

Пакуль трывожна ды не позна—
Ратуйце, людзі, неба, космас.
Іх заўтра можа пагасіць
Апостал злосны чорных сіл.
З зямлі драпежнага разбою
Разносіцца пагрозны шум.
Ратуйце, людзі, ўсё жывое,
Ратуйце ўласную душу.

З яснага ўсведамлення непарыўнай сувязі чалавека з усім жывым на нашай планеце нарадзіўся і верш «Лясныя воблакі», у якім перад чытачом паўстаюць малюнкі сённяшняга дзікунскага абыходжання з лесам:

Ссечаны ельнік,
Бярэзнік знявечаны,
Нават рабінку—
Лязом напалам.
Можа, канчаецца
Род чалавечы?
Дзікае хамскае
Смецце і хлам.
Знішчаны ўшчэнт
І грыбы, і грыбніцы,
Ягаднікі павыдзіраны навек.
Гэта злачынства,
А не драбніца.
Што ты рабуеш сябе, чалавек?

Канцоўка верша зноў трывожна-папераджальная: «Не пакідайце лясы нашы голымі, не прыбліжайце ўласную смерць!»

А завяршыць размову пра месца прыроды ў эстэтычным свеце Пімена Панчанкі хочацца цытатай з рэдкага ў паэта верлібра «Калі мы губляем час»:

І толькі калі мы працуем
са смакам—
Мы не губляем часу.
І толькі калі мы з вадою
і сонцам—
Мы не губляем часу.
І толькі калі мы слухаем вецер,
Які шуміць у лістве зялёнай,—
Мы не губляем часу.
І толькі калі мы гуляем
з дзецьмі—
Мы не губляем часу.
І толькі калі мы пішам
да маці—
Мы не губляем часу.

Атрымліваецца выразны ланцужок: праца—прырода—дзеці—маці.

Пра матчын арэол у эстэтычным свеце паэта ўжо гаварылася. З няменшай пяшчотнасцю паэтызуюцца ў Пімена Панчанкі дзеці (яны найчасцей і згадваюцца разам з маці), славіцца іх чысціня і непасрэднасць, іх таленавітасць, душэўная чуйнасць, «мілая і светлая краса». Пра гэта сведчаць і цудоўны верш «Ксені», і шэраг таксама цудоўных радкоў у іншых творах, скажам, такіх, як у вершы «Век жыві і кахай», дзе сцвярджаецца: «Дзіцяня, кацяня, казляня, жарабя—залатыя шэдэўры прыроды».

Вядома, яно трохі нечакана, што ў адзін рад пастаўлены чалавечае дзіця і кацяня, казляня ды жарабя. Але толькі на першы погляд. Бо і па глыбіннай сутнасці, у аснове якой ляжыць думка аб прынцыповым адзінстве ўсяго жывога, і па характару панчанкаўскіх адносін да прыроды ўсё тут якраз на месцы.

Сярод тых каштоўнасцей, якія з'яўляюцца для паэта галоўнымі, апорнымі ў яго эстэтычным свеце, нельга абмінуць і павагу да роднай мовы, уласцівую кожнаму сапраўды цывілізаванаму чалавеку. Для нас жа сёння і гэта вострая праблема, бо сфера ўжывання беларускай мовы ў нас прыкметна звужаецца. І ў гэтым ёсць вялікая небяспека для будучыні нацыянальнай культуры.

Як і некаторыя іншыя беларускія пісьменнікі, Пімен Панчанка з гэтай прычыны трывогу б'е даўно. У кнізе «І вера, і вернасць, і вечнасць» паэт таксама шмат разоў вяртаецца да моўнай праблемы. У адным вершы ён з сумам канстатуе горкую для нас ісціну: «Мы родную мову патроху ўжо ўсе забываем» («Мы з тых беларусаў»); у другім выказвае сваю нязменную любасць да роднага, спрадвечна-матчынага слова: «Сэрца беларускай песні просіць, што чаборам пахне і лістой» («Дзве актрысы»); у трэцім нагадвае, што наша мова як родная сястра рускай і ўкраінскай мае старажытныя славянскія карані, што на ёй створана багацейшая фальклорная спадчына: «Наша мова, як «Слова аб Ігары», задуменна-славянская, і на ёй «найлепшыя песні спявалі жанкі, як выходзілі жаць» («Донары»).

Пра гістарычную славу беларускага слова вельмі моцна сказана і ў вершы «Чым жа мы апраўдаемся?»:

Мы тэўтонаў і шведаў
З Вялікім Пятром калацілі
(А ў Пятра беларуска
І жонкай—царыцай была).
Дык няўжо наша мова
Сёння страціла даўнюю сілу?
А яна ж валявала,
Спявала,
Дзяцей гадавала,
Жыла.

Так, у шмат якіх вершах паэта гучыць гордасць за лепшыя старонкі нашай нацыянальнай гісторыі, за сур'ёзныя дасягненні Савецкай Беларусі ў многіх галінах. Гэта, дарэчы, таксама скразны і вельмі істотны матыў кнігі, найбольш выразна выяўлены ў такіх моцных сваім падкрэсленым грамадзянскім пафасам вершах, як «Донары», «Дзесяць мільёнаў», «Мы з тых беларусаў», «Чым жа мы апраўдаемся?».

Але вельмі прыкметная ў паэта і горыч, падставы для якой даюць многія сёння адкрыта прызнаныя рэальнасці нашага жыцця.

Акрамя таго, што ўжо гаварылася пра панчанкаўскую вострую крытычнасць, прыгадаю яшчэ верш «Хто вінаваты?». Тут зроблена дапушчэнне, што той, хто адракаецца ад бацькоўскай хаты, ад маці, ад роднай мовы, ад добрых традыцый сумленнага працоўнага жыцця,—той у пагоні за «раскошнай лухтой» можа ўрэшце адрачыся і ад Савецкай Радзімы. Перабольшанне? Як сказаць. Вельмі ж зацягвае слабыя душы безаглядная прага раскошы любой цаной.

Безумоўна, ёсць шчымлівая горыч і ў панчанкаўскай паэтычнай гаворцы пра моўную праблему ў Беларусі. Але трэба падкрэсліць, што гаворка гэтая не толькі адлюстроўвае рэальны стан рэчаў, але і вызначаецца добрай выверанасцю.

О, як здзівяцца людзі, далонямі з сораму пляснуўшы: «Чаму ж мы не бачылі ўчора, які ён?»

А пакуль што дзіўлюся я. Колькі ні стараюся, не заўважае ніхто, які я...

Галоўнае, добры.

Дабрыня, веру я апантана, гэта тая каштоўнасць, якая перамагае ўсё: жорсткасць, сквапнасць, двудушнасць, неразуменне і недавер... Дабрыня асвятляе душу, дабрыня—гэта стрыжань спрадвечны, на якім трымаецца чалавецтва,—і яна з'яднае людзей, нягледзячы ні на што.

Ледзь не ўсе астатнія людзі таксама здаюцца мне амаль бездакорнымі.

І, вядома, думаю я, ім не заўсёды хапае сіл на кантраляванне кожнага кроку, але той, хто першы здолее стаць АСОБАЮ, сустрэне і разуменне. За першым яго заслужыць другі... соты... мільённы...—гэткім вось чынам людзі павінны паразумецца з усімі сваімі братамі і сёстрамі.

Як не паразумецца, калі ўсе такія харошыя?

А калі і знойдзецца нехта адзін, ці другі, ці нават тысячны, і ўчынкі ў іх будуць благія, бо не захочуць яны ісці разам з намі шляхамі любові і дабрыні, тады наперад выступлю я—і ўсе да астатняга зразумеюць, якую праўду нясу я людзям.

Бо, як ні веру я ў чалавецтва, мне яшчэ больш хочацца верыць, што першым, хто дойдзе да ідэалу, мушу стаць я. Усё ж так чыста ў думках маіх і пачуццях! З'яўленнем сваім я хачу пакарыць увесь свет, героі мае—Магелан і Скарына, а мой абавязак на гэтай зямлі—трымаць высока ў руках паходню першапраходцы.

Каб дасягнуць найхутчэй свайго, заводжу дзённік самакантролю. Але ніяк не магу прывесці ў суладзе ўсе свае ўчынкі, словы і законы, якія абраў для сябе. Церпячы недасканаласць сваю, што, як у люстэрку, адбіваецца ў дзённіку, вяду яго месяц, другі, ды нарэшце ґалю, як сведку ўласнай бязвольнасці.

І ўсё ж, пакуль я змагаўся з ёю, удалося нарэшце зрабіць адкрыццё: нельга быць жорстка патрабавальным. Я ж дамагаюся немагчымага: жыць без памылак.

Гэтаксама і людзі ў жыцці між сабою: чакаюць ад іншых бязгрэшнасці, нібыта здольныя быць бязгрэшнымі самі. Не прамінуць і парушынку заўважыць у воку чужым, а ў сваім бервяна не прыкмецяць.

Якую ж нясём мы адно аднаму дабрыню?

Лёгка быць добрым з добрым — паспрабуйце быць добрым са злым.

Дык ці ж не адкажуць людзі дабром на дабро, якія злыя яны б ні былі?

І ўжо разумею раптам, што калі б людзі адкінулі гэтую жорсткасць бязмерных сваіх патрабаванняў, то не звярнулі б занадта ўвагі на тыя памылкі, што каштуюць іх разумення.

За дробным людзі не бачаць сутнасці.

Пэўна, многіх калісьці пакрыўдзілі: каго недаверам, каго непавагай—ці ж мала адценняў у аднаго пачуцця, што завецца няўменнем быць добрым?.. І тыя, каго пакрыўдзілі, сталі крыўдзіць астатніх, пакуль не дайшлі да таго, што сталі здавацца ўсім злымі.

Дабрынёю трэба іх выклікаць на дабрыню.

І я пераходжу да ўсёдаравальнасці.

Цяжкія выпрабаванні чакаюць мяне на гэтым шляху.

Хтосьці смяецца з мяне, хтосьці падманвае, а трэці дык нават і здраджвае. Нехта лічыць, што я ўсяго толькі хітры, нехта, што проста дурны,—але кожны глядзіць на мяне па-свойму.

І мне ўжо здаецца—ці пачынаю бачыць?—што ў кожнага ёсць свая мэта, якую ён лічыць адзіна вартай, а тое, чаго імкнецца дасягнуць хтонебудзь іншы, яго не цікавіць або раздражняе нават...

Некаму смешна, што я хачу быць паэтам, бо сам ён збіраецца стаць інжынерам: якая бязглуздзіца—корпацца ў рыфмах, мужчынскае ўвагі заслугоўваюць толькі адны механізмы, што прыводзяць у рух усё існае і патрэбнае,—гэта табе не хімеры, пустыя абстракцыі, якія шаленцы прыдумалі дзеля пустое забавы кволых, засмечаных душ... Трэці смяецца з абодвух: ён думае толькі пра тое, як лёгка і сытна жыць... Камусьці балюча, што не паважаюць людзі родную мову — некаму прыкра на ёй размаўляць... А камусьці дазвання ўсё роўна, якой карыстацца мовай, няхай хоць санскрытам ці нават «чупангутынгу»,—абы разумелі. Дык ні на якой не разумеюць...

А мэты дыктуюць кожнаму свой ідэал паводзін.

Кагосьці бянтэжыць мая запаволенасць, і я для яго—цюхцяй, некага я абганяю—і вось ужо я спрытнюга.

Ці не кожны другі зайздросціць кожнаму трэцяму—праз тыя розныя дробязі, якія ён сам не мае, але, нягледзячы на свае непаўторныя погляды, прагне ўсё ж мець...

Ніяк не хочуць паверыць людзі ў беззаганнасць маіх памкненняў, кожны хоча лучыць мяне да сваіх ці ўжо зусім разысціся са мною, бо я для яго безнадзейны—настолькі стаў на яго непадобны...

Няўжо й непадобнасць—загана?..

Ці ж не таму выбіраюць многія адзіноту?..

І вось ужо людзі не здаюцца мне амаль бездакорнымі. Я сярдую на іх, стаў замкнёны ў сабе.

Калі б усе былі такія, як я!

Чаму так шчодра надзелены я разуменнем таго, які павінен быць ідэал, чаму так не хочуць астатнія ісці да яго разам са мною, адкінуўшы тое, што мне агідна, за сімвал веры прыняўшы тое, чым даражу?..

Ідуць гады. Мне дваццаць.

Жыву я цяпер прасцей. Весялюся, пакуль малады... Не стаўлю сабе задужа складаных пытанняў, а значыць, не стаўлю іх людзям. Дружбакоў у мяне—цэлы свет!

Ды толькі аднойчы, калі настае бяда, разумею, што ўсё-такі я адзінокі: шмат хто суцяшае мяне, але не бачу ніводнага, хто б гора са мной п е р а ж ы ў, каму б хацеў расказаць пра свой боль.

І ўжо зусім не магу разгледзець раптам нікога, з кім можна было б радасцю падзяліцца,—ці не кожны больш чакае **сваёй...**

Не маю, выходзіць, сяброў я—прымаў за іх спадарожнікаў.

Шукаю блізкага чалавека. Зусім не думаю ўжо аб разуменні ўсіх—немагчымым здаецца разуменне толькі адной душы ў гэтым бясконцым свеце...

Стукнула дваццаць пяць.

О, як гэта шмат—разуменне цэлай ДУШЫ! Як цяжка яго напаткаць, гэты сусвет у зорным людскім бязмежжы.

І ўжо не людзі, упэўнены, вінаватыя ў гэтым: я, чалавек калісьці амаль ідэальны, не разумею сябе—калі ж мог паспець набыць столькі заган?! На якіх-такіх складаных дарогах я іх назбіраў?..

Кожнага дня прыкмячаю са страхам, што не вартасці памнажаю, а павялічваю хібы. Заўважаю ўжо іх не толькі ў маіх паводзінах, але і ў характары—ды толькі ніякі самакантроль не ратуе ад недахопаў у ім.

Слабыя месцы перарастаюць мяне, ахілесавы пяты мяне засланяюць — і вось ужо я для многіх адна вялізная хіба, а перш за ўсё—для самога сябе.

І не на пустцы растуць завады мае: дагэтуль я доўга рыхтаваў для іх глебу—поле маёй слепаты, грады майго самалюбства...

Бярэцца за трыццаць.

Я навучыўся нарэшце цаніць пасапраўднаму вартасці іншых—і таму маё разуменне людзей расце.

Толькі чамусьці яно ўліваецца кропляю не ў акіян узаемапавагі—бачу адно, як цякуць ручаі, ручайкі, ручаёчкі—і толькі...

Няма акіяну...

Ручаі—нават і тыя, бывае, перапыняюцца... і высыхаюць...

Колькі ж часу патраціў, каб дайсці да разумення астатніх,—і як мала яго трэба было, каб цяжарам усіх папярэдніх памылак зменшыць мажлівасць з'яднання з людзьмі!

Хутка ўжо трыццаць тры.

У мяне падрастае сын.

З радасцю бачу, што ён таксама хоча ісці да ідэалу і паразумення з людзьмі.

Але...

«Тата,—пытаецца ён у мяне ў смутку,—чаму ў нашым класе не разумеюць адно аднаго?..»

Пачынаю нешта тлумачыць—і не магу даць варты адказ.

Так шмат людзей амаль бездакорных, якія нясуць з сабой дабрыню,—і так шмат на зямлі адзіноцтва, неразумення і болю...

Няўжо гэта лёс чалавецтва?..

Няўжо ручаі, няўжо нават рэкі не зліюцца ніколі ў моры?.. Няўжо паміж морамі паразумення заўсёды будуць ляжаць разнамоўныя кантыненты з пустэльнямі крыўды, знявагі, варожасці?..

Але раптам усё ж на мяне паглядае ў памяці вечна жывая бабуля мая...

Свецяцца вочы старэнькія сумам, спагадаю, мудрасцю.

Растае ёй адмераны келіх дзён, у сутонні сагрэтых дрыготкаю думкаю, што заўтра настане—і будзе наўкол адна ДАБРЫНЯ...

Патрыятычнае пачуццё паэта, яго гарачая любоў да Беларусі не перашкаджаюць яму заставацца пераконаным інтэрнацыяналістам, выказваць самую высокую пашану да братніх рэспублік нашага Саюза, да прадстаўнікоў іншых народаў свету. «Мы да роднай савецкай краіны прыпісаны»,—з гонарам зазначае паэт у вершы «Донары» і там жа дадае: «Мы народам усім сваякі». Ёсць у кнізе і адкрыта выказаная павага да магутнай рускай мовы, і поўны глыбокага сэнсу напамінак пра гістарычныя традыцыі непарушнай дружбы беларусаў з вялікім рускім народам, і пра тое, што беларусы плённа працуюць у самых розных рэгіёнах нашай сацыялістычнай дзяржавы («І Сібір, і Далёкі Усход, і зямля Запалярная беларусамі густа і дбайна заселена»).

Шчырыя і ўдзячныя словы знаходзяцца ў паэта пра XXVII з'езд партыі, «выратавальны з'езд, з'езд ачышчэння, абнаўлення, праўды» («Паэма сораму і гневу»). І гэта зноў жа вельмі натуральна, бо менавіта апошні партыйны з'езд, а таксама наступныя Пленумы ЦК КПСС далі наймацнейшыя імпульсы той рэвалюцыйнай перабудове, якая ідзе сёння ў краіне, адкрываючы новыя магчымасці і для саміх пісьменнікаў у іх высакароднай місіі служэння роднаму народу.

Яшчэ ў кнізе «Снежань» Пімен Панчанка падкрэсліў, што ён «выбраў сабе ў настаўнікі Леніна, праўду і родны народ». Гэтыя арыенціры былі і застаюцца для паэта пастаяннымі. Нездарма ж ён і ў гаворцы пра мову згадвае Леніна («Як дзяржаўная мова наша мова падорана Леніным»), і востракрытычную «Паэму сораму і гневу» завяршае напамінкам пра ленінскую непрымірымасць у стаўленні да рознай «дрэні» («Я веру Леніну з дзіцячае пары... Няхай агнём бязлітасным гарыць свет бюракратаў, махляроў і гадаў»), а сам зборнік «І вера, і вернасць, і вечнасць», пазначаны абвостранай грамадзянскасцю і падкрэсленым імкненнем да гранічнай праўдзівасці, адкрывае вершам «З імем Леніна», у якім паэтычным словам сцвярджаецца мудрасць правадыра Кастрычніцкай рэвалюцыі і стваральніка сацыялістычнай дзяржаўнасці, веліч ленінскіх ідэй, іх жыватворная сіла для сацыялістычнага грамадства на ўсіх гістарычных этапах яго развіцця.

На гэтым можна было б і закончыць. Але трэба закрануць яшчэ адзін момант. Не ў друку, а ў задзірыстых вусных размовах маладых літаратараў з малымі здабыткамі ды з вялікімі прэтэнзіямі выказваюцца папрокі, нібыта сённяшняя панчанкаўская паэзія многа прайграе з-за таго, што ў ёй няма асабліва яркай метафарычнасці. Думаю, што гэта вельмі павярхоўны погляд. Сіла і дзейснасць паэтычнага твора, як вядома, вымяраюцца не колькасцю тропаў, іх квяцістасцю або мудрагелістасцю, а найбольш напалам пачуцця, яго сапраўднасцю і арганічнасцю, глыбінёй і значнасцю паэтычнай думкі, маштабам аўтарскага бачання чалавека і гісторыі. А выяўляцца, знаходзіць сваю матэрыялізацыю гэтыя сутнасныя асаблівасці могуць самымі рознымі шляхамі. І найбольшае майстэрства патрабуецца якраз тады, калі аўтар стрыманы, эканомны, нават зусім скупы ў выкарыстанні тропаў, відавочных і асабліва кідкіх прыёмаў паэтычнай тэхнікі. У лірычным пушкінскім шэдэўры «Я вас любил» з тропаў усяго адна просценькая, так званая сцёртая метафара: «Любовь... **угасла** не совсем». А якая моц пачуцця, якая вышыня чалавечай асобы і яе высакародства выказаны тут вялікім паэтам!

Сённяшні Пімен Панчанка таксама вельмі ашчадна карыстаецца тропамі, хоць яшчэ ў ранняй сваёй творчасці ён засведчыў, што ўмее віртуозна валодаць самымі разнастайнымі прыёмамі ярка-маляўнічага, прыгожа расквечанага пісьма. Але цяпер паэт, як паказваюць яго творы, імкнецца не да яркасці стылю, не да вытанчанасці паэтычных прыёмаў, а найперш да сэнсавай яснасці, выразнасці і глыбіні, да натуральнасці часта па-размоўнаму раскаванай інтанацыі, якая, як зазначыў нядаўна Сцяпан Гаўрусёў, «дакладна перадае ўсплёскі пачуцця» самай разнастайнай эмацыянальнай афарбаванасці; да публіцыстычнай завостранасці слова, напоўненага высокім пафасам грамадзянскасці.

Праўда, зрэдку ён па-ранейшаму піша і знешне прыгожа: «Гэты год у навальніцах бліскае, ягадай рубінавай гарыць»; «суніцы, як малыя сонейкі»; «маленства, ... не стукай жоўтай лапкай у акно» і інш. Такое пісьмо мае сваю немалую прывабнасць. Але, як мне здаецца, добрага мастацкага эфекту паэт цяпер часцей дасягае ўсё ж іншымі сродкамі, напрыклад, з'едлівасцю зусім някідкай, амаль непрыкметнай у звычайным, абыходкавым словаўжыванні метафары, якая набывае сваю выразнасць, эмацыянальную шматзначнасць толькі ў адпаведным паэтычным кантэксце: **«Вылізвалі»** сабе узнагароды» (у сэнсе здабывалі рознымі несумленнымі шляхамі, у тым ліку і знарочыстай дагодлівасцю).

Выдатны ўзор сатырычнай выразнасці, заснаванай пераважна на метафарычным і таму па-свойму нечаканым ужыванні зноў жа вельмі звыклых слоў, дае наступная страфа:

Калі па бюракратах гакнулі,
Па ашуканцах і прыпісчыках,
Яны таксама ціха гаўкнулі
І сціпла аблізнулі пысачкі.

Гэтай страфою па-майстэрску закончаны вельмі з'едлівы верш «Ціхія», дзе бліскуча паказана дагодліва-карыслівая псіхалогія «расплыўчатай зграі» сённяшніх толькі знешне бяскрыўдных прыстасаванцаў, якія робяць выгляд, што прымаюць цяперашнюю перабудову, а на самай справе баяцца і тармозяць яе.

Такім чынам, і ў выкарыстанні метафарычнага слова Пімен Панчанка, калі гэта яму патрэбна, умее заставацца добрым майстрам. Але сама па сабе нязвыкла-кідкая метафара, не кажучы ўжо пра метафарычны стыль як выяўленчую дамінанту ў паэтычнай палітры, сёння яго спакушае рэдка. І ў гэтым няма ніякай бяды, ніякай заганы. Бо талент паэта дазваляе яму надаваць патрэбную выразнасць і слову звычайнаму, непераноснаму, узятаму ў яго прамым, непасрэдным значэнні. І яно, такое слова, у Пімена Панчанкі сапраўды хвалюе, выяўляе багатую эмацыянальна-пачуццёвую гаму, перадае і трывалую веру паэта ў нашы ідэйныя і маральна-этычныя каштоўнасці, у праўду нашай партыі, роднага народа, і трывогу за духоўны стан грамадства, за чалавека і яго будучыню, за лёс самога жыцця на зямлі.

МУЗЫКА

ЦЫМБАЛАЎ СРЭБРАСТРУННЫ ГОЛАС

Нядаўна ў Саюзе кампазітараў БССР адбыўся канцэрт саліста Беларускай дзяржаўнай філармоніі, народнага артыста рэспублікі А. Астрамецкага. Старэйшы беларускі цымбаліст прысвяціў гэта выступленне 70-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Выступленні Аркадзя Астрамецкага заўсёды ўражваюць і запамінаюцца. Сёння, калі прафесійнае выканальніцтва на цымбалах набывае ўсё большае распаўсюджванне, голас яго срэбраструннага інструмента не зблытаеш ні з чым. Індывідуальнасць музыканта самабытная, яго выкананне заўсёды пераканаўчае, шчырае, поўнае высакароднай засяроджанасці, стрыманасці. Галоўнае для яго — спасцігнуць і данесці да слухача ўсё, што перажыў, перадумаў аўтар твора.

Мала хто са слухачоў, прыхільнікаў майстэрства А. Астрамецкага, ведае пра пачатак яго прафесійнай кар'еры.

У сям'і музыкай не займаўся ніхто. Шасцігадовым хлопчыкам Аркадзь вельмі любіў слухаць суседа, які штовечар пасля работы іграў на балалайцы рускія, беларускія і ўкраінскія песні. Заўважыўшы такую цікавасць да музыкі, сусед пачаў раскрываць свае «сакрэты» ігры кемліваму хлапчуку. Бацькі купілі для Аркадзя мандаліну, і ён хутка навучыўся падбіраць па слыху народныя песні і танцы. Потым запісаўся ў музычны гурток мінскага Палаца піянераў, удзельнічаў у аркестры народных інструментаў школьнай мастацкай самадзейнасці.

Хутка саматугам навучыўся і на домры...

А тут адбылася падзея, якая паўплывала на выбар жыццёвага шляху. У 1937 годзе ў Мінску адкрылася Беларуская дзяржаўная філармонія, пры якой арганізоўваўся аркестр народных інструментаў. І 14-гадовага юнака А. Астрамецкага па конкурсе прынялі ў гэты калектыў. Так пачалася прафесійная дзейнасць маладога артыста. Праз два гады ўпартай мэтанакіраванай працы А. Астрамецкі разам з І. Жыновічам стаў лаўрэатам І Усесаюзнага агляду выканаўцаў на народных інструментах. У 1940 годзе ўдзельнічаў у Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, тады ж за выканальніцтва на цымбалах быў узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку».

Творчыя планы А. Астрамецкага парушыла вайна. Радавым салдатам прайшоў ён нямала франтавых дарог. Удзельнічаў у бітве за Сталінград. Узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. Пасля ранення прадаўжаў службу ў ансамблі Беларускай ваеннай акругі ў якасці саліста-цымбаліста. А калі быў адноўлены Беларускі народны аркестр, А. Астрамецкага запрасілі ў калектыў кіраўніком групы цымбалістаў. Неўзабаве ён становіцца канцэртмайстрам. А з 1957 года А. Аст-

ЧАС І ПАЛІТРА

Думаеш пра высокі крытэрый...

ПАЛЕМІЧНЫЯ НАТАТКІ

ДАЗВОЛЮ сабе прыгадаць недалёкае мінулае.

У кулуарах з'езда мастакоў Беларусі ў час перапынку было шумна і весела. Весела не ад таго, што мастакі сабраліся разам такім вялікім калектывам і з'явілася магчымасць доўгачаканай сустрэчы, а, галоўным чынам, таму, што агульны настрой палітычнай прыўзнятасці ўсёй краіны не мог не пранікнуць у сэрца кожнага, не мог не выклікаць да жыцця даўно затоеныя спадзяванні і думкі. У той жа час з'явілася магчымасць, можа, упершыню ў такой ступені, выказаць з трыбуны з'езда самыя смелыя ідэі і прапановы, магчымасць самай вострай і справядлівай крытыкі недахопаў і нерашэнняў даўно пастаўленых самім жыццём задач.

Збіраліся невялікімі групамі, ажыўлена гутарылі. То тут, то там успыхвалі дыскусіі, быццам у кулуарах праходзіў яшчэ адзін паралельны з'езд, не менш значны, чым асноўны.

— Вы гаворыце, што мы крыху паадсталі ад іншых рэспублік, што ў нас ужо надта стракаты стылявы накірунак у мастацтве. Дык у чым, уласна кажучы, «адсталасць» — у рознастылёвасці ці ў прафесійным узроўні?

— Не, толькі не ў прафесіяналізме, — упэўнена гаворыць госць з суседняй рэспублікі, — ён у вас даволі высокі. Гэта пераканаўча даказала нават студэнцкая выстаўка, якую я паспеў паглядзець. А вось нейкая стылявая аморфнасць...

— Варта пагадзіцца, — умяшаўся малады жывапісец. — Асноўны біч амаль усіх нашых экспазіцый — разнапланавасць, пры якой карціна як бы перашкаджае сваёй суседцы. Яны быццам узаемапрыніжаюць адна адну, а часам нібы спрачаюцца паміж сабой да хрыпаты. Паглядзіце любую выстаўку закаўказцаў ці прыбалтаў. Можна паспрачацца аб узроўні кожнага мастака паасобку, але экспазіцыя ўспрымаецца як адзінае цэлае, кожная карціна памагае адна адной, а гэта ўжо ў многім — зарука поспеху ў гледачоў... Праўда, ёсць і іншага роду, я сказаў бы, псеўдаадзінства, калі такое дасягаецца валявым шляхам.

— Зусім як у нас, — зноў загаварыў госць з суседняй рэспублікі. — У апошні час выстаўкомы, якія фарміруюць выстаўкі, узялі арыенцір на нейкую ўсярэдненую стылявую роўнасць. Выстаўкі атрымліваюцца аднастайныя, без усплёскаў, праўда, як вы гаворыце, творы не перашкаджаюць адзін аднаму, але яны і не памяншаюць абыякавасці гледачоў.

— А ці не здаецца вам, сябры, — умяшаўся я, — што ісціна недзе побач, але яе цяжка выявіць? Ужо лепш стылявы калейдаскоп, чым штучна рэгламентаваны ўсярэднены «стыль». У літоўцаў гэта атрымліваецца арганічна, бо ўсё прасякнута адзіным пафасам нацыянальнай культуры.

— Во, во! — падхапіў мастак сярэдніх гадоў, які дагэтуль маўчаў. — Уся справа ў нацыянальна-патрыятычнай накіраванасці. Толькі так можа быць дасягнута сапраўднае адзінства — і стылявое, і сэнсавае. Але нацыянальную форму трэба шукаць, шукаць старанна, у кожнай рабоце, у любой кампазіцыі.

— А дзе шукаць нацыянальнае — унутры сучаснага мастацтва ці ў гістарычнай спадчыне? — уключыўся ў размову вядомы крытык. — Бо яно ж атрымліваецца: калі вы — мастак-рэаліст, то, уважліва ўглядаючыся ў вобразы людзей, у аблічча прыроды, архітэктуры, непазбежна знойдзеце найлепшыя сродкі выразнасці, якія і прывядуць арганічна, а не надумана, да нацыянальнай формы. Як толькі вы будзеце штучна да сучаснай, ды і любой іншай тэмы, прышпіляць нейкую абстрагаваную стылістыку мінулых часоў, то непазбежна прыйдзеце да трывіяльнай стылізацыі.

— А ці не здаецца вам, — умяшаўся я зноў, — што побач з пошукам нацыянальнай формы трэба спрабаваць вызначыць глыбінныя працэсы стварэння вялікага с т ы л ю нашай эпохі... Многія мастацтвазнаўцы асцерагаюцца такіх пошукаў, спасылаючыся на універсальнасць метаду сацыялістычнага рэалізму. Але ж гэта толькі метад з яго неаспрэчнымі партыйнасцю і народнасцю мастацтва, а пад стылем мы разумеем штосьці вызначальнае ў самой структуры мастацтва, у яго кампазіцыйнай аснове, у метадзе раскрыцця тэмы, ідэі... Засцерагаюцца пошукаў стылю яшчэ і таму, што дакладна сфармуляваны, ён, быццам, будзе стрымліваць свабодную творчасць. А між тым, глабальны стыль эпохі аб'ектыўна існуе даўно. Ён выкрышталізоўваўся ў лепшых творах савецкіх мастакоў, у тым ліку ў найбольш значных творах беларускіх жывапісцаў, графікаў, скульптараў, манументалістаў.

— Прабачце, — горача загаварыў крытык, — па-першае, ужо спрабавалі расчляніць увесь пасляваенны перыяд на стылявыя этапы: «суровы стыль», «метафарычны перыяд...», нават дагаварыліся да нейкага «карнавальнага стылю», але ўсё гэта, як мне здаецца, не ахоплівае такога ёмістага паняцця, як «глабальны стыль сацыялістычнай эпохі». І потым — ці не будзе пэўная стылявая формула сапраўды скоўваць творчасць?

— Дастаткова азірнуцца на гісторыю мастацтваў, — запярэчыў я, — як адразу стане ясна: вялікія стылі Рэнесанс, Барока нікога не стрымлівалі, а наадварот, нарадзілі плеяду геніяў. Нам жа трэба разгледзець самыя плённыя рысы сучаснага мастацтва, завастрыць на іх увагу, адсейваючы ўсё выпадковае, наноснае, непасрэдна запазычанае з арсенала гатовых стылявых накірункаў, скапіраваных прыёмаў. Заўважыць самыя плённыя рысы творчасці мастака — вось тая задача, ад рашэння якой і залежаць дзейсныя пошукі ГЛАБАЛЬНАГА СТЫЛЮ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭПОХІ.

Празвінеў званок, запрашаючы дэлегатаў з'езда ўвайсці ў залу. Я накіраваўся на сваё месца, але ўзнятыя ў перапынку пытанні не давалі спакою...

АДКУЛЬ такі страх перад спробамі сфармуляваць стыль эпохі? Думаецца, таму, што некаторыя мастакі застаюцца ўбаку ад сённяшняга дня ў мастацтве.

Прычыну сучаснага заніжанага крытэрыя ацэнкі твораў мастацтва, на маю думку, трэба шукаць яшчэ ў сярэдняй школе з яе «традыцыйнай» праграмай выкладання мастацкіх прадметаў. Калі ў першыя гады навучання ў праграмы ўключаюць і спевы, і маляванне, то ў старшых класах школьнікі вывучаюць толькі літаратуру. Але калі падручнікі па спевах з другога класа так-сяк знаёмяць дзяцей з творчасцю кампазітараў, дык знаёмства з творчасцю мастакоў — цалкам на сумленні настаўніка малявання, які часцей за ўсё не абцяжарвае сябе клопатам энтузіяста-мастацтвазнаўцы. Праграма гэтага не прадугледжвае. А між тым, нішто не перашкаджае сёння менавіта ў старшых класах праграмна і грунтоўна выкладаць гісторыю выяўленчага мастацтва і музыкі: ёсць жа фільмы па мастацтве, дыяпазітывы, можна з дапамогай дыскаў або тонфільмаў сістэмна пазнаёміць вучняў з творчасцю любога кампазітара XVIII—XX стагоддзяў. Але гэта чамусьці не робіцца...

Зразумела, спасцігаць мастацтва трэба кожнаму не толькі для таго, каб умець адрозніць рамесніцкую падробку ад сапраўднага твора. Яно патрэбна для духоўнасці, для фарміравання гарманічнай, адукаванай асобы ў грамадстве.

Калі я бываю ў нашым мастацкім музеі, то перш за ўсё імкнуся да твораў Жукоўскага. Глядзіш і дзівішся, як можна тымі ж фарбамі, пэндзлямі ствараць такі непаўторны свет хараства! Вось дзе былі б натуральнымі тысячныя чэргі акрыленых пачуццём прыгожага людзей!

Але прапагандуецца, на жаль, іншае.

Неяк глядзеў па тэлебачанні на дзіва смелую перадачу, дзе рамеснік-партрэтыст ганьбіў не абы-каго, а... цэлы перыяд французскага імпрэсіянізму: «Імпрэсіяністы ў сваіх партрэтах згубілі галоўнае, а вось Я...», — гаварыў ён па Цэнтральным тэлебачанні. — «Я — прадаўжальнік школы майго слаўнага настаўніка Лакціёнава»...

Няма сумнення, Лакціёнаў — вялікі майстар. Ён адлюстраваў у карціне «Пісьмо з фронту» такое непаўторнае адчуванне Перамогі, што ніякія батальныя карціны не змаглі б гэта зрабіць больш праўдзіва. Я не кажу ўжо пра унікальныя здольнасці Лакціёнава-жывапісца. Такім чынам, вельмі многімі якасцямі трэба валодаць, каб узяць на сябе смеласць «прадоўжыць і развіць» гэтае непаўторнае майстэрства эпохі...

Ад праблемы крытэрыю ацэнкі нельга проста адмахнуцца. Яе трэба вывучаць, усебакова аналізаваць, як своеасаблівую сацыяльна-грамадскую з'яву. Трэба нам павучыцца і ў тых, хто так па-майстэрску распрацоўвае выставачны ажыятаж вакол спрэчных мастацкіх каштоўнасцей. Вось што варта вывучаць як перадавы вопыт, які дапамог бы скіраваць грамадскую ўвагу на больш вартае відовішча.

А як у нас часам атрымліваецца: аб адкрыцці выстаўкі народнага мастака СССР М. Савіцкага мала хто ведаў, нават не ўсе члены Саюза мастакоў. Білеты з запрашэннем на вернісаж былі дастаўлены ў саюз у дзень адкрыцця, але так і засталіся ляжаць на стале, нікуды не пасланыя. Вось гэта — «рэклама» па-нашанску...

Часта бывае, што, працуючы для заказчыка, мастакі акцэнтуюць намаганні хутчэй на рамесным, чым на вобразным баку твора. І ўсё гэта па той жа самай прычыне: густ заказчыка. Вядома, нашы заказчыкі (дырэктар саўгаса, фабрыкі ці парторг калгаса) амаль заўсёды — людзі з вышэйшай адукацыяй, але, за рэдкім выключэннем, не абцяжараныя вывучэннем гісторыі мастацтва і хоць бы самымі асноўнымі палажэннямі марксісцка-ленінскай эстэтыкі ні ў школе, ні ў інстытуце. Яны маюць даволі цьмянае ўяўленне аб высокай місіі выяўленчага мастацтва. Разам з тым непасрэдныя рэакцыі на тую ці іншую карціну, пейзаж, нацюрморт з боку заказчыкаў памагаюць аўтару-мастаку шукаць кампраміснае рашэнне, якое, часам, больш складана ўвасобіць, чым стварыць твор да чарговай выстаўкі. Узнікае адно з самых складаных пытанняў творчасці: ці можа высокі ўзровень твора, які мае рысы найбольш поўнага ўвасаблення Вялікага Стылю Эпохі, быць у той жа час зразумелым для звычайнага сярэдняга гледача? Вядома, чым вышэй эстэтычны ўзровень гледачоў, слухачоў, тым больш вольна і адважна ажыццяўляецца творчы працэс, тым, у канчатковым выніку, вышэй узровень мастацтва, тым выразней вызначальныя рысы і асновы Вялікага Стылю, тым больш адчувальна ён пранікае ва ўсе сферы жыцця. Вялікія стылі мінулага былі натхняючым камертонам самога сэнсу жыцця.

Якая ж сфера выяўленчага мастацтва становіцца вядучай у цяперашні час? Перш, чым зрабіць такі вывад, трэба ўважліва ўнікнуць у характэрныя асаблівасці жанраў нашага беларускага мастацтва. На маю думку, менавіта графіка, з яе пераканаўчымі серыяламі, з бліскучым узлётам кніжнай ілюстрацыі, якая так доказна прадэманстравала сваю эпахальную сталасць і сапраўдную навацыю, паступова становіцца першаасновай стылю эпохі, пластычным увасабленнем жанраў і напрамкаў. Чаму менавіта графічныя выстаўкі ўспрымаюцца, як адзінае цэласна-стылявое, чаму ўжо ў 70-х гадах наша кніга, яе мастацкае афармленне ва ўсесаюзным спаборніцтве заняла першае месца? Усім сва-

рамецкі выступае як саліст Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Сталее артыст — і тым мацней адчувае глыбокі сэнс простых ісцін музычнага мастацтва. Якую б праграму ні выносіў А. Астрамецкі на суд слухачоў, яна абавязкова высокамастацкая, прадуманая да дэталей. Рознастылёвая, шматжанравая. Але сярод твораў розных эпох і народаў абавязковае месца належыць музыцы беларускіх кампазітараў. Так было і на нядаўнім канцэрце ў Саюзе кампазітараў. Гучалі творы А. Альбіноні, Д. Верачыні, А. Даргамыжскага, С. Рахманінава. Усё было сыграна ў добрай акадэмічнай манеры, высакародна, з багатым выкарыстаннем тэмбравай палітры. Другое аддзяленне было прысвечана беларускай музыцы. (У канцэрце ўдзельнічала таксама піяністка А. Соніна, якая раскрылася і як чулы, высокапрафесійны партнёр-канцэртмайстар).

Паэтычна і адухоўлена было выканана Адажыо з балета «Маленькі прынц» Я. Глебава і «Элегія памяці Д. Шастаковіча» Д. Смольскага. Самабытна, свежа прагучалі «Трыпціх» В. Іванова і «Фантастычны марш» С. Картэса. Канцэрт прынёс адчуванне сапраўднай эстэтычнай асалоды.

Цымбаліст А. Астрамецкі шмат вандруе па Саюзе, канцэртаваў у 23 краінах свету. Паўстагоддзя з цымбаламі... Ды нягледзячы на прызнанне, на вопыт, музыкант крытычна ставіцца да кожнага свайго выступлення. Мабыць, гэтая творчая незадаволенасць і пастаянны пошук — зарука яго поспеху.

Міхась СОЛАПАЎ.

ім мастацкім ладам графіка ўшчыльную падышла да ідэалу глабальнага стылю эпохі, і калі гэта будзе зразумета нашымі тэарэтыкамі-мастацтвазнаўцамі, яны змогуць найбольш прадуктыўна сфармуляваць асновы сапраўды сучаснага сацыялістычнага мастацтва.

— Чаму ж не жывапіс?—могуць мне справядліва запярэчыць. Пытанне зразумелае. У нас цэлы шэраг выдатных майстроў-жывапісцаў, але яны нібы кожны сам па сабе, са сваім, характэрным толькі яму аднаму, светам думак і пачуццяў. Стракатасць індывідуальнасцей, як ужо было сказана ў пачатку гэтых нататак, стварае такі калейдаскоп стыляў і накірункаў, што крытыку, які ўзяўся па дамоўленасці пачаць першым абмеркаванне чарговай выстаўкі і канчаткова разгубіўся ад «багацця» ўражанняў, нічога іншага не застаецца, як пералічыць прозвішчы ўдзельнікаў, на ўсялякі выпадак пахваліўшы найбольш актыўных ці знакамітых. А ці ж сярод жывапісцаў няма сапраўды сучасных, вартых увагі мастакоў? Вядома ж, ёсць, але ў цэлым стылявая стракатасць настолькі цісне на пошукі адзінства, што толькі групавыя выстаўкі, збітыя не па таварыскіх, а па стылявых асаблівасцях, гучаць на поўную сілу, а яшчэ больш магутна працуюць на гледача некаторыя персанальныя выстаўкі.

Пошукі стылявога адзінства — задача складаная, цяжкая, але надзвычай актуальная. Відавочна, гэтыя намаганні не аднаго месяца ці нават года. Пройдзе шмат часу, перш чым мы ўсвядомім усю каштоўнасць і плённасць такога адкрыцця.

Чаму той, хто закончыў тэатральна - мастацкі інстытут, часцяком ігнаруючы набытыя за гады вучобы веды, скажам так: дабротныя веды, адкідае іх убок і пачынае, як бы зноў перавучваючыся, шукаць нешта новае, невядомае і даволі рызыкоўнае? А ці не таму, што вучоба была адарванай ад задач жыцця? Пагадзіцеся, часам у нас нават такія спецыфічныя прадметы, як, скажам, палітэканомія, філасофія, ператвараюцца ў навукі адцягнутыя, замест таго, каб быць жывымі інструментамі спасціжэння рэальнай рэчаіснасці. А чаму будучым мастакам не раскрыць вочы на характар сучаснай вытворчасці, на спецыфіку канкрэтнай перабудовы дадзенага прадпрыемства, каб студэнт ці група студэнтаў, ідучы на практыку на завод, у калгас, ведала б вытворчую «кухню», і ў сілу гэтай пільнасці змагла б стварыць творы (пакуль што вучэбнага плана), якія адлюстроўваюць атмасферу сённяшняга дня.

Альбо марксісцка - ленінская філасофія. Наглядна паказаць, як з дапамогай законаў і катэгорый дыялектыкі можна спасцігнуць гістарычныя працэсы развіцця мастацтва, змены стыляў, ідэалаў.

Усе гэтыя прадметы павінны быць цесна звязаны ў адзіную сістэму падрыхтоўкі сучаснага савецкага мастака.

Ідэі пошукаў стылю эпохі павінны стаць асновай праграмы мастацкай ВНУ, каб былы студэнт не пачынаў усё «зноў», а прадаўжаў бы развіваць і ўдасканальваць набытыя за гады вучобы веды, ідэалы, памкненні. «Поспехі ва ўсіх нашых пераўтварэннях у многім залежаць ад таго, наколькі актыўна будзе ўдзельнічаць у іх моладзь, — гаварыў у сваім дакладзе на пленуме ЦК КПБ Я. Я. Сакалоў. — Выклікае заклапочанасць, што сярод часткі маладых людзей распаўсюдзіліся безыдэйнасць, невыразна праяўляюцца класавыя пазіцыі, узмацняюцца спажывецкія настроі, маюць месца п'янства, хуліганства і нават наркаманія».

Міжволі ўзнікае пытанне: а ці не таму ўсё гэта і многае іншае адбываецца з нашай моладдзю, бо ўпушчаны адзін з вырашальных момантаў выхавання ў сярэдняй школе, у ВНУ — этыка і эстэтыка ведаў і паводзін? Паўтараю, калі б чатыры апошнія класы былі б насычаны праграмнымі ведамі па гісторыі музыкі і выяўленчым мастацтве, уключаючы, канечне, і архітэктуру, то прывітая любоў да сур'ёзнага мастацтва выключыла б схільнасць да шэрасці.

Відаць, самым небяспечным у арсенале ацэнак і пошукаў крытэрыю каштоўнасці з'яўляецца адмаўленне значнасці прафесіяналізму ў выяўленчым мастацтве, сціранне, як вынік гэтага сцверджання, граняў паміж прафесіянальным і самадзейным мастацтвам. Няма сумнення, што развіццё любых відаў і форм народнай творчасці, заахвочванне дзіцячага захаплення аж да арганізацыі адпаведных выставак, мае вялікае сацыяльна - эстэтычнае значэнне, але гэта зусім не азначае, што прафесіяналізм губляе сваю асноватворную ролю. Зусім іншая справа, што лічыць прафесіяналізмам? Відаць, мера каштоўнасці апошняга залежыць ад таго, наколькі адпаведнае спецыяльнае вучылішча, інстытут павярнуліся да праблем сучаснасці.

Няма і не можа быць майстэрства па-за часам і па-за грамадскім светапоглядам. Нават такое паняцце як талент мае гістарычную прывязку. Таму і пошукі высокага крытэрыю каштоўнасці ў выяўленчым мастацтве павінны насіць канкрэтна гістарычны характар, а не ўяўляць сабой штосьці абстрактна сфармуляванае на стагоддзі.

М. ГУЦІЕЎ,
заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

СПРЭЧКІ ПАЛЕМІКА

Леанід ГАЛУБОВІЧ

КРУГІ НА ВАДЗЕ

У адказ на артыкул Л. Дранько-Майсюка «Як» і «навошта»?», змешчаны ў нумары «ЛіМа» ад 17 ліпеня, рэдакцыя атрымала некалькі пісьменніцкіх і чытацкіх водгукаў. Сёння сваімі меркаваннямі дзеліцца паэт Леанід Галубовіч.

ПРАБЛЕМА, так скажам, узнятая ў артыкуле паэта Леаніда Дранько - Майсюка «Як» і «навошта»?», не новая, яна пераклікаецца з усімі іншымі, даўно набалелымі, пытаннямі нашай беларускай літаратуры. Пра іх усе мы добра ведаем: выступаем на сходах, пішам у артыкулах, а — тады-сяды — і ў сваіх мастацкіх творах. Я сфармуляваў бы сітуацыю так: ад літаратурных ідэалізацый — да высокамастацкага ідэалу, альбо: ад рамесніцтва — да творчасці...

Л. Дранько - Майсюку як паэту, здавалася б, куды больш зручней і ямчэй было б весці гаворку пра стан сённяшняй беларускай паэзіі, але ён чамусьці прыслухаўся да мудрай народнай пагаворкі і, «не выносячы смецце з хаты», прайшоўся выбарачна па прозе. І нават калі б ён не быў ратаем за «зграбную вопратку ювелірнай формы», гэтая яго схільнасць была б заўважана кожным хоць трохі літаратурна адукаваным чалавекам; настолькі «эстэтычна», я сказаў бы, звышэстэтычна абышоўся ён з трыма нашымі шырокавядомымі пісьменнікамі. Не ведаю, як Дранько - Майсюк успрымае мяне як чытача, але я, спатыкнуўшыся на некаторых радках у яго артыкуле, сёння ўжо не ведаю, як адносіцца да яго: як да шчырага, надзеленага пэўнымі здольнасцямі паэта, ці як да літаратара, які «сабе наўме»...

Што вынікае з яго крытычнай логікі ў тых месцах, дзе яна канкрэтызуецца? Напрыклад, вось такое: «...Вячаслава Адамчыка, аўтара таленавітых... ...раманаў», якія «...цэлымі раздзеламі (?!) можна скарачаць і быць пэўнымі, што аніякай шкоды не будзе нанесена сюжэту, псіхалогіі герояў, агульнай канцэпцыі...» Значыць, раманы В. Адамчыка і так, як яны напісаны, і скараціўшы іх цэлымі раздзеламі, — ТАЛЕНАВІТЫЯ. Мне цяжкавата даходзіць, а — вам?

Далей Дранько - Майсюк піша так: «...раман Івана Пташнікава «Алімпіяда»... — ...адметны твор нашай прозы нібы знарок нечытэльны». Калі твор, як піша Дранько - Майсюк, нечытэльны, то як ён можа стаць АДМЕТНЫМ, а значыць, вылучацца сярод іншых празаічных твораў беларускай літаратуры, да таго ж, у адрозненне ад «Алімпіяды», прачытаных?! Наконт вобраза пападдзі Бараноўскай у аповесці «Кар'ер» я ў асноўным з думкай Дранько-Майсюка пагаджаюся: знікненне пападдзі і мяне прымусіла задумацца. Але ж на тое ён і літаратурна - мастацкі твор, каб выклікаць чытацкі роздум. Я, перш за ўсё, маю на ўвазе сюжэт твора, а не мастацкія вартасці, што, здаецца, меў на ўвазе і аўтар артыкула.

Л. Дранько - Майсюк лічыць, што — чаго-чаго — а зместу ў творах беларускіх пісьменнікаў значна больш, чым трэба для вырашэння задумы мастацкага твора. А мне дык, наадварот, думаецца, што ЗМЕСТУ беларускай літаратуры якраз і бракуе. Зразумела, не таго зместу «з пахам гною на халявах літгерояў» (што зробіш, калі самі героі менавіта такія на сённяшні дзень), а таго, які акрэслівае сутнаснае чалавечае «я» літаратурнага героя. Карацей кажучы, у дадзеным выпадку я — за жывапісны панарамны МАЛЮНАК, а Дранько - Майсюк — за СКУЛЬПТУРНЫ ВОБРАЗ, дзе з шэрай вялікай прыроднай гранітнай глыбы адсякаецца ўсё лішняе дзеля ідэалізацыі формы вобраза. У рэшце рэшт, я не супраціўнік ні таго, ні другога, але з адным істотным удакладненнем: малюе — МАСТАК і высякае — таксама МАСТАК. ТВОРЦА і тут і там.

Канечне, форма твора, яго эстэтыка — фактар для сучаснага беларускага літаратурнага працэсу немалаважны. У гэтым напрамку ў нас мала пошукаў і яшчэ менш знаходак. Праўда, ёсць у нашых некаторых паэтаў ды і ў апавядальнікаў свае адкрыцці. Аднак у большасці сваёй (за выключэннем Міхася Стральцова і Алеся Разанава) яны набылі тую запамінальную адметнасць толькі ў самой форме, але не ў змесце. Збудаванні тыя па форме вельмі прывабныя, але нейкія нежылыя, няўтульныя. У канкрэтным выпадку можна спаслацца, напрыклад, на вершы Адама Глобуса, Галіны Булыкі і самога Леаніда Дранько - Майсюка. Большасць іх вершаў лёгка і свежа чытаецца, але гэтак жа лёгка і забываецца, калі перагортваеш прачытаную старонку.

Мала пакуль што ў нашай паэзіі самароднасці, нерукатворнасці. У рускай паэзіі гэтымі рысамі валодалі заўчасна адышоўшыя М. Рубцоў і А. Прасолаў. Ёсць, магчыма, і маладыя паэты, якіх мы не ведаем па розных прычынах. З далёкіх часоў М. Багдановіча і Я. Купалы мала такіх паэтаў і ў нашай нацыянальнай паэзіі. У лепшых сваіх вершах дацягваюцца хіба што да гэтага ўзроўню Р. Барадулін (у вершах канца 60-ых, пачатку 70-ых гадоў), Р. Баравікова, А. Мінкін, некаторыя іншыя.

У паэзіі, з таго часу, як яна пра сябе заявіла, сказана амаль усё і аб усім, а таму, каб, не паўтараючыся, сказаць у ёй сёння сваё адметнае слова, трэба быць, як пісаў А. Горкі пра С. Ясеніна, «органам паэзіі». Быць сараўдным прыродным ТАЛЕНТАМ. Бо і сам талент — гэта нішто іншае, як праяўленне нейкай больш выяўленай ад нараджэння натуральнасці чалавека.

У нас вялікая па колькасці членаў творчая пісьменніцкая арганізацыя. І калі верыць таму, што пра кожнага пісьменніка напісана ў часопіснай і газетнай перыёдыцы, то ўсе мы, члены СП,—вядома, своеасаблівыя таленты. Чаму ж тады — напрошваецца будзёнае пытанне — так мала ў нас пасапраўднаму таленавітых твораў?

Друкуецца мноства аднадзённага, а то і зусім мала мастацкага. Правільна, што за гэтыя «шэдэўры» перападае рэдактарам выданняў, але ж дзе наш «унутраны рэдактар»? А сама-крытыка выродзілася паўсюдна. Сёння ў краіне ідзе грандыёзная перабудова, таму не крытыкаваць нельга. Немагчыма без крытыкі. Амаль што забаронена не крытыкаваць... Ах, значыць, так?! І — пайшлі-паехалі крытыкаваць. Не сябе, канечне, другіх... У асаблівасці, калі яны ніжэй за цябе, за тваю пасаду, ці яшчэ лепш, калі яны ўжо і да цябе не раз бітыя.

Чытаеш шматлікія перавыданні (яны ў асноўным і ствараюць залежы ў кнігарнях) і хочацца сказаць: вось, паважаны Л. Дранько - Майсюк, форма філігранная, а зместу — нуль. Намінальна ён, канечне, ёсць, гэты неабходны набор слоў, але — што і казаць — словам прасторна, а думкам цесна...

Толькі што атрымаў свежы нумар часопіса «Полымя», ліпеньскі. Адразу ж — за дзве гадзіны — «праглынуў» «Хлеб надзённы» Янкі Брыля. Тут наадварот: словам цесна, а думкам прасторна... Узяўся чытаць паэзію. Як высветлілася, яе ў часопісе — усяго два вершы з падборкі К. Камейшы: «Небяспечны паварот» і «Усёцярпімы». Праўда, паэму А. Зарыцкага адклаў надалей, паколькі гэта сур'ёзнае чытанне. Я мог бы працытаваць надрукаваныя ў гэтым жа нумары часопіса зарыфмаваныя злабадзённыя лозунгі А. Ставера і М. Стрыгалёва, але хопіць з іх і той пашаны, што надрукаваў паважаны часопіс.

Так, згодзен я з Л. Дранько-Майсюком, што мала, зусім мала нас чытаюць. Вядомае выключэнне — В. Быкаў. Праўда, і яго чытаюць часцей на рускай мове. І, дадам, ахвотней. Таму ёсць усе прычыны падазраваць, што і ў дасканалай форме чытаць нас хутка не будзе каму. Не буду паўтарацца, прычыны занядбання роднай мовы ўсім добра вядомыя. І думаю, нават калі — дай-то бог! — нехта з нас напіша нешта сапраўды геніяльнае, то масавы беларус прачытае гэтае «нешта», счакаўшы, у перакладзе з роднай мовы на рускую. Такі на сёння рэальны стан рэчаў. Але не забудзем і тое, што некаторыя з нас у свой час нямала паспрыялі таму, што нарэшце сёння маем... І не трэба ківаць Івану на Пятра, а Пятру на Міколу. Сёння ва ўсіх у нас — пісьменнікаў і ўсёй творчай інтэлігенцыі — адна адказнасць. І заключаецца яна ў праяўленні ўсімі намі высокай грамадзянскай і чалавечай годнасці. Інакш нельга. Далей — бездань, духоўнае небыццё.

А ўвогуле нельга не пагадзіцца з асноўнай выкладкай артыкула Л. Дранько - Майсюка: ЛІТАРАТУРУ ТРЭБА ТВАРЫЦЬ перш за ўсё па законах эстэтыкі і мастацтва. Але вось наконт мастацтва... Успамінаюцца выказванні двух класікаў. Пушкін пра аднаго паэта: «У ім не бачу я ні кроплі творчасці, а многа мастацтва...» Грыбаедаў — сябру: «Мастацтва ў тым толькі і заключаецца, што падрабляецца пад дараванне...» І ўсё ж...

Пытанняў, прычым не вырашаных, у нашай беларускай літаратуры яшчэ вельмі многа. Мы ўмеем ставіць пытанні. Шкада, што ставім мы іх не заўсёды своечасова, ды і адказу на іх чакаем не ад сябе саміх, а ад іншых. Цікава, хто, акрамя пісьменнікаў, можа вырашыць пісьменніцкія справы? Тым больш — сёння. Хопіць, што іх вырашалі за нас учора.

Суцішым крок і задумаемся. Ёсць над чым. А заадно прыпомнім словы Карла Маркса: «Адносна мастацтва вядома, што вызначальныя перыяды яго росквіту зусім не знаходзяцца ў адпаведнасці з агульным развіццём грамадства». Гэта, канечне, вельмі засмучае, бо таленавітас мастацтва проста абавязана заўсёды быць вышэй агульнага грамадскага развіцця. І весці грамадства за сабой.

Пакуль жа нашы літаратурныя спрэчкі і дыскусіі нагадваюць мне кругі на вадзе: у рачную размераную плынь кінулі камень, на вадзе — круг, другі, трэці... усё шырэй, слабей, незаўважней... І, нарэшце, рачная плынь паглынае іх. Рэкі цякуць у адным, адвечна зададзеным, напрамку. А мы іх забруджваем, спрошчваем, паварочваем... Так і ў мастацтве, і ў літаратуры.

в. Вароніна.

Адкрыты ўрок

Пра дакументальныя фільмы рэжысёра Ю. Хашчавацкага

...МАГУТНЫ аўтаагрэгат метадычна падроўнівае кроны садовых дрэў — стрыжэ, так сказаць, пад адзін грэбень. Карціна звыклая і цалкам зразумелая: плоскія кроны для высокамеханізаванага садоўніцтва больш прыдатныя. Лес сякуць — трэскі ляцяць! А вось аднаму чалавеку карціна гэтая была і ёсць не даспадобы. Дрэўцу лепш, каб крона ў яго была натуральнай формы, тады і яблычкаў больш будзе. Праўда, адсякаць старое галлё, канечне, трэба. І ўручную ў садзе на дзесяткі гектараў многа не напрацуеш... Значыць, трэба зрабіць спецыяльны — эканамічны і зручны — механічны сякатар. Што гэты чалавек і зрабіў...

Эпізод з фільма «Упарты чалавек». Факт з біяграфіі Мікалая Фёдаравіча Прэдкі — сельскага механізатара і вынаходніка. З яго, нібы з зярнятка, вырастае ідэя стужкі. Тут — генетычны код «Упартага чалавека».

Рэжысёр Беларускага тэлебачання Юрый Хашчавацкі заявіў аб сабе ў кінадакументалістыцы стужкай «Гэта ціхае жыццё ў Глыбокім», якая два гады назад атрымала вялікі прыз на Усесаюзным фестывалі тэлевізійных фільмаў.

Творчы дыяпазон рэжысёра (а ён доўгі час працаваў над перадачамі Галоўнай рэдакцыі прапаганды БТ) вельмі шырокі. Пра гэта сведчыць, у прыватнасці, кароткаметражны мастацкі фільм «Прызыўнікі» (вытворчасць «Белтэлефільма») паводле сцэнарыя Б. Казанава. Гэта таксама своеасаблівы дэбют Ю. Хашчавацкага, ацаніць які неўзабаве змогуць тэлегледачы і крытыкі. Аднак найбольш ярка яго почырк, на наш погляд, выявіўся ў дакументальным фільме «Упарты чалавек» і асабліва ў апошняй рабоце — «Тут быў Крылоў». Пра гэтыя дзве стужкі і пойдзе размова.

М. Прэдка, напэўна, не чытаў верш Еўтушэнкі «Карлікавыя бярозы». А калі б прачытаў — хутчэй за ўсё паціснуў бы плячамі. Клімат кліматам, але...

Абрыкосы, як вядома, на Беларусі не растуць. А Мікалай Фёдаравіч вырасціў — каля сваёй хаты. Зразумела, прыемна пачаставаць экзатычнымі для нашых мясцін пладамі сталічных гасцей. Ды не дзеля таго ўпарта гадаваў, пеставаў гаспадар паўднёвае дрэва, не дзеля варэння на зіму, хоць яно і смачным атрымалася. Важна было — самому сабе нешта даказаць.

Толькі не спяшайцеся запісваць героя фільма ў дзівакі. Тут — зусім іншае. Раней ці позней у гледача ўзнікае нечаканае пачуццё віны перад Мікалаем Фёдаравічам. Магчыма, яно перадаецца нам з інтанацыяй расказчыка — аўтара сцэнарыя А. Дзітлава. Вядомы фотамайстар і журналіст, Дзітлаў расказвае, як некалі даўно збіраўся зрабіць нарыс пра Прэдку. Але не атрымалася — не зусім «той» аказаўся чалавек, не адпавядаў тагачасным газетным стэрэатыпам.

Ды і ў нашы дні Прэдка, як ні сумна, для многіх здаваўся «не тым»: не тым займаўся, чым трэба, не даваў спакою са сваімі вынаходніцтвамі. Просты механізатар — а туды ж. Гэта раздражняла. Пабудаваў некалі Прэдка з адходаў, з металічнага лому трактар. Імя даў — «Мілок». І тады, і цяпер садоўнікі-аматары і гаспадары прысядзібных участкаў з рукамі б адарвалі той малагабарытны трактарок. Зацікавілася машынай і мясцовае начальства. Гэтая цікаўнасць, аднак, была «адмысловая»: а ці няма тут нейкіх парушэнняў, ці нельга падагнаць пад які-небудзь забарончы параграф? Знайшлі, не доўга шукалі. Трактар адабралі і — у металалом. Мікалай Фёдаравіч плакаў. Не толькі «дзецішча» свайго было шкада. Сын яго дапамагаў той трактар збіраць. Няўжо адаб'юць хлопцу ахвоту да вынаходніцтва на ўсё жыццё? Не змаглі. Вось ён, шчаслівы, кіруе новым трактарам пад назвай... «Мілок-2». Цяпер ужо ў госці да Прэдкі едуць з міністэрстваў — цікавяцца на прадмет укаранення. Дык што ж — хэпі энд?..

Шчымлівае пачуццё няяснай віны не адпускае. Чаму чалавека, адзіная мэта якога — прынесці карысць людзям, аблегчыць іх працу, усё жыццё хапалі за рукі? Ды ці аднаго яго?! І калі мы спынім, нарэшце, тых — з механічным грэбенем у руках, хто вынішчае ўсё таленавітае, незвычайнае, непадуладнае схемам і інструкцыям? Дзе вытокі гэтага нашага злачынна - абыякавага стаўлення да чалавека, перастрахоўкі, сацыяльнай інертнасці і апатыі? Адказваць на гэтыя пытанні трэба, бо заўтра, можа здарыцца, не застанецца зусім «упартых людзей» накшталт Прэдкі...

Мы прызвычаіліся гаварыць, што жыць і працаваць у XXI стагоддзі — цяперашнім школьнікам. Але ж няма і не будзе мяжы паміж сённяшнім днём і заўтрашнім. Заўтра — яно і ў нас, і ў нашых дзецях. Чаму мы іх навучым, чаму яны навучацца ў нас? На гэтыя пытанні спрабуе Ю. Хашчавацкі даць адказ у фільме «Тут быў Крылоў» (другая назва — «Некаторыя развагі пра школьнае жыццё»).

Стылістыка яго, здавалася б, зусім не падобная на стылістыку «Упартага чалавека». Там інтанацыя — лірычная, амаль спавядальная. Тут — пануе іронія. Іранічная інтанацыя, якую, дарэчы, мы адчулі яшчэ ў фільме «Гэта ціхае жыццё ў Глыбокім», і робіць, думаецца, творчы почырк рэжысёра такім адметным, не падобным на іншых. Важна заўважыць, аднак, што іронія, а іншым разам і самаіронія, — не халодная, адчужаная пазіцыя «мэтра». Яна ідзе ад умення назіраць і прымячаць смешнае ў самім жыцці, востра адчуваць розніцу паміж уяўным і існым. «Тут быў Крылоў» — фільм адкрыта смешны. І ў гэтым бачыцца яго прынцыповы поспех. І ў гэтым жа, магчыма, прычына яго непрыняцця многімі работнікамі народнай асветы. Не ўсім, аказваецца, даспадобы «смеючыся, развітвацца са сваім мінулым». А размова, між тым, знешне лёгкая і адвольная, ідзе аб рэчах вельмі важных.

Кадры, у якіх механічны прас адгладжвае школьную форму, а потым яна, акуратна распраўленая па «плечыках», плыве, падвешаная, на канверы, — прымушаюць успомніць стрыжку яблынь з папярэдняга фільма Хашчавацкага. Тэма нівеліроўкі, механічнага падыходу да жыцця яднае абедзве карціны рэжысёра.

Дзеці пачатковых класаў ходзяць парамі, строем, у той самай адпрасаванай форме. Як канвеер, працуе раздатачная ў школьнай сталовай: спрытна гатуюцца паўфабрыкаты, і — порцыі, порцыі, порцыі... Гэтыя кадры (адзначым выдатную аператарскую работу Л. Броўтмана) наводзяць на думку пра «кухню» зусім іншага плана— тую, дзе «выпякаюць» чалавечыя душы. Відаць, нешта не атрымліваецца на гэтай кухні, нешта сапсавалася ў адладжаным канвееры, бо... адкуль жа тады ўзяўся хоць бы той самы Крылоў? Ды і яго сябры-старшакласнікі — героі фільма?

Слова «героі» прымушае спыніцца і задумацца. Што ёсць герой у дакументальным кіно? Калі ён такі, як мы, адзін з нас, — дык які ж ён герой? Як тут быць з тыпізацыяй? Яшчэ не так даўно пытанне вырашалася гранічна проста: герой канструяваўся паводле жаданай схемы (усё лішняе галлё — далоў!). Прычым, аднолькава лёгка і ў мастацкім і ў дакументальным кінематографе.

У выніку такой «кінадакументалістыкі» на экранах наша школа заўсёды была ўзорна-паказальнай. Настаўнікі сеялі «разумнае, добрае, вечнае», над партамі ўздымаўся лес рук, павязваліся піянерскія гальштукі, уносіліся сцягі, гучалі фанфары і г. д. Праўда, усяго хапала і ў «дарослым» жыцці. Ці ж не таму нават цяпер, калі аб'яўлена рашучая вайна паказусе, працэнта- і рапартаманіі, калі мы ўсе прад'яўляем самі сабе самы сур'ёзны рахунак, — мы ўсё яшчэ не хочам зразумець, што найбольш востра адчувалі і адчуваюць «негатыўныя з'явы» нашы дзеці. Хіба не таму «бомбай» выбухнуў на экранах фільм Подніекса «Ці лёгка быць маладым?», што ў ім нашы дзеці самі загаварылі пра тое, што ім баліць, самі, без нашай падказкі назвалі рэчы сваімі імёнамі. Прасцей за ўсё сказаць: маладыя нас ненавідзяць. Як быццам мы самі толькі і даём прыклады ўсеагульнай любві і спагады — у адносінах да сваіх дзяцей, у прыватнасці. А ў падтэксце таксама не вельмі адмысловая думка: якое, маўляў, маральнае права яны маюць не любіць нас — сваіх старэйшых таварышаў і настаўнікаў! Мы ж, як вядома, толькі дабра ім жадаем...

Настаўніца ў фільме «Тут быў Крылоў» кідае менавіта гэтую сакраментальную фразу: «За што яны нас так ненавідзяць?». І вымаўляюцца гэтыя словы з такой нянавісцю, што робіцца не па сабе.

Не па сабе робіцца і тады, калі мы бачым, з якім імпэтам старшакласнікі цаляюць у школьным ціры ў мішэні. (А на ўроку біялогіі ці грамадазнаўства на тварах вучняў — поўная адсутнасць цікавасці). А калі яшчэ з дапамогай мантажу на месцы мішэняў аказваюцца настаўнікі... Вось толькі тут мы з палёгкай адчуваем, што гэта — насмешка з нас, з нашай гатоўнасці паддавацца стэрэатыпам. Ніяк не даецца нам, з нашымі стэрэатыпамі, і гэты дзіўны Крылоў. Між іншым, ён лёгка падлоўлівае нас. Далёка не адразу здагадваешся, што «гучныя фразы» і прымітыўныя лозунгі, якія кідае Крылоў з сур'ёзным выглядам, не што іншае, як... пародыя на перадавыя газетныя артыкулы і наогул усялякага роду агіткі - клішэ. Разам з Крыловым нягучна пасмейваецца з нас і рэжысёр.

Вачыма старшакласнікаў глядзім мы на выкладчыка грамадазнаўства, які выдае ўсё тыя ж плоскія сентэнцыі пра неабходнасць барацьбы з фармалізмам, за высокую дысцыпліну і г. д. Крылоў аказваецца нібы крывым люстэркам сістэмы навучання, пабудаванай на адрыве ад рэальнасці і пустаслоўі. Ён — тыповы нефармальны лідэр, але далёка не бунтар. Прыгледзьцеся — Крылоў выдатна ўпісваецца ў сістэму, якую высмейвае. Мы здагадваемся, што яго дэмагогія — маска. Ну, а што пад ёй? Здаецца, Крылоў і сам не ведае, што ён будзе рабіць без гэтай маскі. Які ён на самай справе, што будзе, калі скончыцца школа і пачнецца не гульня — жыццё? Гэтага, падобна, не ведае ні сам ён, ні аўтары фільма.

«Завтрашний день, завтрашний день, каким ты будешь?» — старанна і пранікнёна пяюць настаўнікі, члены самадзейнага хору. Ідзе падрыхтоўка да выпускнога балю. Аказваецца, уся гэтая мітусня на экране — бясконцае перасоўванне крэслаў, транспарантаў, маршыроўкі пад музыку — гэта падрыхтоўка да свята. Як старанна рыхтуюцца да яго старшакласнікі! Надзімаюць шарыкі, развешваюць іх. На шарыках надпісы: «шчасце», «каханне», «поспех», «дружба». Потым, з завязанымі вачамі, школьнікі будуць спрабаваць пад агульны смех зразаць іх нажніцамі. Шарыкі будуць лопацца — «шчасце», «поспех», «каханне», «дружба»...

У актавай зале сядзіць хлопчык. Усе даўно разышліся, а ён сядзіць. Адзін. Гэта аднакласнік Крылова па прозвішчы Васілеўскі. У яго хворыя ногі, і ён амаль увесь час вымушаны быў вучыцца дома. «Спачатку да мяне прыходзілі, — расказвае хлопец, — потым перасталі. Ды я, па праўдзе кажучы, і не ведаю, ці хацеў бы я цяпер гэтага».

Навучыць міласэрнасці, напэўна, немагчыма. Таксама, як і пачуццю таварыскасці, чалавечай годнасці. І, напэўна, не віна настаўнікаў, а іх бяда, што няма ў іх часу на ўсіх, а тым больш — на кожнага паасобку. Крылоў для школы — усяго толькі адзін з многіх. Ну, а Васілеўскі? Яго наогул нібы і не існуе. Ён за бортам сістэмы. Сістэмы паказухі, справаздачнасці, загадаў і інструкцый.

На працягу ўсяго фільма гучаць дырэктарскія загады па школе (іх чытае аўтар сцэнарыя І. Яфрэмава). Фантастычная мова гэтых загадаў адпавядае іх інфернальнаму сэнсу. Загады гэтыя і рэальнае жыццё школы ніяк не стыкуюцца. Яны існуюць неяк самі па сабе. Магчыма, узнікае думка, бяда і ўсёй школьнай рэформы, прычына яе «прабуксоўкі» ў тым, што яна дагэтуль усяго толькі дакумент, далёкі ад жыцця канкрэтнага дырэктара, настаўніка, вучня?..

Фільм расказвае пра некалькі дзён з жыцця адной мінскай школы. Не важна, які ў яе нумар. Праблемы герояў фільма — гэта праблемы нашых дзяцей, а значыць — нашы праблемы. Пра гэта і хацеў, трэба думаць, нагадаць нам рэжысёр фільма «Тут быў Крылоў».

Ці можна пасля двух-трох фільмаў меркаваць, што Ю. Хашчавацкі знайшоў у дакументальным кіно сваю тэму? Не будзем спяшацца. Але гэтыя стужкі выклікаюць павагу — акрэсленай і паслядоўнай грамадзянскай пазіцыяй, упэўненай рукой рэжысёра, што і дае добрыя спадзяванні на будучыню.

Віталь ТАРАС.

ЛЯ КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

ПАЗНАВАЎЧА І ПАПУЛЯРНА

Масаваму чытачу адрасаваны дзве новыя работы маладога беларускага журналіста і кінакрытыка Леаніда Паўлючыка.

Адна з іх — «Час — у люстэрку экрана» (выйшла ў мінскім выдавецтве «Университетское») — расказвае пра ролю «дзесятай музы» ў духоўным жыцці і маральным выхаванні нашага маладога сучасніка. Тут змешчаны артыкулы, агляды, прысвечаныя традыцыям і пошукам беларускіх кінематаграфістаў у экранізацыі літаратурных твораў. Згадваюцца, прынамсі, такія стужкі, як «Палеская хроніка», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Альшанскі», «Бацькі і дзеці», «Зацішша». Грунтоўная гаворка вядзецца пра фільмы ваеннай тэматыкі (адкрытай палемічнасцю вылучаюцца старонкі, на якіх аўтар звяртаецца да апанентаў фільма «Ідзі і глядзі»). Разглядае Л. Паўлючык і спробы ўвасаблення на экране сённяшняй рэчаіснасці.

Нарыс пра кінаактрысу Святлану Сухавей выдадзены Усесаюзным бюро прапаганды кінамастацтва. Тут Л. Паўлючык прасочвае творчы шлях артысткі, працэс назапашвання майстэрства — ад фільма да фільма. Разважае пра перыпетыі акцёрскага лёсу, пра ролі С. Сухавей у кіно і на сцэне Мінскага тэатра-студыі кінаакцёра.

Вобразная, жывая журналісцкая мова, перакананасць аўтара, яго захопленасць прадметам гаворкі ўласцівыя гэтым невялічкім кніжкам пра кіно.

С. ВЕТКА.

У ЛУЧНАСЦІ БРАТНЯЙ

«КЛІЧА ЛІРА МЯНЕ...»

Люблю Беларусь...

Можа, таму, што рэкі майго краю цякуць у Прыпяць? Можа, таму, што Прыпяць упадае ў Дняпро? Можа, таму, што гусі і буслы, калі вяртаюцца з выраю, адпачываюць на маіх далонях, а пасля спяшаюцца далей, на поўнач? Можа, таму, што бацька прайшоў вашымі вогненнымі вёскамі ў ваеннае ліхалецце? Можа, таму, што бываю ў вас вельмі часта і заўсёды з радасцю?

Любяць Беларусь мае землякі-дубнаўчане. Цесныя сувязі з «сінявокаю сястрою Украіны» падтрымліваюць калгасы і саўгасы, прамысловыя прадпрыемствы майго раёна. Добрыя, трывалыя творчыя стасункі звязваюць нашых культработнікаў з калегамі з Брэсцкай вобласці. Часта словы «Беларусь», «беларускі» можна сустрэць і ў мясцовай раённай газеце, што сведчыць пра шчырае сяброўства нашых літаратараў з калегамі з Мінска, Брэста, Магілёва, іншых гарадоў і вёсак вашага дзівоснага краю.

Калі пісаў нататкі, міжволі падумалася: няўжо гэта ўсё так важна, каб паведамляць у рэспубліканскую газету? Ці няма тут лакальна-перыферыйнага прысмаку?

Напэўна, ёсць...

Але калі я зноў і зноў думаю, скажам, пра беларуса Івана Верхаўца, які быў апошнім вандроўным лірнікам Валынскай і Ровенскай абласцей і які апошнія чатыры дзесяцігоддзі пражыў у нашым сяле Мокрым, дык усё больш схіляюся да таго, што варта пісаць гэты ліст.

У горадзе Дубна жыве незвычайны чалавек — Арсен Ляўковіч. Лаўрэат ровенскай абласной камсамольскай прэміі імя Міколы Максыса. Ён з кагорты карчагінцаў, бо цяжкая хвароба з дзяцінства прыкавала яго да ложка. Але Арсен знайшоў у сабе сілы ўзяцца за пяро, пісаць арыгінальныя вершы і багата перакладаць з беларускай паэзіі. Ён надрукаваў у перыёдыцы і ўключыў у кніжку, здадзеную ў выдавецтва ЦК ЛКСМ Украіны «Молодь», вершы Н. Маняш, В. Віткі, Т. Бондар, В. Вярбы, Ю. Свіркі, А. Грачанікава, У. Верамейчыка, А. Бялевіча, Г. Дзмітрыева.

На старонках дубнаўскай раённай газеты «Чырвоная зорка» (тыраж 20 тысяч) толькі за мінулы год у перакладах мясцовых літаратараў былі надрукаваны вершы С. Грахоўскага, М. Мятлішкага, З. Марозава. Зараз рыхтуецца старонка, прысвечаная беларускай літаратуры, дзе будуць змешчаны творы М. Багдановіча і У. Караткевіча, Л. Галубовіча, М. Пракаповіча...

Прыемна і тое, што з паэтычнымі здабыткамі дубнаўчан у перакладах Л. Галубовіча, А. Канапелькі, З. Марозава пазнаёміліся чытачы некаторых беларускіх рэспубліканскіх газет.

Ізноў вяртаюся да славутага лірніка Івана Рыгоравіча Верхаўца. Шырэй пра яго можна прачытаць у маім артыкуле «Крынічныя струны», што быў надрукаваны сёлета ў лютаўскім нумары часопіса «Мастацтва Беларусі». Лёс гэтага чалавека зацікавіў не толькі мяне аднаго. У часопісе можна ўбачыць графічны партрэт лірніка, які выканаў мой зямляк Мікола Тымчак. Ён жа зрабіў скульптурны партрэт Верхаўца — цяпер твор знаходзіцца ў Музеі народнай архітэктуры і побыту Украінскай ССР.

Нядаўна я зайшоў да Міколы Тымчака. А ў яго радасць: з Кіева прыслалі карэктуру паэтычнай кніжкі. Гартаю старонку за старонкай, натрапляю на вершы, што непасрэдна звязаны з Беларуссю: «Ой, чый гэта конь бяжыць», «Ірпінь, студзень 1985 года...», «Белы снег, няйнакш Белая Русь», што стаў ужо песняю. А вось прысвячэнне Але Канапельцы, якая прыязджала на семінар творчай моладзі ў Ірпінь, над адным з вершаў эпіграф з Ніла Гілевіча. Асобна хочацца сказаць пра «думу на два галасы», як вызначыў жанр сам аўтар паэмы «Співаніца», прысвечанай лірніку Івану Верхаўцу. Верыцца, што яна абавязкова пабачыць свет беларускаю моваю, бо гэта — сапраўдная паэзія. У часопісе «Мастацтва Беларусі» быў надрукаваны невялічкі фрагмент з думы, які я дазволю сабе працытаваць тут:

Ой, застагналі ціха нявольнікі
пад бізунамі,
Ветры, цятыя шаблямі,
заіржалі канямі,
І застагнала
Шапкамі знесена ў горы
зямліца,
А па-над ёю зоркай
ускрыкнула спеваніца —
Ды апякла мае пальцы
на клавішах чорнай тугою,
Кліча ліра мяне і спявае
сівой даўніною.
Мала аслепнуць і з лірай
хадзіць Украінай
і Белаю Руссю —
Для співаніцы аддаць
неабходна ўсю душу...

Я расказаў толькі пра невялікую часцінку таго, што робіцца па прапагандзе беларускай літаратуры і культуры ў адным з раёнаў Украіны. Але і гэта сведчыць пра нашу сардэчную духоўную лучнасць.

А што за такі гарадок Дубна, мабыць, падумаеце вы? Наша мясціна помніць слёзы і сляды Тараса Шаўчэнкі, пра яе пісаў у сваёй аповесці «Тарас Бульба» Мікалай Гогаль, сюды вялі шляхі-дарогі Багдана Хмяльніцкага, Івана Фёдарава, Мелеція Сматрыцкага...

У гэты гарадок з Беларусі ідуць і ідуць цягнікі, аўтобусы, бандэролі, пісьмы, а ў іх — кнігі, вершы, пераклады...

Запрашаем і вас, дарагія беларускія сябры!

Мікола ПШАНІЧНЫ,
член Саюза пісьменнікаў СССР.

г. Дубна
Ровенскай вобласці.

ПАЭЗІЯ ЯК ХЛЕБ НАДЗЁННЫ

Так называецца зборнік метадычных і бібліяграфічных матэрыялаў, які выпусцілі Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна і Рэспубліканскае таварыства аматараў кнігі. Зборнік прысвечаны 75-годдзю народнага паэта Беларусі Максіма Танка.

Брашура пачынаецца бібліяграфічным аглядам жыццёвага і творчага шляху майстра. Другі раздзел «Формы і метады прапаганды творчасці М. Танка ў бібліятэках» змяшчае распрацоўку кніжнай выстаўкі да юбілею, матэрыялы да вусных часопісаў на тэмы «Біяграфія ў песні маёй і ў мяне—адна», «Аб подзвігах, мужнасці, велічных справах». Прапагандысты творчасці паэта знойдуць тут матэрыялы для правядзення вечара паэзіі «Прайсці праз вернасць», а таксама вечара-партрэта Максіма Танка «Я сэрцам пісаў сваю кожную песню».

Складальнікі зборніка ўключылі ў яго адпаведныя формы прапаганды паэтычных твораў сярод школьнікаў.

Бібліяграфічная частка выдання змяшчае спісы твораў М. Танка і рэцэнзіі на іх, творы паэта, перакладзеныя на музыку (нотаграфія, грамзапісы песень на словы М. Танка), літаратуру аб жыцці і творчасці паэта і творы, прысвечаныя яму.

М. РОЗУМ.

З ДАЛЁКІХ І БЛІЗКІХ ДАРОГ

Варыс Саванка: У краіне польдэраў і цюльпанаў

III

НА СУСТРЭЧУ да Рауля прыйшла ў асноўным моладзь, што мяне ўзрадавала: пазнаёміцца з нідэрландскай моладдзю мне вельмі ж хацелася. У Рауля свой дом, нават не дом, а асабняк. Сцены ў ім завешаны карцінамі, абстаўлены кнігамі. І гаспадыня такая, што вачэй не адвесці, — чарнявая, вочы, як слівы, і станістая, грудастая. Пра сябе яна расказвала з гумарам:

— Мы з Раулем пазнаёміліся ў Лондане, вяселле згулялі ў Мадрыдзе, а жывём у Галандыі...

Яна — іспанка, завуць яе Раліна, і Раулю давялося вывучыць іспанскую мову, а ёй — галандскую. Сваю любоў да іспанскай мовы і ўсяго роднага маці прывіла і сыну — росламу, чарняваму студэнту-першакурсніку. З ім мы і пачалі гутарку, пакуль падыходзілі госці. Каб мы адзін аднаго разумелі, нам дапамагала Матыльда — студэнтка факультэта славістыкі Амстэрдамскага універсітэта. Рускую мову яна ведала яшчэ не вельмі каб, баялася пры мне вымавіць і слова. Я падахвоціў яе, сказаўшы, што я таксама не рускі і пры мне не варта баяцца гаварыць па-руску.

— А што, беларуская мова хіба адрозніваецца ад рускай? — спытала Матыльда.

— Прыкладна гэтак жа, як галандская ад нямецкай.

Вярнуўся аднекуль Рауль — па-маладому рухавы, падцягнуты, прынёс некалькі бутэлек сухога віна. Але Раліна захацела мяне пачаставаць іспанскай гарэлкай, якую я, вядома ж, нідзе не каштаваў. (Да слова, галандцы, як я пераканаўся, вельмі ашчадныя і ў выпіўцы, у большасці вядуць цвярозы лад жыцця.)

Сярод тых, хто прыйшоў на сустрэчу, некалькі чалавек вывучалі рускую мову. Таму ў іх да сустрэчы са мной была двайная цікавасць. І адно з першых пытанняў, што было мне зададзена, чаму ў Савецкім Саюзе так кепска пастаўлена вывучэнне замежных моў.

— У нас, — сказалі мне, — калі не ведаеш трох моў — галандскай, англійскай і нямецкай, не зможаш працаваць ні ў адной установе — цябе проста не возьмуць.

— Што праўда, то праўда, — згадзіўся я, — людзі майго пакалення ў нас кепска ведаюць замежныя мовы. Не для апраўдання, але скажу: мы вучыліся ў пасляваенны час, калі не было не толькі школ, але і падручнікаў, настаўнікаў, — усё знішчылі фашысты...

Расказаў, што цяпер і ў гэтай справе намеціўся ў нас зрух да лепшага — пачалі працаваць школы, у якіх амаль усе прадметы выкладаюць па-англійску, па-французску ці па-нямецку.

Прызнаўся, што ў нас іншая праблема з'явілася — некаторыя сваю родную мову вывучаць не хочуць, адмаўляюцца. І не толькі ў Беларусі, але і на Украіне, у іншых рэспубліках.

Мне не паверылі — засмяяліся: як жа можна жыць, не ведаючы свае роднае мовы?

Пасыпаліся іншыя пытанні, і, мяркуючы па іх, моладзь жыла праблемамі бацькоў — ведала, адчувала, можа быць, пакуль і падсвядома, што тое, што не вырашаць бацькі, давядзецца вырашаць ёй. І рыхтавалася да таго. Вядома, пытанняў было шмат тых самых — і пра нашу перабудову, дэмакратызацыю, галоснасць, і як адносяцца ў нас да веруючых, да яўрэяў, і што ўяўляюць з сябе камуністы і Камуністычная партыя, і... Адчувалася і тут, як і ўсюды на ранейшых сустрэчах: лепш ведаюць якраз тое, што ў нас горш, чым у іх, і зусім не ведаюць таго, што ў нас лепш, з чаго трэба браць прыклад, як скажам, што ў нас няма беспрацоўя, што ў нас бясплатнае лячэнне, малая кватэрная плата... Але было і новае — напярэдадні па тэлевізары быў паказаны зняты англійскім карэспандэнтам у Маскве фільм пра пасадку спартыўнага самалёта на Краснай плошчы грамадзянінам ФРГ Рустам. І маладых людзей цікавіла, як гэта магло здарыцца, што самалёт не збілі, і ці будуць судзіць лётчыка, а калі будуць, то што яму пагражае. Ад двух-трох маладых людзей запахла, а то і проста пачало патыхаць таннай антысаветчынай — няйнакш, начыталіся рознай дысідэнцкай літаратуры. Пайшлі ў ход імёны Салжаніцына, Амальрыка, Мядзведзева, Зіноўева, Максімава... Адзін, даволі змрачнаваты тып, пачаў спасылацца на аўтарытэты Леніна, Сталіна, Хрушчова, Брэжнева, прыводзіць у скажоным выглядзе цытаты з іх твораў і прамоў. Нашы ворагі, як я даўно заўважыў, ведаюць, хоць і не заўсёды добра, тое, што ў нас было ўчора, і зусім не ведаюць таго, што ў нас ёсць і робіцца сёння. Таму адказваць на пытанні, разбіваць ці развенчваць хлусню было няцяжка. Ведаў я і яшчэ адно правіла любога, хто ўступае ў спрэчку. Галоўнае, не гарачыцца, не спяшацца. І я гэта вытрымліваў, тым больш, што перакладчыца была нявопытная, мне даводзілася асобныя фразы паўтараць двойчы і тройчы, а то і шукаць, як бы іх замяніць на такія, каб яна зразумела. А гэта давала час падумаць, пашукаць больш доказныя факты... Увогуле ж, моладзь мне спадабалася. Тая пена, што раптам выплеснула, хутка апала нават у тых, хто, можа быць, знарок і рыхтаваўся, каб мяне збянтэжыць, збіць з панталыку. І пад канец размова наша перайшла ў вельмі мірнае рэчышча — мы пілі кофе, чай і гаварылі пра ўсё, што нас цікавіла. Гутарка скончылася таксама за поўнач. І тады да мяне падышла дзяўчына, што сядзела побач увесь час і маўчала, і сказала дзякуй, бо я пераканаў яе — ёй трэба паступаць толькі на славістыку, і нікуды болей — яна канчала сёлета гімназію і да сустрэчы са мной вагалася, якую выбраць прафесію. Пасля сустрэчы ж у яе цвёрдае перакананне — вывучыць рускую мову, каб ведаць самой без чыіх-небудзь перакладаў і тлумачэння тое, чым жыве наша краіна, што там адбываецца. Не таюся — пачуць гэта мне было прыемна...

Задаволены сустрэчай быў і Рауль. Ён аж усміхаўся, цвіў:

— Ведаеце, у нас розная ёсць моладзь. І добра, што вы сустрэліся з ёю, у чымсьці пераканалі сяго-таго, штосьці развеялі, рассеялі. Не забывайце — большасць з іх сустракаюцца з савецкім чалавекам упершыню!

А Раліна нават падарункі падрыхтавала — і мне, і маёй жонцы, дочкам.

Сустрэчы, сустрэчы... Яны былі і назаўтра — гэты раз у школе — з настаўнікамі, вучнямі. Калі я правёў тры ўрокі пытанняў і адказаў у самых розных класах і стала ясна, што цэлы дзень прабыць у школе не змагу, вучні тых класаў, дзе я не выступаў, ледзь не ўзбунтаваліся — чаму некаторым можна сустрэцца з савецкім чалавекам, ды яшчэ пісьменнікам, а ім не? Давялося ўсіх жадаючых сабраць у вялікую залу, паставіць мікрафон, і я з дапамогай той жа Матыльды адказваў на ўсе пытанні, што цікавілі вучняў ды і настаўнікаў. Дзеці, як выявілася, добра ведалі, што адбываецца ў нашай краіне, сачылі за ўсімі падзеямі ў свеце. Калісьці я сустракаўся ў Нью-Йорку з амерыканскімі школьнікамі. Там мяне здзівіла абыякавасць і недасведчанасць. Адно хіба толькі амерыканскія дзеці ведалі добра: Амерыка — гэта выдатна, усё што па-за Амерыкай — гэта дрэнна; у Амерыцы самыя лепшыя ў свеце тавары, у Амерыцы самая лепшая дэмакратыя, у Амерыцы самая моцная армія і флот, словам, у Амерыцы ўсё лепшае. І ім проста незразумела было, чаму не можам мы, савецкія, гэта прызнаць і яшчэ штосьці спрабуем пярэчыць, а з сім-тым нават і не згаджацца... Тут, у Нідэрландах, дзеці, вучні былі зусім іншыя, яны нечым вельмі добрым напаміналі нашых дзяцей. І хоць пытанні задавалі самыя розныя, у тым ліку і, як прынята называць, «на засыпку», але ішло гэта, як хутка я пераканаўся, ад няведання, ад недахопу праўдзівай інфармацыі. Ды і настаўнікі, бацькі, сродкі прапаганды паспелі сяму-таму засмеціць галовы. «Калі хто-небудзь не верыць мне, — казаў я, — я запрашаю прыехаць у Савецкі Саюз, і вы ўбачыце ўсё тое, пра што я кажу, на свае вочы». Прыехаць у Савецкі Саюз хацелі ўсе, вось толькі не ведалі, як гэта зрабіць.

(Працяг на стар. 14—15).

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах 32, 33).

У КРАІНЕ ПОЛЬДЭРАЎ І ЦЮЛЬПАНАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 13).

— Вучыцеся, заробіце грошы — і ўсе, хто таго хоча, прыедзе, мара ваша збудзецца!

Вельмі цікава было пачуць нідэрландскім школьнікам пра сваіх равеснікаў у Савецкім Саюзе, як яны жывуць, як вучацца, пра што думаюць, мараць. Вядома, усе хацелі, каб быў мір, каб можна было вучыцца, жыць гэтак жа, як і жывуць, далей.

Дзеці ёсць дзеці. І развітваўся я з імі, быццам пасля чарговай сустрэчы з беларускімі дзецьмі дзе-небудзь у Салігорску ці ў Петрыкаве...

У той жа дзень я пабываў у некаторых магазінах, паглядзеў, што там і як прадаецца. Ван Росем казаў мне, што ў іхняй краіне пакупнік — кароль. У яго ёсць грошы, ён іх можа аддаць, калі знойдзе тое, што яму трэба. І таму пакупніку ўсе служаць, усе імкнуцца яму дагадзіць. І што гэта так, праўда — я пераканаўся.

Пабываў я і ў паліцыі — трэба было паставіць пячатку на тым дакуменце, які выдалі мне ў аэрапорце, каб мяне не затрымалі пры выездзе з краіны, пазначыць, дзе жыў, што рабіў. Калі я разам з Ры зайшоў у паліцыю і за мною зачыніліся самі сабою дзверы — а я ведаў, што пакуль дзяжурны не націсне кнопку, то дзверы ўжо не адчыняцца, — не скажу, каб адчуваў сябе добра. Асабліва калі ўбачыў абвесткі з партрэтамі розных злачынцаў, якіх шукала паліцыя, ды і саміх паліцэйскіх — яны сядзелі ўсе ў адным пакоі за вялізным доўгім сталом і неяк надта ж падазрона глядзелі на мяне. А можа, гэта мне так толькі здалося, бо, як толькі дзяжурны даведаўся, хто і чаго завітаў, ён націснуў кнопку, да яго падбег той, каго выклікалі, і хвілін праз колькі мая справа была ўладжана. Што ж, о'кей!

А яшчэ праз якую гадзіну, развітаўшыся з домам, дзе жыў, начаваў тры ночы, я паехаў у Дрэйберген — праводзілі мяне туды на сваёй машыне вельмі ж добрыя, сардэчныя людзі — Ван Росем і яго жонка Ры.

Пра што чалавек думае ў дарозе, ды яшчэ калі едзе не па сваёй, а па чужой краіне? Не ведаю, як хто, а я думаў пра роднае мне, бясконца дарагое, мілае душы і сэрцу Палессе.

Ці таму, што нідэрландская зямля надта ж нагадвала маю — такая ж балоцістая, парэзаная ўсюды каналамі, як цяпер і ў нас на Палессі, — ці то, што здарылася там, у нас, хвалявала і прадаўжае хваляваць не толькі мяне, а ўсіх людзей свету — пра аварыю ў Чарнобылі я гаварыў на кожнай сустрэчы — абавязкова было адно, а то і некалькі пытанняў пра гэта. І калі я прызнаваўся, што нарадзіўся непадалёку ад тых мясцін, дзе адбылася аварыя, што там і сёння жыве мая маці і браты, людзі аж жахаліся, не верылі — так запалохалі іх сродкі масавай інфармацыі. Тое, што здарылася ў Чарнобылі, хвалюе, трывожыць многіх. Нават арганізацыя ўзнікла, якая змагаецца супраць выкарыстання атамнай энергіі ў мірных мэтах. Падыходзілі да мяне, пыталі, ці няма ў нас такой арганізацыі...

Дрэйберген, як і большасць гарадоў у Нідэрландах, зліваецца з іншымі гарадамі і вёскамі, не пазнаць, дзе ён пачынаецца, а дзе канчаецца — у краіне перанаселенасць. Ён такі ж зялёны і чысты, як і ўсе паселішчы тут. Не дзіва — кожны ж дзень па некалькі разоў вуліцы мые дождж, паліваe зеляніну — дрэвы, кусты, траву. Ды і збудаваны гарадок быццам на пагорку, не ў балоце. Нават лес вакол яго ёсць — ліпы, клёны, дубы, бярозы, сосны. Высокія, рослыя цяністыя. У ім, гэтым лесе, а, дакладней, у парку, мы і спыняемся. Тут стаіць некалькі двухпавярховых домікаў і называецца гэтая мясціна К'ерк-ен-Вералд, што ў перакладзе на нашу мову значыць зацішны куточак, месца для адзіноты. У адным з домікаў, што стаіць каля невялікага азярца — у ім надта ж спакойна і грацыёзна плаваюць дзікія качкі з качанятамі — не такія, як у нас, а чубатыя, — мяне і пакідаюць Ван Росем і Ры. Я дзякую ім за клопат і турботы, развітваюся як з самымі дарагімі і блізкімі людзьмі.

Тут, у гэтым доміку, на першым паверсе мне выдзяляюць пакой. Я заношу туды свае рэчы. Умываюся, пераадзяваюся, выходжу на алейку, каб пагуляць. І тут... Сустракаю тых, з кім мы рассталіся ў аэрапорце — членаў нашай дэлегацыі. У асноўным усе задаволены — і сустрэчамі з людзьмі, і тым, як іх прымалі. Але задаволены не ўсе. Некаторыя трапілі ў сем'і розных сектантаў, вегетарыянцаў, і амаль галадалі. Ды і сустракаліся з людзьмі яўна настроенымі да нас варожа. Не вельмі пашанцавала і тым, хто аставаўся ў гарадах — і гасцініцы былі не лепшыя, ды і сустрэчы з прадстаўнікамі розных партый і грамадскіх арганізацый расчаравалі — у Нідэрландах многія баяцца, што калі амерыканцы забяруць свае ракеты з Еўропы і з іх краіны, Савецкі Саюз выкарыстае гэта і прымусіць усіх жыць не так, як жывуць, а як хочуць камуністы... Некаторыя нават пытанне задавалі — што вы зробіце з намі, калі заваюеце? Адказвалі, вядома, з іроніяй, сарказмам — як што, у Сібір вас вышлем, да мядзведзяў!

Дух антысаветызму прарваўся і на першай сустрэчы, якая адбылася ў той жа дзень. Сам Ян Фабер, ды і некаторыя іншыя кіраўнікі Міжцаркоўнага савета міру паспрабавалі навязаць дыскусію, якая ніякіх адносін не мела да абароны міру, да нашых агульных мэт і задач. І нашы таварышы, асабліва Рыгор Локшын, Фёдар Бурлацкі, Марына Максімава ды і іншыя, прэтэнзіі нашых апанентаў звялі на нішто, спаслаўшыся, што сёння і так усе стаміліся, раніца, маўляў, мудрэй за вечар, таму давайце заўтра і вызначым тэму дыскусіі. Ды і пагаварыць усім нам хацелася адзін з адным — доўга не бачыліся. Словам, дыскусію настоялі перанесці на два наступныя дні...

Два наступныя дні... Яны прайшлі цікава, у даволі вострых спрэчках. Хоць і дамаглася наша дэлегацыя гаварыць не пра тое, што нас раз'ядноўвае, а пра тое, што аб'ядноўвае, але вызначаная тэма — гэта ўсяго толькі тэма, а хто што скажа, залежала цалкам ад аратараў. Іх жа было шмат і ўсе самыя розныя людзі, прадстаўлялі дзевяць цэркваў, што ўваходзяць у Міжцаркоўны савет міру — католікаў, пратэстантаў, лютэранцаў, кальвіністаў, праваслаўных, баптыстаў... Я нават не думаў, што ў адной маленькай краіне, такой, як Нідэрланды, існуе столькі розных рэлігій, хоць молящца быццам і аднаму богу. Вядома, нам, атэістам, было нялёгка саўладаць з такім мноствам поглядаў. Да таго ж, з намі меўся паехаць у Нідэрланды прапаведнік баптысцкай царквы з Рыгі, але ён, як на тое, захварэў, і мы прыехалі без свайго божага служкі. І гэта ўскладніла нашу работу. Але затое мы мелі іншую дадатковую сілу, якой не мелі нашы апаненты — большасць членаў нашай дэлегацыі прайшлі рознага роду «круглыя сталы», форумы, дыскусіі на самых розных узроўнях, да таго ж, у многіх былі дыпламатычныя навыкі. Словам, людзі былі падрыхтаваныя да ўсякіх нечаканасцей, такіх збіць з тропу было амаль немагчыма. І прэтэнзіі нашых апанентаў часта зводзілі на звычайны чалавечы жарт ці, калі таго патрабавала сітуацыя, прыводзілі такія факты, якія гаварылі самі за сябе. Але трэба было не толькі абараняцца, але і наступаць, заваёўваць сабе прыхільнікаў, пераконваць, што сёння наша краіна і палітыка нашага ўрада, унутраная і знешняя, — гэта не ўчарашнія, што мы ідзём проста гіганцкімі крокамі наперад. Новае мысленне, якое абвешчана на апошнім з'ездзе партыі, — гэта не словы, а рэальнасць. Фёдар Бурлацкі прачытаў ледзь не цэлую лекцыю, што такое новае мысленне, у чым яго сутнасць. Цяпер мы, сказаў ён, аддаём прыярытэт агульначалавечым праблемам над класавымі. Гэта выклікала сенсацыю ў свеце. Дагматыкі розных масцей і сёння гэтага не могуць зразумець, хоць, здавалася б, усё ясней яснага — ядзерная вайна аднолькава небяспечная і капіталістам і рабочым. Мір патрэбен усім людзям, хто б яны ні былі, дзе б ні жылі. Капіталізм параджае войны. Так лічылася. Але практыка, жыццё паказалі — капіталізм і сацыялізм могуць суіснаваць. Трэба адмаўляцца ад стэрэатыпаў, створаных прапагандай — усе мы, урэшце, людзі. І гэта галоўнае. Між краінамі, народамі, наогул людзьмі, ёсць супярэчнасці, але няма непазбежнасці. Мы партнёры па выжыванні. У сваёй краіне, прадаўжаў прамоўца, звяртаючыся да залы, — мы спрабуем фарміраваць новы тып мыслення ў духу Хельсінскіх пагадненняў. І таму ствараем інфармаванае грамадства. Тое, што робіцца ў свеце, павінны ведаць усе, не толькі эліта. Раней мы імкнуліся крытыкаваць капіталізм, цяпер паказваем і яго дадатныя бакі, тое, з чаго трэба браць прыклад. У капіталізму ёсць шмат заган, але ёсць і добрае, чаму варта вучыцца. Мы адсталі, напрыклад, у тэхналогіі. Без тэхналагічнай рэвалюцыі мы не зможам рухацца наперад. І мы будзем вучыцца ўсяму лепшаму ў капіталізму. Мы шырока адчыняем дзверы ўсім, робім грамадства адчыненых дзвярэй — хочаце, прыязджайце, глядзіце, што вам падабаецца, а што не. Раней мы падтрымлівалі толькі камуністычны, рабочы рух у краінах капіталу. Цяпер мы падтрымліваем усякі рух, што накіраваны супраць вайны, бо вайна — гэта знішчэнне чалавецтва, знішчэнне цывілізацыі...

Вельмі глыбока і цікава выступіла доктар эканамічных навук Маргарыта Максімава. Пераможцаў у вайне не будзе, сказала яна, і гэта ведаюць у нашай краіне ўсе. Шкада, што ў многіх капіталістычных краінах гэтага не разумеюць пакуль што нават некаторыя палітычныя дзеячы, тыя, хто стаіць на чале ўлады. Сёння неабавязкова запускаць ракеты ці кідаць атамныя бомбы—дастаткова вывесці са строю атамныя электрастанцыі, што пабудаваны амаль ва ўсіх краінах, і чалавецтва загіне... Пра гэта напомніла аварыя ў Чарнобылі. Што ж да атамнай вайны... У ёй, бадай, лягчэй будзе якраз тым, на каго нападуць, — яны загінуць першыя без страшных хвароб і пакут... Другая не менш жахлівая праблема, якая стаіць перад чалавецтвам, гэта праблема забруджвання асяроддзя, якая прывядзе да проста непрадбачаных вынікаў. Калі гэтак, як цяпер, будзе і надалей ісці забруджванне атмасферы, ужо да 2030 года не будзе Ленінграда, Галандыі і многага іншага — яны будуць затоплены водамі Ледавітага акіяна... Новае мысленне не да ўсіх пакуль што даходзіць у нашай краіне. Яго пакуль што ніяк не могуць прыняць многія на Захадзе. А трэба, бо той шлях, якім мы ішлі раней, вядзе да катастрофы. Толькі аб'яднаўшы ўсе свае намаганні мы зможам выжыць, пакінуць нашу планету прыгоднай да жыцця наступным пакаленням.

Эмацыянальным, доказным было і выступленне кіраўніка нашай дэлегацыі Віталія Кароціча. Нагадаўшы, што ўсе мы людзі, і, натуральна, усе хочам жыць, ніхто не хоча паміраць, ён прывёў прыклад, што сярод тых, каго расстрэльвалі ў Баб'ім Яры, таксама не было людзей, хто б хацеў паміраць. Але як, якой цаной захаваць сабе жыццё?.. Астацца чалавекам і памерці, ці стаць здраднікам, падонкам і выжыць?.. Ва ўсіх, каго расстрэльвалі ў Баб'ім Яры, у кішэнях былі ключы—ключы ад сваіх кватэр. Людзі ў самыя цяжкія хвіліны верылі, што яны вернуцца дахаты. Гэтыя ключы некаторыя з тых, хто расстрэльваў людзей, потым забіралі ў мёртвых і ішлі ў Кіеў, каб рабаваць кватэры расстраляных... Гэта таксама былі людзі, толькі з іншай псіхікай, іншай псіхалогіяй. Як ні сумна, але і тыя, і другія былі савецкія людзі...

Зараз мы жывём у вельмі напружаны і складаны час. Усё залежыць ад нас саміх—яшчэ ёсць шанс, каб усім нам выжыць. Яго трэба выкарыстаць. Мы людзі і можам пра ўсё дамовіцца. Калі ж не дамовімся...

Віталій Кароціч спаслаўся на гутарку з адным са стваральнікаў савецкіх касмічных апаратаў. Калі амерыканцы запусцяць у космас начыненую атамнай зброяй станцыю, як гэта плануецца праграмай САІ, то і мы змушаны будзем тое самае зрабіць у адказ. А гэтыя станцыі абсталяваны такой тэхнікай, што... Словам, лепш нам, людзям, пра ўсё дамовіцца, чым свой лёс даверыць гэтым апаратам. Бо апараты могуць зрабіць тое, што потым ніхто не пераробіць, бо і не будзе нікога...

Цікава выступілі і гаспадары—Ян Фабер, напрыклад, Л. Хогбрынк, ды і некаторыя іншыя. Цвярозы чалавечы розум, хоць і не адразу, а браў верх, перамагаў. Кіраўніцтва Міжцаркоўнага савета міру прыняло нашу праграму барацьбы за мір і ўсеагульнае раззбраенне.

Акрамя агульнай дыскусіі, былі семінары, гутаркі ў кулуарах, сустрэчы, знаёмствы, высвятленні пазіцый, супастаўленні поглядаў і г. д. Цяністыя алеі, цішыня, ды і сама атмасфера К'ерк-ен-Вералда садзейнічалі гэтаму, настройвалі на добры, аптымістычны лад. Пастараліся і арганізатары семінара—у дастатковай колькасці завезлі піва і віна, наладзілі нават пікнік з шашлыкамі на лугавіне...

Я ішоў вячэраць, калі мяне раптам спынілі, сказалі, што мяне шукае нейкая жанчына. Я, вядома, здзівіўся, не паверыў, але выйшаў з памяшкання—так, ля машыны стаяла знаёмая жанчына, ва ўсякім выпадку яе бачыў я на сустрэчы ў Рауля. Паводзіла там сябе яна, быццам, лаяльна, нават разоў колькі заапладзіравала, калі я адказваў на розныя антысавецкія выпады. Жанчыну звалі Бэці, як яна сказала, падаючы мне руку, а вось што яна гаварыла—я не ведаў, не мог зразумець, бо гаварыла пагаландску. Пачалі мы, каб паразумецца, шукаць перакладчыка, але, як выявілася, Бэці не ведала ні англійскай, ні нямецкай моў. Ёсць, аказваецца, такія і ў Нідэрландах. Што было рабіць? Пачалі высвятляць, чаго Бэці хоча. Сяк-так зразумелі—яна хоча мяне з сабою забраць. Куды? У Амстэльвеен. Там вялікі вечар, і ёсць такое пажаданне, каб я выступіў. На вечары павінен быць Рауль і Сіман... Добра, а што рабіць з маімі рэчамі? Заўтра ж раніцою адсюль наша дэлегацыя выязджае ў Амстэрдам? Як мне знайсці дэлегацыю? Ды і дзе начаваць? Задача з некалькімі невядомымі. Да таго ж, я ў чужой кране, і, лічы, бязмоўны, бо з маім веданнем нямецкай мовы... Чаго і ў каго дапытаешся?

Параіўся са сваім кіраўніцтвам, што рабіць. Калі людзі сабраліся, трэба, вядома, ехаць. Нешта ў людзей ёсць да мяне, калі ў іх з'явілася жаданне сустрэцца звыш намечанай праграмы. Вядома, рэчы свае трэба забраць. Будзе дзе пераначаваць там—пераначую. А калі не... Ці прыеду сюды, ці заўтра дабяруся да Амстэрдама. Назву гасцініцы і яе адрас мне далі, і... З богам!

Бэці не ведала замежных моў, але выдатна ведала дарогу і сваю машыну—не ехала, а імчала з ветрыкам — ляцела. Толькі мільгалі паўзбоч, адстаючы, тыя машыны, што яна абганяла,—таёты, вольвы, кадэты, опелі, фіяты... Шэсцьдзесят кіламетраў мы праехалі за лічаныя мінуты. І апынуліся ў Амстэльвеене. Нічым асаблівым гэты гарадок не адрозніваецца, як я заўважыў, ад іншых падобных гарадкоў—такі ж зялёны, чысты, як і ўсе. Спыніліся ля нейкага кафэ. Бэці не сказала, а хутчэй паказала, каб я забіраў свае рэчы з машыны. Я забраў, пайшоў услед за ёю ў кафэ.

Вы бачылі б, якая бурная радасць была ў тых, хто там сядзеў, калі яны ўбачылі мяне. Аж з месцаў сваіх паўставалі, заапладзіравалі. Я вярнуўся ў гардэроб, пакінуў там свае рэчы, памыў рукі і выйшаў ужо гатовы да таго, што мяне чакала, у зал, да людзей. Здзівіўся, што іх столькі—больш за сотню. Рауль і Сіман мяне абнялі, сказалі, што яны вельмі рады, што я прыехаў. Патлумачылі і прычыну—пайшла пагалоска, што я цікава выступаю і са мною пажадалі сустрэцца многія. Дзеля гэтага было нанята кафэ. На сценах яго развешаны малюнкі тых дзяцей, у якіх я выступаў некалькі дзён назад у школе. Дзеці папрасілі, каб гэтыя малюнкі аддалі мне і я наладзіў выстаўку іхняй творчасці ў нашых школах. Хай, маўляў, нашы школьнікі ведаюць, што ў іх ёсць сябры ў Нідэрландах, яны падтрымліваюць палітыку Гарбачова і таксама хочуць міру...

Што ж, мне было прыемна гэта чуць.

Я сеў за столік, побач са мной сеў Сіман. Пачаўся зноў вечар пытанняў і адказаў. Я гаварыў, Сіман перакладаў. Потым, калі ён стаміўся, да мяне падсеў хлопец, як потым высветлілася, студэнт факультэта славістыкі Амстэрдамскага універсітэта, які збіраўся ехаць на стажыроўку ў Маскву і які хацеў папрактыкавацца ў веданні рускай мовы. Пытанні былі самыя розныя, у тым ліку, вядома, і тыя, на якія не вельмі хочацца адказваць. З новага было хіба тое, што на сустрэчу прыйшло некалькі калек, якія надта ж цікавіліся, як справа з калекамі, іх забеспячэннем і доглядам у нас, у нашай краіне...

Сустрэча скончылася позна, недзе а першай гадзіне ночы. Рауль падвёз нас з Сіманам у Айтхорн — гарадок, дзе жыў Сіман. Зоі, яго жонкі, і дачкі Лены дома не было, і мы, удваіх нагаварыўшыся ўволю, лягчі спаць. А ўранні, падняўшыся з пасцелі, хадзілі па магазінах, ехалі разам у Амстэрдам на аўтобусе. Дарэчы, аўтобусы ў Нідэрландах ходзяць надта ж рэгулярна, выдаецца друкаваны расклад, дзе пазначана, які нумар аўтобуса, калі і на які прыпынак прыходзіць, па ўсёй краіне. І кажуць — спазненняў амаль не бывае. Гэтак жа рэгулярна, да мінуты, ходзяць і трамваі. Сіман памог мне знайсці гасцініцу, якую трымалі інданезійцы — называлася яна «Ван дэ Кастээлен», — уладкавацца там, ён павадзіў мяне і па Амстэрдаме, паказаў яго выдатныя мясціны, пачаставаў рознымі нацыянальнымі стравамі і ласункамі. Разам з ім мы наведалі і музей Ван Гога.

Сіман — галандзец, ён шэсць гадоў вучыўся ў Маскве. Пакахаў савецкую дзяўчыну, узяў яе замуж. Вывучыў даволі добра рускую мову, сувязей з Савецкім Саюзам не парывае, бо Савецкі Саюз і тое, што ў нас, яму вельмі ж падабаецца. І ён хацеў бы хоць сёе-тое з таго добрага, што ёсць у нас, унесці і ў жыццё Нідэрландаў. Але гэта не так проста — да Сімана некаторыя адносяцца як да «чырвонага». Адсюль і канфлікты з начальствам. І не толькі на рабоце.

Ён, Сіман, расказаў мне многае, чаго я не ведаў і ведаць без яго наўрад ці змог бы... Ну, хоць бы, скажам да прыкладу, пра таго іхняга пісьменніка, сапраўднага галандца па натуры, які ўвайшоў у сусветную літаратуру пад псеўданімам Мультатулі. Хто такі Мультатулі? У перакладзе з латыні гэта Пакутнік. Пад гэтым псеўдані-

мам выступаў у друку адзін з буйных чыноўнікаў каланіяльнай адміністрацыі Эдуард Дауэс Дэкер, які амаль дваццаць гадоў праслужыў у Інданезіі і звольнены ўрэшце з дзяржаўнай службы. Замест таго, каб падаць вернападданую просьбу пра сваю рэабілітацыю, гэты звольнены са службы асістэнт-рэзідэнт адной з округ Явы, выступіў з кнігаю, якая была як гром з яснага неба — ускалыхнула не толькі галандскую грамадскасць. Назва гэтай кнігі «Макс Хавелаар, або Кафейныя аўкцыёны нідэрландскага гандлёвага таварыства».

Неяк, ад аднаго майго знаёмага маскоўскага пісьменніка, я пачуў прыкладна такія разважанні. Ну, скажам, што не падпарадкоўваліся ўладзе, выступалі супраць яе ці ішлі нават у рэвалюцыю розныя пакрыўджаныя і бедныя — гэта можна зразумець. А чаму ішлі супраць улады людзі багатыя, тыя, хто нічым не быў пакрыўджаны, абдзелены ці абыдзены ўвагай? Чаго, скажам, не хапала таму самаму Радзішчаву? А ён, ды і не адзін такі, як ён, пайшлі супраць улады? Чаму? І адказаў той маскоўскі пісьменнік — таму, што ў іх было сумленне і яно не магло маўчаць. «Я взглянул окрест меня — душа моя страданиями человечества уязвленна стала».

Было сумленне і ў Эдуарда Даўэса Дэкера. І яно, сумленне, не давала яму спакойна жыць і глядзець, што робіцца навокал. А рабілася страшнае. «Маленькая краіна з вялікім ротам» буржуазна-мяшчанская Галандыя, цалкам закабаліўшы Інданезію з яе шматлікімі астравамі і шматмільённым насельніцтвам, якое было даведзена да жахлівай галечы, будавала сваё шчасце на няшчасці іншых. Хоць рабства тады быццам фармальна і не было, але яно існавала пад прыкрыццём так званай «прымусовай сістэмы культур», паступова навязанай галандскімі імперыялістамі, якія пачалі каланізацыю Інданезіі яшчэ ў XV стагоддзі. Паводле гэтай «прымусовай сістэмы культур» плантатар вырашаў, што і калі каму сеяць, якімі прыладамі працы карыстацца пры апрацоўцы зямлі, калі каму і куды ісці і г. д. Плантатар вызначаў і працягласць працоўнага дня, які доўжыўся ад ночы да ночы. Шэсцьдзесят дзён штогод інданезійцы павінны былі працаваць на плантатара, на той зямлі, якую ён у іх адбіраў, і дзе сеялі быццам «для патрэб метраполіі» цукровае трысцё, каучук, тытунь, кофе. Ад продажу каланіяльных тавараў галандскі ўрад нажываў мільёны. Ідылічная з выгляду «краіна цюльпанаў» падымалася з балот і азёр на крыві і поце інданезійцаў.

І вось, ведаючы ўсё гэта і бачачы ўсю няспраўядлівасць адносін галандскіх чыноўнікаў да карэнных жыхароў краіны, Дэкер-чалавек прыйшоў у супярэчлівасць з Дэкерам-чыноўнікам. У адным са сваіх лістоў ён пісаў, «што бяссілле аблегчыць людзям цяжкасці іх лёсу не пакідае мяне». Канфлікты з начальствам узнікалі ледзь не кожны дзень. Дэкер спрабаваў хоць чым-небудзь памагчы прыгнечаным і пакрыўджаным — выступаў у якасці сведкі і абаронцы на судзе, выкрываў тых, хто «стаў багаты на галечы іншых». Непаслухмянага чыноўніка некалькі разоў паніжалі па пасадзе, пасылалі ў неабжытыя раёны архіпелага. Урэшце, ён захацеў сам выбіцца ў яшчэ большае начальства, каб ужо зверху воляю ўлады вызваліць малых і слабых. З гэтага таксама нічога не выйшла — наадварот, Дэкер пацярпеў поўнае фіяска — «за вальнадумства і неабачлівыя дзеянні» ён быў зусім звольнены з пасады...

І тады Дэкера-чыноўніка канчаткова перамог Дэкер-чалавек. Ён узяў у рукі пяро, паперу і напісаў: «Ва ўсё горла я павінен крычаць пра пажар. І буду крычаць да таго часу, пакуль пажар не будзе патушаны...»

Так нарадзіўся пісьменнік Мультатулі, якога ведае цяпер увесь свет...

Другі, паводле слоў Сімана, сапраўдны галандзец — мастак Ван Гог. Ван Гог — гэта не толькі вялікі талент, але і вялікі працаўнік, які давёў сябе сваёй бескарыслівай службай мастацтву да вар'яцтва і памёр не як вялікі мастак, а як адрынуты ўсімі і, у першую чаргу, грамадствам, ізгой — у беднасці і галечы. Што вяло Ван Гога да вар'яцтва? Тое, што яму не адказала ўзаемнасцю тая, якую ён кахаў, гора, якое ён спазнаў, жывучы на выпадковых заробках і падачках брата, прага знайсці дасканаласць, перадаць фарбамі тое, што адчуваў і бачыў? Трагедыя гэтага чалавека яшчэ і ў адносінах да яго, спрадвечных адносінах да талентаў і мастацтва наогул, тых, хто мае ўладу і грошы. Пасля смерці Ван Гога яго карціны прадаюцца і купляюцца за мільёны, пры жыцці ж мастака іх не хацелі купляць нават за цэнты. Ні пра якую славу і багацце не думаў мастак, яму б толькі было за што купіць фарбы і палатно. Не кожнаму мастаку дадзена сказаць сваё слова, а Ван Гог яго сказаў. Ён стаў бессмяротны...

Што адрозніваюцца рэпрадукцыі карцін ад іх арыгіналаў, шмат гаварыць не варта — гэта ведаюць усе. Але што ёсць мастакі, карціны якіх на рэпрадукцыях трацяць калі не ўсё, дык большасць з таго, што ў іх ёсць, я зразумеў упершыню, калі глядзеў карціны Мадыльяні ў музеі Саламона Гугенхайма (Нью-Йорк). Тое, на што я раней глядзеў як на прыгожыя малюнкі, раптам ажыло, набыло цялеснасць і сэнс. Другі раз тое самае паўтарылася, калі я ў Варшаве ўбачыў карціны Р. Рушчыца. І вось трэці раз тое самае сталася, калі я стаяў ля карцін Ван Гога ў Амстэрдаме. Галоўную сэнсавую нагрузку, як вядома, у карцінах Ван Гога нясе святло, буйства прыроды і фарбаў. А ўсё гэта якраз і знікае, ніяк не перадаецца ў рэпрадукцыях. У Ван Гога шмат шэдэўраў перад якімі можна стаяць і гадзіну, і дзве, і тры... Але з усіх шэдэўраў ёсць адзін шэдэўр, які да канца можа быць зразуметы хіба толькі самімі галандцамі. Гэта — «Едакі бульбы». Так сказаў Сіман і так яно, мабыць, і ёсць...

Нідэрланды далі свету шмат пісьменнікаў, яшчэ больш мастакоў. Ёсць сярод іх геніяльны Рэмбрант, такія самабытныя майстры пэндзля, як П. Брэйгель Старэйшы, Ян Ван Дэйк, Ф. Халс і іншыя, пералік можна доўжыць. Але дух краіны, яе нацыянальны характар — у творчасці Мультатулі і Ван Гога. Так казаў Сіман, і я яму веру. Да слова, я ўвесь час, ды і многія іншыя, ужываю паралельна два словы, называючы краіну то Нідэрланды, то Галандыя. У перакладзе на нашу мову дзве гэтыя назвы маюць прыкладна адно значэнне —«лагчына, што знаходзіцца ніжэй узроўню мора» і «зямля, якая не мае цвёрдай асновы, грунту...»

Быць, жыць у Амстэрдаме і не сказаць пра яго слова... Гэта немагчыма, бо Амстэрдам такі горад, пабываўшы ў якім хоць некалькі гадзін, ужо не забудзеш. Што кідаецца ў вочы ў Амстэрдаме? Па-першае, дамы, архітэктура — кожны дом, што бачыш, хочацца запомніць, сфатаграфаваць. Па-другое, каналы, масты — іх столькі і такія розныя, што аж не верыш. А базар кветак? Ля кожнага прадаўца можна прастаяць і гадзіну і дзве, разглядаючы то адну, то другую дзівосную кветку, любуючыся іх хараством і разнастайнасцю, багаццем прыроды! А кафэ, рэстараны — кітайскія, інданезійскія, турэцкія, індыйскія, еўрапейскія? А даўнішнія вулічкі і дворыкі, па якіх — вось ужо праўда гаворыцца — ні праехаць, ні прайсці — такія яны цесныя? А помнікі — ахвярам вайны, Эразму Ратэрдамскаму, Рэмбранту і г. д. Усяго не пералічыш!

На свеце шмат прыгожых гарадоў, але адзін з прыгажэйшых, вядома ж, — Амстэрдам! Нават раён чырвоных ліхтароў, раён распусты, наркаманіі і рознай іншай чалавечай пошасці, не сапсаваў уражання.

І проста не верыцца, што гэты горад пабудаваны на сваях, прычым драўляных. Сваі гніюць, і некаторыя дамы скасабочваюцца, абвальваюцца. І праблема, як захаваць гэты горад, ужо стаіць сёння. Узнікае думка, якую мы і сказалі сваім гаспадарам, развітваючыся ў аэрапорце,— трэба як мага хутчэй канчаць з атамнай зброяй, наогул з войнамі і думаць, дбаць усім нам зусім пра іншае — як захаваць планету Зямля, жыццё на ёй, тую прыгажосць, хараство і багацце, што стварылі за вякі прырода і людзі...

1987.

ПРЭМ'ЕРЫ

Камічную оперу Рыхарда Штрауса «Кавалер роз» паставіў Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР. Музычны кіраўнік і дырыжор новай пастаноўкі народны артыст РСФСР Генадзь Праватораў, рэжысура заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Барыса Луцэнкі, сцэнаграфія Эрнста Гейдэбрэхта. Мастакі па касцюмах Э. Грыгарук і Л. Ганчарова, танцы ў пастаноўцы народнага артыста рэспублікі В. Саркісьяна, хормайстры — народны артыст БССР А. Кагадзееў і Г. Луцэвіч.

Першы спектакль «Кавалера роз» прайшоў з удзелам народных артыстаў рэспублікі І. Шыкуновай (княгіня Вердэнберг), В. Чарнабаева (барон Окс), заслужанага артыста БССР Ю. Бастрыкава (Фаніналь), салістак Н. Галеевай (Актавіян), Т. Кучынскай (Сафі) і інш.

Народная артыстка БССР І. Шыкунова ў сцэне са спектакля «Кавалер роз».

Фота А. КАЛЯДЫ.

ШЛЯХ У КРАІНУ ВЕДАЎ

Вырабы з апілу, папе-машэ і пластыліну, малюнкі, аплікацыі, выразанкі паводле матываў беларускіх народных казак — іх шмат у мінскім дзіцячым садзе № 505, назва якога і цёплая, і светлая — «Сонейка».

Падобным паведамленнем, бадай, нікога не здзівіш у нашыя дні, калі дашкольныя ўстановы носяць назвы адна лепш другой і ў кожнай з іх, мусіць, знойдуцца самаробкі з прыроднага матэрыялу, што з'явіліся на свет дзякуючы ўменню і стараанню выхаванцаў. Дзяцей заўсёды вылучала непасрэдная блізкасць да вытокаў народнай творчасці, да мастацтва. Галоўнае, відаць, не заінвентарызаваць, не скласці дзіцячыя вырабы ў метадычныя скрыні.

Менавіта такіх няпісаных правілаў і прытрымліваецца калектыў дзіцячага сада № 505, якім кіруе Г. Астроўская. А старэйшыя, вопытныя выхавацелькі Г. Пілюйка, С. Гурына і В. Салаўёва наогул лічаць, што ўсё зробленае дзецьмі — аснова іх эстэтычна-этычных уяўленняў.

Цікава тут прайшоў выпускны «агеньчык». 28 выхаванцаў «Сонейка» пойдуць упершыню ў школу. Кожны з іх атрымаў у падарунак прыгожы альбом, у якім не толькі цёплыя словы пажаданняў, але і лепшыя малюнкі, фотаздымкі з жыцця старэйшай групы.

С. МАЗЬКО.

ШТО-НЕБУДЗЬ НА ЎСПАМІН...

На тэлебачанні рыхтаваўся да выхаду ў эфір чарговы альманах «У святле рампы», у якім была запланавана інфармацыя аб прэм'еры Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа, спектаклі «Кастусь Каліноўскі» па п'есе У. Караткевіча. Вырашылі запрасіць да ўдзелу ў перадачы аўтара, які раней часта выступаў з мастацка-публіцыстычнымі праграмамі «Спадчына», а апошнім часам на экране не з'яўляўся. І таму я, прыйшоўшы працаваць у літаратурна-драматычную рэдакцыю, калі пра падрыхтаваныя Караткевічам выпускі, у якіх ён віртуозна звязваў эпохі і натуральна перамяшчаўся ў іх, былі складзены легенды, не была знаёма з ім асабіста. І вось — званю, дамаўляюся пра сустрэчу. Караткевіч хварэе, але перанесці сустрэчу нельга, ён гэта разумее і запрашае мяне дадому, кажучы пры гэтым: «Але, прабачце мяне, мне няёмка, што я слаба сябе адчуваю, у свой час я ого-го які мужык быў». Ён спрабаваў жартаваць, але голас у тэлефоннай трубцы і сапраўды прагучаў слаба.

Дзверы мне адчыніла жонка Уладзіміра Сямёнавіча — прыгожая статная жанчына. Нават падумалася: добра, што побач з ім менавіта такі чалавек, здольны ўзяць на сябе клопаты аб здароўі і падтрымаць маральна. Яна ціха дапамагла мне распрануцца і, правёўшы мяне ў пісьменніцкі кабінет, ціха пайшла да сябе. Але непрыкметная прысутнасць яе ў кватэры адчувалася кожную хвіліну.

Калі я падрыхтавала рэпарцёр і задала першае пытанне, Уладзімір Сямёнавіч замест адказу працягнуў мне талерку: «Калі ласка, паспрабуйце інжыр, мне яго даслалі з Сярэдняй Азіі». Я пачаставалася і... размаўляць больш не магла: інжыр склеіў мне вусны і зубы. А гаспадар пачаў паказваць сваю калекцыю чарцей, што стаялі на кніжных паліцах. Моўчкі, ківаючы галавой, я слухала, змагалася з інжырам і рыхтавала свае пытанні. Нарэшце, калі я ізноў была здольная задаваць іх, гаспадар ізноў пачаставаў мяне інжырам. Я зноў замаўчала, а ён расказваў пра тое, як у яго доме з'явілася тая ці іншая цацка. Такі быў пачатак нашай размовы. Далей прэм'ера проста дала магчымасць гаварыць аб розным, але ў выснове сваёй аб адным і тым жа: аб высакароднасці чалавечага духу, які дазволіў паплечнікам Каліноўскага, як і дзекабрыстам на пачатку стагоддзя, рызыкнуць усім, што яны мелі,— становішчам у грамадстве, прывілеямі і забяспечанасцю нашчадкаў, нарэшце, жыццём дзеля спробы ўстанавіць сацыяльную справядлівасць, дабіцца нацыянальнага вызвалення. І як мы ў сучасным жыцці страчваем пачуццё ўласнай годнасці і, не маючы, па сутнасці, нічога, баімся рызыкнуць нават тым малым, што ў нас ёсць, каб абараніць пакрыўджанага, уступіцца за справядлівасць, ці нават назваць рэчы сваімі імёнамі.

Здзівіла мяне тады ў Караткевічу спалучэнне неверагоднай шырыні поглядаў і выверанай глыбіня і паслядоўнасць пазіцыі, што праяўлялася вельмі нечакана. Вырашылі мы, напрыклад, праілюстраваць яго выступленні ў перадачы гравюрамі са старадаўніх кніг, якіх, на жаль, у ягонай бібліятэцы не аказалася. Я прапанавала звярнуцца да сям'і знаёмых мне мастакоў. Пачуўшы прозвішча мастака, Караткевіч змяніўся ў твары і вельмі жорстка сказаў, што калі ў перадачы будуць выкарыстаны матэрыялы, што належаць менавіта гэтаму чалавеку, якога ён не паважае за касмапалітызм, то сам ён адмаўляецца ад удзелу ў ёй. Прызнацца, ў той час мяне здзівіла такая гарачая прынцыповасць, але жыццё паказала, што Караткевіч меў рацыю ў адносінах да мастака, якому не верыў як грамадзяніну.

Калі прыйшоў час развітвацца, Уладзімір Сямёнавіч вельмі расхваляваўся — яму захацелася падарыць мне што-небудзь на ўспамін. Спачатку ён кінуўся да кніжнай паліцы, але адразу ж адмовіўся ад жадання падарыць мне сваю кнігу, сказаўшы сціпла, што гэта не зусім адпавядае моманту, і некаторы час стаяў разгублены. Але раптам, прыдумаўшы нешта, абрадаваўся і таямніча запрасіў мяне ў другі пакой. Там літаральна ўсадзіў мяне ў крэсла, выключыў электрычнае святло і сказаў: «Пасядзіце некалькі хвілін спакойна, паглядзіце і паслухайце». На вялікай упрыгожанай ёлцы зіхацелі ліхтарыкі. У пакоі стаялі фігуры анёлаў з разбураных людзьмі касцёлаў. І ў гэтым святле, і ў гэтай цішы сярод гэтых лікаў здалося на імгненне, што мы знаходзімся па-за межамі Прасторы і Часу. А, можа, менавіта, у такія імгненні і прыходзіць да нас разуменне каштоўнасці і мімалётнасці чалавечага жыцця і адчуванне вечнасці чалавечага духу? Можа, у такія імгненні і праяўляецца сувязь часоў і, можа, наогул яна з'яўляецца значна часцей, чым мы думаем, і трэба толькі заўважыць і адчуць яе?

Я атрымала адказ на ўсе свае пытанні. І нават больш. За вокнамі павольна падаў снег. Быў Стары Новы год.

Вера САВІНА.

АБ'ЯВЫ

Беларуская ордэна Дружбы народаў дзяржаўная кансерваторыя імя А. В. Луначарскага

аб'яўляе конкурс

на замяшчэнне вакантных пасад прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую прапіску):

1. Кафедра фартэпіяна
ст. выкладчык — 1
2. Кафедра канцэртмайстарскага майстэрства
дацэнт — 1
3. Кафедра аркестравага дырыжыравання
дацэнт — 0,25

Тэрмін конкурсу — месяц з дня апублікавання аб'явы. Заявы і дакументы, згодна палажэнню аб конкурсе, накіроўваць на імя рэктара на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30. Даведкі па тэл.: 22-49-42, 22-96-71.

Тры невядомыя пісьмы Адама Багдановіча

Першае паўгоддзе 1917 года аказалася вельмі трагічным для Адама Ягоравіча Багдановіча. За некалькі месяцаў адзін за адным паміраюць тры яго сыны — Раман, Максім, Леў. Чатырохгадовы Раман, самы здольны на думку бацькі з дзяцей, памёр у студзені. Магчыма, Адам Ягоравіч паведамляў пра гэта Максіму, але да нас гэта пісьмо не дайшло. Затое ў Мінску ў Архіве літаратуры і мастацтва ёсць паштоўка А. Багдановіча да сына Льва, які знаходзіўся ў той час у дзеючай арміі.

«У меня большое горе, — пісаў сыну Адам Ягоравіч, — 6 января Роман скончался от воспаления лёгких... Пиши милый чаще. Тоскливо, особливо теперь, когда дом наш опустел. Спаси тебя Господь. Твой папа. 19.1.1917 г.»

У час Лютаўскай рэвалюцыі Максім, зусім хворы, выехаў з Мінска ў Ялту. Грошы на білет і дарогу далі яму сябры, спадзеючыся, што крымскі клімат дапаможа паэту. Адам Ягоравіч напісаў яму, што сустрэне ў Сімферопалі, куды пераводзіўся на новую службу. Аднак усё склалася не так, як думалася: бацька змог выбрацца з Яраслаўля на дзесяць дзён пазней, чым планаваў, пасля затрымаўся на чатыры дні ў Маскве, бо не мог купіць білет на цягнік. Максім таксама ехаў без прыгод толькі да Гомеля, а пасля снежныя заносы на чыгунцы прымусілі яго галадаць разам з усімі тры дні ў полі. Дабраўшыся, нарэшце, да Сімферопаля, ён не знайшоў бацькі, таму, не марудзячы, паехаў у Ялту.

Неўзабаве ў Сімферопаль прыехаў Адам Ягоравіч у якасці выконваючага абавязкі ўпраўляючага аддзяленнем банка. У Таўрычаскім аддзяленні Сялянскага банка заўсёды было шматлюдна. Старое жыццё разбуралася на вачах, а ў новае, лепшае, з-за разгулу анархіі — не верылася. Наколькі складаны быў той час, сведчыць пісьмо Адама Ягоравіча да Кацярыны Паўлаўны Пешкавай, якое я знайшоў у Маскве ў Архіве Максіма Горкага:

«Тяжело, дорогая Катерина Павловна, очень тяжело. Всё последнее время какие-то камни ворочаются в груди, на том месте, где надлежит быть сердцу. И некому поведать печаль свою. Мне суждена доля Кассандры. Вокруг только кровь, безысходное горе, развал и крушение всех национальных идеалов, но не видно избавления, не видно спасения... Гаснет вера в свой народ, в его вечное предназначение и тьма охватывает сознание. Вокруг свирепствует слепой хаос — и нет творческого союза, нет того животворящего духа, мощного и властного, который бы разбушевавшуюся слепую стихию направил бы в русло порядка и гармонии...

Где тот вождь и пророк? Пока нет его. Керенский? Но что он может сделать один, усталый и больной, с испепелённым сердцем, он, который явно не знает, что основная стихия массы русского народа — анархизм, распад на отдельные ячейки... Что он может сделать, когда даже в своей собственной партии он не собрал большинства? И в самой партии, которой видимо суждено играть второстепенную роль, ещё вопрос — не больше ли элементов распада и разложения, нежели творчества и созидания?

Несомненно, что в отношении армии и рабочих элементов распад и разложение действуют с гораздо большей силой, чем элементы связи, подчинения и объединения. Взваливать всю вину на большевиков за создавшуюся анархию и развал несправедливо. Вообще, нельзя было трогать дисциплину... Мы слышали про железную революционную дисциплину, но что-то не видим ее применения, её действия. Очевидно, что разрушить старое было легче, чем созидать новое.

И вот наша армия бежит из-под Мукдена. И вот в Россию врагу открываются широкие ворота. Мы имели беженцев с протянутыми руками, скоро будем залиты потоками беженцев со штыками в руках. Гибнет работа многих прошлых поколений... начинай сначала... Ясно, что мы на многие годы обречены на судьбу нации, невыполняющей своего призвания.

Читал, что Вы попали в гласные М. Г. Д. (Маскоўскую Гарадскую Думу, — Л. З.), не особенно Вас поздравляю и Вашу партию. Я думаю, что ваши товарищи не столько радуются победе, сколько трепещут под тяжестью свалившегося на них дела и огромной ответственности...».

Як вядома, Максім уладкаваўся ў Ялце не вельмі добра. Цяжка было з ядою. Акрамя таго, увесь час трымалася высокая тэмпература. Ён бясконца кашляў, схуднеў, Максім хадзіў у бібліятэку, падоўгу сядзеў у чытальні, браў кнігі на кватэру. Увесь час неаслабна сачыў за грамадскім жыццём, настойліва працаваў над беларускім букваром. Ён, як і яго бацька, не верыў у Керанскага і нават напісаў у адным з лістоў да сяброў: «Смешна спадзявацца, што якія б там ні былі Керанскія прынясуць вызваленне прыгнечаным масам Беларусі. Толькі самі працоўныя змогуць дабіцца свайго вызвалення».

Словы паэта аказаліся прарочыя.

Пра смерць Максіма бацька даведаўся не адразу. Гаспадыня кватэры, не знайшоўшы сімферопальскага адраса Адама Ягоравіча, тэлеграфавала ў Яраслаўль. Пакуль адтуль паведамілі ў Сімферопаль, ішоў ужо чацвёрты дзень, як памёр Максім. Даведаўшыся пра смерць сына, бацька адразу памчаў на аўтамабілі ў Ялту.

На магіле сына Адам Ягоравіч знайшоў сціплы драўляны крыж з бляшанаю таблічкаю, на якой было напісана: «Студент Максим Адамович Богданович».

Напісаць чарговы ліст Льву і не паведаміць пра смерць брата — Адам Ягоравіч не адважыўся. І, як бы апраўдваючыся, што амаль за тры месяцы не знайшоў часу выбрацца да хворага Максіма, ён піша:

«Мой милый сынок. Нас постиг новый удар: Максим скончался в ночь на 14 мая в Ялте. Кровотечение из горла. Он ничего мне не писал о своём здоровье, оказалось, что в последнее время он чувствовал плохо... Умер совсем одиноко, и похоронили его без меня. Всё горе, да горе. Теперь ты остался один от матери. Тяжело мне, сынок, всё как-то рушится, а я должен стоять и бороться, чтобы не ослабеть в борьбе, не потерять равновесие и смысл в жизни.... 21 мая 1917».

У заключэнне хочацца сказаць, што мною ў Архіве Максіма Горкага выяўлена цікавая ненадрукаваная перапіска Адама Ягоравіча з вялікім пралетарскім пісьменнікам і з К. П. Пешкавай, дзе часта ўспамінаецца светлае імя Максіма-кніжніка і якую я маю намер неўзабаве апублікаваць.

Л. ЗУБАРАЎ.

г. Мінск.

ПРАТАТЫП ДУБРОЎСКАГА

Як вядома, пушкінскі раман «Дуброўскі» не быў закончаны. А той тэкст, які мы чытаем сёння ў зборах твораў А. С. Пушкіна,— апошні варыянт чарнавога рукапісу, апублікаванага пасмяротна. Але, акрамя гэтага асноўнага рукапісу, да нас дайшлі планы «Дуброўскага», кароткія яго праграмы, накіды, якія распрацоўваюць найбольш значныя павароты сюжэта. Вызучэннем гэтых рукапісных матэрыялаў займаюцца цяпер ленінградскія літаратуразнаўцы Пятруніна і Рабінавіч — навуковыя супрацоўнікі Пушкінскага Дома.

— Задума рамана пра двараніна-разбойніка,— расказваюць даследчыкі,— узнікла ў А. С. Пушкіна пад уражаннем гісторыі беларускага памешчыка, двараніна Астроўскага, пра судовую справу якога са сваім багатым суседам расказаў паэту яго маскоўскі сябра П. В. Нашчокін. Спачатку герой рамана насіў прозвішча сапраўднай асобы—Астроўскі, ды і сам раман так і называўся — «Астроўскі». Потым Пушкін пачаў мяняць прозвішча свайго героя, называючы яго то Зуброўскім, то Нарумавым і нарэшце Дуброўскім...

Адзін з планаў рамана захоўваецца ў рукапісным аддзеле Пушкінскага Дома і прысвечаны якраз беларускаму прататыпу Дуброўскага, называецца гэты план — «Астроўскі, выхоўваўся ў Пецярбурзе...» Гэты накід, як мяркуюць даследчыкі, уяўляе сабой першапачатковую, у многім яшчэ папярэднюю распрацоўку ўсяго сюжэта будучага рамана. У плане намечана падзейная лінія развіцця лёсу галоўнага героя, які захоўвае яшчэ імя свайго прататыпа. За гісторыяй пераўтварэння беларускага двараніна ў разбойніка ідзе расказ пра тое, як «прага помсты» змянілася ў душы героя любоўю да дачкі яго ворага.

Вывучэнне пушкінскіх аўтографаў памагае ўявіць, як паступова фарміравалася задума «Дуброўскага», як ўдасканальваліся характары герояў рамана.

З. АФАНАСЬЕВА,
мастацтвазнаўца.

г. Ленінград.

Ілюстрацыя мастака Д. Шмарынава да рамана А. С. Пушкіна «Дуброўскі».

НА ЭКРАНЕ

з 24 па 30 жніўня

24 жніўня, 18.45

«НАВІНКІ КНІГАРНІ».

Вядучы — паэт С. Панізнік.

25 жніўня, 20.15

II УСЕСАЮЗНЫ ФЕСТЫВАЛЬ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ.

Выступленне народнага ансамбля песні і танца «Чаравічкі» Дома культуры Лідскай абутковай фабрыкі.

27 жніўня, 18.35

ЭКРАН: ПРАБЛЕМЫ, ГЕРОІ.

У перадачы, прысвечанай Дню савецкага кіно, прымае ўдзел першы сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР В. Нікіфараў.

29 жніўня, 11.30

«СЛОВА — ПАЭЗІІ».

Рэпартаж са свята кнігі ў Мінску.

29 жніўня, 14.55

«МЕТРАНОМ».

Музычна-публіцыстычная праграма, прысвечаная праблемам рок-музыкі. Вы сустрэнецеся з удзельнікамі нефармальнага аб'яднання з Гродна.

Вядучая — музычны каментатар Э. Язерская.

29 жніўня, 23.45

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

«Прыкметы сезона. Лета».

30 жніўня, 15.10

«ДАМОЎ Я ЕДУ ПАСТАЯННА...»

Наш госць з ПНР паэт Віктар Швед.

У размове прымаюць удзел С. Законнікаў, А. Вольскі, А. Васілевіч.

Вядучы — А. Мальдзіс.

30 жніўня, 17.50

Б. ТАРАШКЕВІЧ. СТАРОНКІ ЖЫЦЦЯ.

Перадача прысвечана аднаму з арганізатараў «Грамады», аўтару першага падручніка беларускай мовы, актыўнаму ўдзельніку камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі.

У перадачы заняты артысты мінскіх тэатраў.

30 жніўня, 18.10

ПРА МУЗЫКУ АД «А» ДА «Я».

Спачатку вы пазнаёміцеся з творчасцю кампазітара В. Залатарова, які ўнёс значны ўклад у фарміраванне беларускай кампазітарскай школы. Яго вучнямі былі У. Алоўнікаў, Д. Лукас, Р. Пукст, Л. Абеліёвіч. Будуць выкананы «Элегія» памяці Барадзіна, фрагменты з Шостай сімфоніі. Вы ўбачыце ўрыўкі з балетаў «Князь — возера», «Палымяныя сэрцы».

Танцоўшчыку С. Дрэчыну прысвечана наступная старонка. Ён прадстаўлены як выканаўца і балетмайстар.

Пра жалейку раскажуць артысты Дзяржаўнага аркестра імя Жыновіча.

Вы сустрэнецеся таксама з кампазітарам М. Дунаеўскім, музыка якога гучыць у мастацкіх фільмах, тэлевізійных спектаклях. Творы яго прагучаць у выкананні М. Баярскага, М. Карачанцава і самога аўтара.

Вядучыя В. Скварцова і У. Шаліхін.

30 жніўня, 19.50

«У НЯДЗЕЛЮ ВЕЧАРАМ».

Выступае ансамбль «Праспект» пад кіраўніцтвам В. Галаўко.

У «КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА»

Д. БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА. Даўняе сонца. Лірыка. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987.—1 р. 80 к.

Г. БУРАЎКІН. Сінія арэлі. Вершы. Мн., «Юнацтва», 1987.—50 к.

С. ГРАХОЎСКІ. Верую. Кніга новых вершаў. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987.—65 к.

А. ЕМЯЛЬЯНАЎ. На падкове дарог. Вершы. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987.—30 к.

А. САВІЦКІ. Верасы. Раман. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987. — 1 р. 60 к.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 02256 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела публіцыстыкі і нарыса — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела культуры і выяўленчага мастацтва — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і тэлебачання — 33-21-53, аддзела музыкі — 33-21-53, аддзела пісьмаў — 33-24-62, аддзела інфармацыі—33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і фотаілюстрацый — 33-44-04, 33-24-62, карэктарскай — 32-20-64, бухгалтэрыі — 23-73-37.

Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы (праз два інтэрвалы). Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Рычард СМОЛЬСКІ, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.